БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА. ЗАСНАВАНАЯ Ў 1906 Г. Ў ВІЛЬНІ. АДНОЎЛЕНАЯ ТАМСАМА Ў 1991 Г. З 1 САКАВІКА 1996 Г. ВЫХОДЗІЦЬ Ў МЕНСКУ. ВЫДАВЕЦ РЭДАКЦЫЯ ГАЗЭТЫ «НАША НІВА»

ВЫРВАНАЯ СТАРОНКА – СВАБОДА

Два тыдні таму ў радыёперадачы рэдактар газэты «Свабода» Ігар Гермянчук адказваў на пытаньне: «З кім і чым ён зьвязвае спадзевы на будучыню беларускае ідэі?» Натуральна, з газэтай. Зь яе папулярнасьцю і нераскрытымі магчымасьцямі. Неўзабаве пасьля гэтага, 24 лістапада гаспадарчы суд РБ спыніў выхад «Свабоды». У новых сваіх інтэрвію рэдактар паабяцаў наладзіць выданьне іншай газэты, а калі закрыюць і яе — выходзіць нелегальна.

Ліквідацыя такой газэты ставіць шмат пытаньняў, якія патрабуюць неадкладнага адказу. Што адбылося? Што гэта азначае для краіны, для грамадзтва? Да чаго ўсё ідзе?..

Нагадаю, што «Свабода» і пачыналася вясною 1990 году, як нелегальнае выданьне. Гэта была ня столькі нават газэта, колькі сумесь палітычнага бюлетэня зь літаратурным альманахам. Тады праз паўгода «Свабоду» легалізавалі. А яшчэ праз паўгода, калі ініцыятары ўзяліся за адраджэньне іншай газэты — «Нашай Нівы», «Свабоду» ачоліў Ігар Гермянчук, тады дэпутат Вярхоўнага Савету. Ён сабраў калектыў, наладзіў прадпрыемства, узяў курс на стварэньне прафэсійнага сродку масавай інфармацыі, аднаго зь лідэраў прэсавага рынку краіны. Чым урэшце «Свабода» і стала. І вось улады змушаюць папулярнае і ўжо безь пяці хвілінаў штодзённае выданьне вяртацца ў падпольны статус, у пэрыяд — да незалежнасьці Беларусі і да Гермянчука. Але ці магчыма гэта? Ці сапраўды з закрыцьцём «Свабоды» мы можам гаварыць пра вяртаньне ў 1990 год? А калі не, то — куды?

Пра першы год газэты «Свабода», той, калі яна яшчэ не ператварылася ў прадпрыемства, а была суцэльнай імправізацыяй некалькіх энтузіястаў, можна напісаць цэлую кнігу. І пра тое, як ганялі штотыдзень на латвійска-эстонскую мяжу на «Запарожцы» Паўла Жука, каб аддрукаваць тыраж, які вяртаўся адтуль ужо грузавіком. І пра тое, як нас лічылі канкурэнтамі «Навінаў БНФ», якія ўрэшце ціха закончылі сваё існаваньне — бяз шумнага працэсу закрыцьця і скандалу. І пра тое, як на менскіх мітынгах і вакзалах прадаваліся дзясяткі тысячаў газэт. Час быў зусім іншы. Натхненьня тады было болей, вочы гарэлі ярчэй, рызыкаваць — хацелася і, бадай, дазвалялася. Кампарцейная ўлада была разгубленая і ўжо не выклікала такога страху, як у ранейшыя часы. Альбо — дадам — як цяпер. Тады паміралa дыктатура, а пэрыяд станаўленьня перажывалі мы. Мы ведалі, што будучыня за намі.

Сёньня, пасьля закрыцьця, даводзіцца чуць розныя крытычныя меркаваньні пра «Свабоду». Напрыклад, пра тое, што многія першыя чытачы перасталі выпісваць яе, бо яна стала «проста газэтай», або пра яе, як пра перагорнуты адбітак прэзыдэнцкай «Советской Белоруссии», або пра тое, што менавіта адмова ад тарашкевіцы паслабіла прынцыповыя пазыцыі газэты, з чаго па сутнасьці і пачаўся працэс закрыцьця. Так ці інакш, «Свабоду» чыталі. Найперш дзеля праўдзівае і поўнае інфармацыі, якой рэдактар адвёў у газэце галоўнае месца. Утылітарная патрэба — інфармаваць — можа

Працяг на старонцы 3.

№ 34 (95) 1 СНЕЖНЯ 1997 Г.

НАША НІВА

Недыпляматычныя нататкі

Беларускі дзёньнік 1979 г. Аляксея Каўкі на старонках 6 і 11.

Res publica Femina

Эсэ Славаміра Адамовіча пра беларускіх жанчын на старонцы 5.

Што такое мужчына

Эсэ Элізабэт Бадэнтэр пра мужчынскую сутнасьць на старонках 14-15.

Ня пішуцца вершы пра Вільню...

Апавяданьне-ўспамін Адама Глёбуса на старонцы 14.

Легенда пра песьняра

Навэлі Міхая Эмінэску на старонцы 15.

«Чорная кніга камунізму»

Рэцэнзія на бэстсэлер гэтага тыдня на старонцы 13.

Закладнікі паразы

Расейшчына ў Беларусі ня мае пэрспэктывы, — сьцьвярджае Зьміцер Бартосік у сваім эсэ на старонцы 4.

ДРУГАЯ СПРОБА

Інстынктыўны пратэст масаў супраць нацыянальнай эліты

Нармальнае існаваньне дзяржавы магчымае толькі тады, калі ёсьць нацянальная эліта, якая ведае нацыянальныя інтарэсы, валодае інтэлектам, мае мэнтальную сугучнасьць са сваім народам. У такім выпадку эліта адчувае цьвёрдую глебу пад нагамі, дзейнічае рашуча і самастойна. Калі такой эліты няма, то існаваньне дзяржавы залежыць ужо не ад унутраных, а ад вонкавых абставінаў. На жаль, менавіта такія ўмовы існаваньня характэрныя для краіны з назваю Беларусь. Для нашай краіны.

Тых людзей, якія сёньня кіруюць, цяжка назваць нацыянальнай элітай. Ня толькі таму, што паводле свайго інтэлекту і маральных якасьцяў яны не адпавядаюць гэтай катэгорыі грамадзтва, але й таму, што пры такой гісторыі краіны, як у нас, цяжка чакаць людзей іншых. Дзеля аднаўленьня мэханізму рэгенэрацыі патрэбны час.

Мне думаецца, тое, што мы перажываем сёньня, ужо было ў нашай гісторыі. Сёньняшнія ўлады надта падобныя на колішнія, даўнейшыя. І падабенства іх дзеяньняў можа быць акрэсьленае словам «спакуса». Спакуса, якая вядзе толькі да аднаго — да пагібелі. Або рэжыму, або дзяржавы. Спакуса нараджае здраду, здрада — раскол, раскол — вайну, вайна — пагібель.

Дзеля параўнаньня надаецца той эпізод гісторыі, калі Ягайла паквапіўся на польскую карону, на магчымасьць у адно імгненьне стаць каралём. Спакуса пацягнула за сабой здраду. Гэта была сыстэмная памылка, якая паставіла крыж на разьвіцьці ягонай і нашай дзяржавы. Усе намаганьні Вітаўта падвысіць статус дзяржавы, дамагчыся ператварэньня Вялікага Княства ў Каралеўства завяршыліся паразай, бо грамадзтва ўжо было заражанае здрадаю і расколам як на рэлігійнай, так і на ўладнай глебе. Спакуса стаць лепшымі прывяла да здрады арыстакратыі сваёй дзяржаве. Экспансія каталіцызму яшчэ больш паглыбіла раскол, падзяліўшы шляхту на правільную каталіцкую і няправільную праваслаўную.

Зь цягам часу ўжо амаль уся арыстакратыя перайшла ў каталіцтва і гэтак утварыўся яшчэ большы раскол — паміж ёю і паспалітым народам, які заставаўся пераважна праваслаўным. Паступова арыстакратыя перастала лічыцца для народа сваёй, бо малілася ў іншых храмах і размаўляла на іншай мове. Каб быць папулярным у разьдзеленым грамадзтве, трэба было мець пераканаьні, талент і палітычную вагу Канстанціна Астроскага. Але асобы такога кшталту нараджаюцца ня кожны дзень.

Нацыянальная эліта пакрысе пераставала быць нацыянальнай. Дзяржаўныя інтарэсы краіны пераставалі дамінаваць перад інтарэсамі краіны іншай. Дзяржава хварэла на ўсобіцу.

Працяг на старонцы 3.

Дзівосныя пэрспэктывы

На працягу доўгага часу не магу ня думаць: «Чаму пасьля столькіх гадоў пакутаў і жаху працягвае бяларус любіць чужую Радзіму?» Адкуль гэткая любоў і зьневажаньне сваёй Айчыны? Чаму да гэтага часу баіцца ён страціць сваю слабасьць ды падняцца з каленяў? Чаму зараз яшчэ практыкуюцца мэтады, што зноў уводзяць яго ў стан рабалепства?

Жудасна, што праводзяцца лекцыі пад назвай «Ідэі сацыялізму і адраджэньне беларускай нацыі». Паспрабаваўшы знайсьці адказ на ўсе пытаньні і прыйшоўшы на гэтую лекцыю, я адчуў вялікі боль... Адразу лектар павіншаваў усіх зь «вялікім сьвятам слаўнай кастрычніцкай рэвалюцыі» і распавёў пра «гістарычны вопыт і ўрокі Вялікага кастрычніка».

Балюча чуць, што пра Беларусь кажуць, як пра частку Расеі, што спрыяла распаўсюджваньню расейскага сацыялізму.

Я прыгадаў «адраджэньне беларускай нацыі» праз ідэі сацыялізму й тысячы ахвяраў гэтага «адраджэньня»: калі расстрэльвалі больш за дзесяць тысячаў бязьвінных людзей на месяц; калі грузілі ў вагоны ды вывозілі ў сібірскія канцэнтрацыйныя абозы па дваццаць тысячаў у адну ноч толькі за тое, што яны — беларусы; і ў гэты ж час шмат казалі пра ўзрост самасьвядомасьці беларускай нацыі.

(Няўжо так прыемна поўзаць у брудзе перад сваімі ўласнымі забойцамі ды быць удзячнымі ім за гэта?!)

Напрыканцы лектар пахваліў і цяперашняга беларускага прэзыдэнта за працягваньне ім «сьвятой справы рэвалюцыі». Калі зараз уладай сапраўды ўспрымаюцца «ўрокі вялікага кастрычніка», дык, прымаючы на ўвагу мільёны ахвяраў тых гадоў, нас чакаюць дзівосныя пэрспэктывы...

Аляксей Панаеў, 14 гадоў, Менск

Паважаны спадар рэдактар!

Зь дзяцінства я наведваю царкву, зьбіраю разнастайную інфармацыю, што тычыцца праваслаўя. Добра, што пачалося адраджэньне менавіта БЕЛАРУСКАГА праваслаўя і што да гэтае справы спрычынілася публікацыямі «Наша Ніва». У №31 за 20 кастрычніка газэта надрукавала гутарку карэспандэнта зь Пятром Гушчам, наконт якой маю выказаць свае думкі. Мяркую, яны будуць цікавыя чытачам «НН».

Пачну крыху зь іншага. Неяк, гартаючы старыя пэрыёдыкі беларускай эміграцыі, я натрапіў на выданьні «Беларускай Хрысьціянскай Артадаксальна-Каталіцкай Субожні, насьледніцы «Літоўскае Ядноты», за 1960-я гады. Мне, сьвядомаму праваслаўнаму беларусу, было цікава, што гэта за невядомае новаўтварэньне з помесі ўсіх хрысьціянскіх веравызнаньняў? У часопісе «Беларуская Царква» з Чыкага (№33, сьнежань 1961 г.) знайшоў артыкул «Блазны гуляюць у субожню», у якім распавядалася пра нейкага Рыжага-Рыскага, вельмі актыўнага ў колах беларускае эміграцыі. Сваёй грамадзкай дзейнасьцю ён дамагаўся духоўнага сану ў... розных веравызнаньнях (?!). Спрабаваў вучыцца на ксяндза ў Ватыкане, потым у Лювэнскім Каталіцкім Унівэрсытэце (Бэльгія). Зрокся каталіцтва, быў у гішпанскіх пратэстантаў-мэтадыстаў, амэрыканскіх кальвіністаў, у нейкіх сэктах і нарэшце стварыў уласную «Праўдзіва-Каталіцкую, Артадаксальную, Беларускую, Хрысьціянскую, Кальвінскую, Прэзьбітэрыяльную Субожню, насьледніцу «Літоўскае Ядноты», а сабе надаў тытул «Ксёндз Др. Уладыслаў Рыжы-Рыскі, Тытулярны Пастар Слуцкага Рэфармаванага Каталіцкага (Кальвінскага) касьцёлу». Прадстаўнікі каталіцкіх і праваслаўных суполак эміграцыі засьцерагалі вернікаў ад кантактаў з гэтаю цьмянаю сэктай. Праз 30 гадоў, у газэце «Беларускі Голас» (№363 за ліпень 1991 г.) зьявілася нататка Я.Галейкі пра «Беларускую Стара-Каталіцкую Артадаксальную Субожню», якая «... закладзеная ў ЗША ў 1960 г. Уладыславам Рыжым-Рыскім, рукапаложаным у біскупы старакаталікамі ў 1965 г.» У той жа год быў абвешчаны «патрыярхат», дзе першым «патрыярхам» быў Пётра Журавецкі — паплечнік Рыжага-Рыскага па «субожні», а потым «патрыярхам» стаў сам Рыжы-Рыскі...

Прайшоў час, «субожні» зь «яднотамі» перабраліся ў Беларусь, але не ў абліччы каталіцкім, а ў строях праваслаўных. П.Гушча кажа пра «Беларускую Народную (Аўтакефальную) Праваслаўную Царкву», якая «... зьяўляецца япіскапствам Сусьветнага Амэрыканскага Патрыярхату, утворанага архіяпіскапам Уладзіславам Рыжым-Рыскім у 1949 г. у Амэрыцы». Міжволі паўстае пытаньне: колькі ж за сваё бурлівае жыцьцё У.Рыжы-Рыскі заснаваў гэтых «патрыярхацікаў»?! Далей, чытаючы гутарку карэспандэнта «НН» з Гушчам, хочацца паставіць тлустыя пытальнікі амаль пасьля кожнага слова. І каб ня быць галаслоўным, дадаю колькі прыкладаў з цытаваньнямі:

1. Сваё ўтварэньне Рыжы з Гушчам лічаць за «сусьветны АМЭРЫКАНСКІ патрыярхат», відаць, ня ведаючы, што «сусьветным» ужо не адно стагодзьдзе ў праваслаўным сьвеце лічыцца выключна КАНСТАНТЫНОПАЛЬСКІ патрыярхат. НАРОДНАЙ можа быць партыя, а не Царква: яна і ёсьць — Дом Божы для НАРОДУ! Пра гэта ведаюць нават малыя дзеці ў нядзельных школках! АЎТАКЕФАЛЬНЫМ, г. зн. «незалежным» ад іншае Царквы ня можа быць «япіскапства» АМЭРЫКАНСКАГА патрыярхату — бо гэта толькі ЧАСТКА згаданага патрыярхату. Вядомыя ў сьвеце патрыярхаты заснаваныя Апосталамі (вучнямі Хрыста), альбо Патрыярхамі, а АРХІЯПІСКАП можа заснаваць хіба што фірму пры царкве, каб гандляваць гарэлкай!

2. П.Гушча кажа пра ўтвораны АРХІЯПІСКАПАМ у 1949 г. «патрыярхат» і праз радок супярэчыць сам сабе: «... беларускі сьвятар Уладзіслаў Рыжы-Рыскі быў АСЬВЕЧАНЫ ў сан ЯПІСКАПА ярэем Вальтэрам М.Прэфэтам у 1965 г.» Як можа АРХІЯПІСКАП заснаваць нечага ў 1949 г., калі яго толькі на ЯПІСКАПА высьвяцілі ў 1965-м?!.. Няма ў праваслаўі пасадаў кшталту «апостальскі візытатар, адміністратар», «дэкан», «дыяцэзія» — гэта каталіцкія назовы.

3. Праваслаўе грунтуецца на сваёй кананічнасьці. КАНАНІЧНАСЬЦЬ — гэта перш за ўсё КАНОН, то бок ПРАВІЛЫ, якія рэгулююць адносіны паміж япіскапам, сьвятаром і вернікамі, складзеныя яшчэ сьв. Апосталамі, Сусьветнымі й Краёвымі саборамі, ды сьв. Айцамі Царквы. Зь цягам часу сёе-тое зьмяняе жыцьцё, але асноўнае — зьяўляецца падмуркам узаемадачыненьняў у Царкве. Гэта, так бы мовіць, царкоўнае «заканадаўства», якое павінен выконваць кожны, хто лічыць сябе ПРАВАСЛАЎНЫМ. А ў Гушчы: «Кананічнасьць — гэта тое, што склалася гістарычна». Гадоў 40 таму выдумалі «гістарычна» нейкі «сьметнік зь веравызнаньняў» — «субожню», і вось цяпер гэта будзе «кананічна»?!.. Першае ж правіла сьв. Апосталаў кажа: «Япіскапа павінны паставіць два або тры япіскапы». А згодна словаў Гушчы, «... Уладзіслаў Рыжы-Рыскі быў асьвечаны ў сан япіскапа ЯРЭЯМ Вальтэрам М.Прэфэтам». Як сьвятар высьвячае... япіскапа? Ці інакш — як шараговец можа «высьвячаць» у генэралы?! І далей чытаем у гутарцы: «... япіскап Уладзіслаў быў уведзены ў сан архіяпіскапа АРХІЯПІСКАПАМ... Журавецкім». Здаецца, яны сабраліся недзе на кухні й «высьвяцілі» адзін аднога на «архіяпіскапаў»? Баючыся АШУКАНСТВА і трымаючы ДЫСЦЫПЛІНУ ў Цэрквах, Апосталы загадалі за правіла, каб пры пераходзе пад іншую юрысдыкцыю, да іншага япіскапа, сьвятары й вернікі мелі прадстаўнічую ГРАМАТУ. А ў Рыжага з Гушчам «структура дэмакратычная»: можна ад япіскапа да япіскапа швэндацца як па крамах!..

Так бы мовіць, «напхаў» мазгі людзям рознымі тытуляцыямі і пустаслоўем ды задаволена робіць выснову: «... Мяркую, весьці размову аб неканаічнасьці нашае царквы абсурдна». Канечне, абсурдна, калі гэтая «царква» — кананічны АБСУРД! Няўжо БЕЛАРУС Гушча ня бачыць, што рые яміну БЕЛАРУСКАМУ праваслаўю, ствараючы «пацешную» ілжэцаркву?!

Вось што выказаў у адным са сваіх інтэрвію на гэты конт Сакратар Кансысторыі сапраўднае БАПЦ сп. Б.Данілюк: «На жаль, нашыя інтэлігенты мабыць не даволі інтэлігентныя, каб зразумець, што як палітычнай зарукай дзяржаўнае незалежнасьці Беларусі можа быць толькі ейнае месца ў суполцы эўрапейскіх народаў, гэтак і неабходнай духовай падмуроўкай гэтае незалежнасьці можа быць толькі нацыянальная Праваслаўная Царква, якая мае падставы ўвайсьці ў лік і почасьць аўтакефальных цэркваў 250-мільённага праваслаўнага супольніцтва сьвету. Усялякія ж трызьні пра беларускае англіканства, ці падтрымка якога-колечы жульніцтва ў рэлігійных справах дзеля таго, што яно карыстаецца беларускай мовай і патрыятычнымі лёзунгамі, будзь яно рыжанства ці гушчанства, ці яшчэ што іншае — нішто іншае, як вада на маскоўскі млын». І сп. Данілюк мае рацыю: пройдзе час, і людзі зразумеюць ня гушчава «англіканства», а ашуканства, якое толькі на карысьць аддзелам Маскоўскае Патрыярхіі ў Беларусі! Ці не таму «Наша Ніва», як надрукавала Вітаньне мітрапаліта Ізяслава, хуценька атрымала «прывітаньне» з пракуратуры, выраблена не без дапамогі Філарэта, а Гушча й дагэтуль агітуе на мітынгах, стварае без «рэгістрацыі», «адбіваючы» ў Філарэта свае прыходы — і нічога?!..

На заканчэньне раю ўсім шчырым, вельмі паважаным мною БЕЛАРУСАМ, але крыху недасьведчаным у рэлігійных справах, паразважаць і зрабіць высновы з вышэйнапісанага...

Н.К.

P.S. Падпісваюся псэўданімам, бо не хачу займець непрыемнасьцяў як з боку прыхільнікў Гушчы, так і асьцерагаючыся непрыемнасьцяў з боку «сапраўднай» БПЦ Маскоўскага Патрыярхату на чале зь Філарэтам.

Здымак Міхала Баразны.

Памылка казачніка Шарля Пэро

У №8 «Нашай Нівы» за 1992 год на 13 старонцы былі надрукаваныя «некандыцыйныя» матэрыялы «Шарль Пэро: дарослыя сэнсы дзіцячых казак» у перакладзе з французскае З.К. Гэтыя вершаваныя пераказы засталіся ў маёй памяці, а найбольш — стрэмкай у галаве «засела» гэтая Папялушка з сваім крышталёвым пантофлікам, або туфлікам. Праўда, аб ім у паэтычных радках ані слова не казалася.

Я вырашыў пераправерыць Шарля Пэро і самога сябе — ці магла быць такая зьява, як крышталёвы пантофлік, ці туфлік. Не, не магло такое адбыцца, бо як беларускі, так і французкі народ нават у самых незвычайных фантазіях быў заўсёды практычным, акрамя таго, пра сам крышталь у дні «нараджэньня» казкі пра Папялушку ня ведаў і не здагадваўся...

Але вернемся да самой казкі. Пра няшчаснае жыцьцё і шчасьлівы шлюб гаротнай Папялушкі дзеці і дарослыя ведаюць амаль ва ўсім сьвеце. Асабліва ўсім нам западае ў душу эпізод, як прынц прымярае Папялушцы шкляны ці крышталёвы туфлік або пантофлік.

Як гэта атрымалася, што замест туфліка (пантофліка) са скуры ці футра, або хоць дрэва, зьявіўся шкляны (крышталёвы)?

Аказваецца, шкло па-французку пішацца «verre», а для абазначэньня футра ў старафранцускай мове было слова «vair», але абодва яны вымаўляліся аднолькава — «вэр». Слухаючы старыя казкі, Шарль Пэро (1628-1703) не зьвярнуў увагі на гэтыя адценьні, і ў 1697 пры выданьні кнігі «Казкі маёй мамы гусыні, альбо Гісторыі і казкі мінулых часоў з маральнымі павучаньнямі» зрабіў для Папялушкі замест футравага шкляны (крышталёвы) туфлік (пантофлік)... Першым зьвярнуў увагу на гэтую недарэчнасьць дасьледчык Том Барнэм, які ў Злучаных Штатах Амэрыкі выдаў энцыкляпэдычны «Слоўнік несапраўдных зьвестак», дзе расказаў пра памылку Шарля Пэро.

У «Нашай Ніве» у «Папялушцы, або Крышталёвым пантофліку» былі толькі дзьве маралі, а трэцяя — будзе нашае ўдакладненьне, бо, як кажа мудрасьць: «Нікому ня вер, ніхто не падмане»...

Міхась Малиноўскі, Баранавічы

Паштовая скрынка

А.М. зь Віцебску. Рэцэнзія атрымалася «перадузятая», з-за чаго аргумэнты не разьвіваюцца і не спрацоўваюць, а пагразаюць у агульнай хвалі адмоўнага настрою. У такіх выпадках крытыка мусіць быць бесстароньняю і ляпідарнаю.

В.Г. зь Менску. Навошта зьбіраць подпісы і «падымаць грамадзкасьць на абарону зборніка Васіля Быкава «Сьцяна», калі можна замовіць гэтую кнігу сабе, сябрам і знаёмцам і праз тое спрычыніцца да яе выхаду? Інакш можна чарговы раз «нашумець», застаўшыся безь ніякага плёну. На нашу думку, адраджэньне нацыі адбываецца не праз выбітыя ў палітычнага рэжыму падачкі, а праз грамадзкія ініцыятывы. Калі, напрыклад, з-за матэрыяльных праблемаў Вы ня можаце замовіць такую кнігу самі, яе можа замовіць ваша рэгіянальная бібліятэка або школа, дзе вучыцца вашае дзіця. Паведамце ім пра такую магчымасьць. Наш беларускі Дом будуецца па цаглінцы, прырашчэньнем, а не галёканьнем, зборам падпісак, а ня подпісаў. Калі кожны сьведамы беларус заагітуе на гэтую кнігу сваіх суседзяў ды блізкіх, то мы выдадзім сапраўды народную кнігу для кожнае сям'і. А «Сьцяна», паверце, таго вартая.

П.С. зь Менску. Апавяданьне нас зацікавіла. Адно не хацелася б яго падпісваць ініцыяламі.

А.У. з Гомеля. Мы маглі б абмяркоўваць справу выданьня, калі б быў гатовы рукапіс. Пачынаць жа Вам варта з кансультацыяў з германістамі. Напрыклад, з мэтрамі перакладу Васілём Сёмухам і Лявонам Баршчэўскім, зь людзьмі, якія займаюцца гэтай справай у Лінгвістычным унівэрсытэце, магчыма — у Інстытуце Гётэ. Акрамя гэтага, варта, як кажуць, «вывучыць пытаньне», сабраць літаратуру, пазнаёміцца зь бібліяграфіяй. Што-нішто ў Вашым накірунку ўжо рабілася і робіцца, але заўсёды, як Вы кажаце, па-скарынаўску, нібыта зьніадкуль. Беларусы — нацыя ня толькі паэтаў, але й саматужных гісторыкаў ды слоўнікароў, якія сядзяць па гарадах і вёсках ды робяць адно й тое кожны сабе. Маеце рацыю: «ніякага адраджэньня «ў адзіночку» ў нас не атрымаецца». Таму, магчыма, і пачынаць усё трэба з аб'яднаньня высілкаў. Ці ўзяліся б Вы за такую працу ў Вашым канкрэтным накірунку? Ці змаглі б са сваёй ідэі зрабіць нацыянальны праект? Ці кінулі б кліч: «Германісты ўсёй Беларусі, яднайцеся!»? А можа яны ўжо дзе-небудзь ціхенька і аб'ядналіся?..

ВЫРВАНАЯ СТАРОНКА — СВАБОДА

Працяг са старонкі 1.

зусім не стасавацца з паняцьцямі «любімае выданьне» або «наша газэта». Думаю, нават сярод заўзятых крытыкаў ніхто не запярэчыць, што мы маем справу зь вялікай зьявай. З галоўнай газэтай беларускага адраджэньня 90-х гадоў. З найбольш прынцыповым беларускім заслонам на шляху дэспатызму. З газэтай, існаваньне якой стала індыкатарам палітычнай сытуацыі ў краіне. Спыніўшы «Свабоду», можна ўжо спыніць усё. Нехта назваў закрыцьцё «Радыё 101.2» нацыянальнай катастрофай. Закрыцьцё ж «Свабоды» — гэта выдзіраньне старонкі з кнігі беларускай гісторыі.

Свабода праіснавала сем гадоў. І я думаю: куды нас адкінулі? У 1990-ы? Але ж не падобна. Тады ўсё новае і беларускае толькі брала разгон. Вядома, чаго толькі ні выстаяла, ні перажыла «Свабода». І легальна выходзіла і нелегальна. І ў Латвіі, і ў Магілёве, і на МАЗе. Хто толькі яе ні зачыняў. Але ніколі яна не спыняла выхаду. У 90-м сёньняшнія санкцыі гаспадарчага суда ніхто б папросту ня браў да галавы. Зрэшты, і не магло быць такіх санкцыяў.

А можа, мы вяртаемся ў 1987-ы, калі КГБ арыштавала наклад падпольнага часопіса «Бурачок»? Але тады, у адказ, сьледам за «Бурачком» нібы з рога ўсяго многа пасыпаліся нефармальныя, як тады казалі, выданьні.

Яшчэ раней, да сярэдзіны 80-х параўноўваць увогуле няма з чым. Вядома, выходзілі альтэрнатыўныя публікаткі, але гутаркі не было, каб нешта там зачыняць. Бо зачыніць азначала прызнаць, разьдзьмухаць лякальны занятак якога-небудзь адзіночкі ў цэлы антысавецкі рух.

Сёньня «Свабода» — адна з самых уплывовых газэт. Яе рэдактар ведае, што такое амон і што пры найменшай спробе непадпарадкаваньня ён адправіцца сьледам за Адамовічам або Віньнікавай, або Старавойтавым — у зноў праслаўленую першым прэзыдэнтам «амэрыканку».

А можа з «амэрыканкі» трэба і пачынаць адлік вызначэньня часу? Ад сталінскага бруталізму? У кнізе беларускай гісторыі гэта — усё яшчэ непрапісаны і не зацьверджаны разьдзел. Але й тады не зачынялі незалежныя газэты. Іх проста ўжо не было. Тады што ж — ажно ў часы бальшавіцкага чырвонага тэрору вяртацца? У 20-ы год? На 80 гадоў назад?

Лёгіка падказвае менавіта такі адказ. Гэта яны толькі кажуць — «плыть в революцию дальше». Насамрэч рэванш камунізму пачынаецца не з таго моманту, дзе ў яго адабралі ўладу, а заўсёды спачатку. Няхай ён будзе называцца неяк інакш, але мы ж ведаем, што такое камунізм. Мы ж бачым, што «Свабоду» закрылі гэтаксама, як закрывалі лібэральныя і нацыянальныя выданьні бальшавікі на чале з Эдмундавічам. І гэта значыць, што Лукашэнка абяцае нам ня столькі вяртаньне ў савецкі час, колькі паўтарэньне савецкай гісторыі — ад пачатку. Ад Мясьнікяна і Кнорына. Вось якая старонка адкрылася, калі яны вырвалі з кнігі «Свабоду».

Сяргей Дубавец

ДРУГАЯ СПРОБА

Працяг са старонкі 1.

Рэшткі праваслаўнае шляхты хіліліся да Масквы. Мэханізм распаду набіраў моц. Яго ўжо ня здольныя былі спыніць намаганьні асобных патрыётаў Княства. Кожны вялікі князь бачыў сябе каралём польскім і з часам станавіўся ім, трапляючы ў зону прыцягненьня іншай дзяржавы.

Таму ні спробы аднавіць самастойнасьць, ні аднаўленьне ў правах праваслаўнай шляхты, ні выдатныя творы дзяржаўнае думкі кшталту Статута ВКЛ, ні шчырыя спробы ўвесьці асобную ад суседзяў рэлігію — ці то ўніяцтва, ці то пратэстантызм, —ужо не маглі спыніць пагібелі Дзяржавы. Яны хіба запавольвалі гэты працэс.

У рэчышчы такіях падзеяў была прайграная барацьба за асобную мітраполію. Акаталічаная шляхта і не магла перамагчы ў такой справе. А з усталяваньнем адзінай праваслаўнай мітраполіі ў Маскве па незалежнасьці нашай краіны быў нанесены канчатковы ўдар. З таго часу й да сёньня Масква стала ўплываe на нашае жыцьцё.

Казырная карта абароны праваслаўных у Беларусі пачала разыгрывацца Масквою адразу ж. Тым больш, што падставы знаходзіліся, а аргумэнты супраць такога ўплыву былі слабыя. Таму так лёгка забылася, як Іван Жахлівы рэзаў праваслаўны Полацак, як расейцы лічылі праваслаўных ВКЛ схізматыкамі і перахрышчвалі іх пры любой нагодзе, як цар Пётар узарваў сьвятыню праваслаўных — полацкую Сафію.

Тыя з праваслаўнай арыстакратыі, хто апынаўся ў Расеі, таксама паступова прымалі расейскія ўмовы палітычнай гульні, дзе інтарэсам Бацькаўшчыны месца не было.

Так, спакусіўшыся і здрадзіўшы, згубіўшы духоўную повязь са сваім народам, зьнікла наша нацыянальная эліта, а разам зь ёю і наша дзяржава. Пакінуты народ застаўся сам-насам з сабою і сваёй крыўдай. Гэтая крыўда на «лепшых людзей» працягвае жыць да нашага часу.

Недавер з боку народа да тых, хто браў на сябе абавязкі нацыянальнай эліты, прывёў да паразы трох паўстаньняў супраць расейскай акупацыі. Сяляне лавілі і выдавалі шляхцюкоў-паўстанцаў...

Тое, што адбываецца сёньня, — гэта рэцыдывы старое хваробы. Захаваўшы сакральныя сымбалі сваёй дзяржаўнасьці, эліта ня можа данесьці іх да народа, бо народ не пускае яе да ўлады. Абраньне ў 1994-м «своего парня» Лукашэнкі — гэта вынік недаверу да традыцыйнае эліты. Менавіта празь яго народ неўсьвядомлена спрабуе сфармаваць новую беларускую нацыянальную эліту, дапамагчы ёй скласьціся.

Сёньняшнія падзеі — люстраны адбітак тых, даўніх. Тая ж спакуса, тая ж здрада, той жа раскол. Толькі вэктар накіраваны не на захад, а на ўсход. Праўда, ёсьць адно істотнае, прынцыповае адрозьненьне. Ягайла і ягоная партыя былі сапраўднай спадчыннай элітай, а сёньняшні рэжым, паўтаруся, элітай не назавеш. Таму ён і ня можа прабіцца ў Расею, да расейскае кароны.

Лукашэнка — гэта выкід народнае крыўды. На нацыянальную арыстакратыю. Гэта інстынктыўная спроба народа дапамагчы паўстаць сваёй эліце. Яна мусіць паўстаць, ёй нічога не застаецца.

Па сутнасьці, мы перажываем другі сьпіральны віток свае гісторыі, другую спробу падняць дзяржаву на належны ўзровень, дзе галоўную ролю грае народны інстынкт. Грае своеасабліва і нетыпова. Гэта новая спроба стварыць Каралеўства. Каралеўства Беларусь.

Алег Дашкевіч

КАЛІ ЗЛУЮЦЦА ЮПІЦЕРЫ

Напрыканцы кастрычніка Беларускі Экзархат Маскоўскага Патрыярхату за подпісам Філарэта распаўсюдзіў сярод настаяцеляў Менскае епархіі зварот. У ім зьмяшчаецца кароткая даведка пра БАПЦ і Беларускую Народную Праваслаўную Царкву і «пастырскае занепакоеньне» іх дзейнасьцю ў Беларусі. Пакінем на сумленьні Філарэта закід пра тое, што нібыта БАПЦ не прызнаная ў сьвеце ніводнай з існых памесных Праваслаўных цэркваў, хоць насамрэч, беларускія аўтакефалы знаходзяцца пад юрысдыкцыяй Канстантынопальскага Патрыярхату і маюць прызнаньне з боку Амэрыканскае Праваслаўнае Царквы. Але, як і любая царква ў выгнаньні, БАПЦ ня можа мець статус Памеснай... Цікава іншае. Філарэта непакоіць «умяшальніцтва ў палітычнае жыцьцё Беларускае дзяржавы». Бачыце, нехта апроч Маскоўскага Патрыярхату вырашыў «умяшацца». Далей болей. Філарэт бачыць становішча людзей, якія змагаюцца за беларушчыну, трагічным. Чаму? Таму што яны, паводле ягонага звароту, «пазбаўляюць сябе ўратаваньня й вечнасьці». Вось гэткім чынам адзін зь мітрапалітаў Маскоўскага Патрыярхату адным сваім росьпісам пазбаўляе, ужо тут, на зямлі, людзей права на ўратаваньне й жыцьцё вечнае. Вось жа сапраўды, настаў час, «... калі здаровага вучэньня прымаць ня будуць...» (II Цім. 4,3-5).

Напэўна ж, шлях да вечнасьці, паводле Філарэта, гэта лабызаньні то з Кебічам, то з Лукашэнкам. А раптам усё гэта марна? І куды адправіцца чарнабровы мітрапаліт пасьля зямнога шляху разам з «каталіком» Кебічам і з наступным — «праваслаўным атэістам»? Трэба ж яму мець пэўнасьць хоць сёньня. Але яе няма. Як няма і адзінай для ўсіх дарогі да Бога. Філарэт знэрваваны. Спачатку адабралі манаполію на гарэлку, а зараз адбіраюць манаполію на ісьціну... Што ж, як казалі ў Рыме: «Юпіцер, ты злуесься — значыць ня маеш рацыі».

Другі «юпіцер» таксама не ў сабе. Вось жа прыехаў Лукашэнка ў Магілёў, на сход гаспадарчага актыву, хацеў пагаварыць пра далейшыя посьпехі ў індустрыйным будаўніцтве. Але ж не. Ня тое баліць. І меча, меча маланкі «юпіцер» у бок нашае «Хартыі'97». Ужо як толькі вочы ні закатвае, рукамі ні махае. Ну і вядома ж, гатовы, як мітрапаліт, вызначыць усім месца ў вечнасьці. «Эта истарычаскае пасмешышча!» Вось як. Вось вы хто, пісьменьнікі, мастакі, вучоныя, журналісты, палітыкі, якія праславілі краіну, на чыіх кнігах вырасьлі пакаленьні, чыя праца мацавала наш край, хто дарыў людзям харство і любоў да Беларусі.

Нарэшце, стрэлы пачалі трапляць у мэту. Не шматтысячныя шэсьці, не пустапарожнія самазьняцьці «паўнамоцтваў» ВС, не газэтная рыторыка, а спакой і ўпэўненасьць, зь якімі мы ганьбуем «знаўцаў гісторыі», выводзіць іх з раўнавагі. Злаваньне «юпіцераў» — вось знак, што мы на слушным шляху.

С.Х.

Пакуль не зачынілі Інтэрнэт:

Зьміцер Бартосік

ЗАКЛАДНІКІ ПАРАЗЫ

Выконваючы функцыі прадстаўніка «Нашай Нівы» ў Гомелі, я даволі часта мусіў сутыкацца з наступнай карцінай. Нейкае маладое дараваньне, даведаўшыся (часьцей ад агульных знаёмых) пра існаваньне ў сталіцы тоўстай літаратурнай газэты і пра існаваньне ў горадзе яе прадстаўніка, лічыла за абавязак нанесьці мне візыт, асьцярожна прапануючы свае творы, вершы, напісаныя па-расейску. Крый мяне Божа, я нічым не хацеў пакрыўдзіць юных паэтаў. Я, дзеля прыстойнасьці сьлізгануўшы позіркам па радках, з жалем у голасе паведамляў, што наша газэта беларуская. Далей усё адбывалася тыпова. Паэты сыходзілі з годна ўзьнятаю галавою, несучы ля сэрца свае рукапісы ды кепска хаваючы сваю лютую крыўду на мяне, «цьвердалобага нацыяналіста». Дзякуй Богу, шэдэўраў мне пабачыць не давялося, перад гісторыяй я чысты.

Але іхная крыўда на мяне не была зусім беспадстаўнаю. Яны, напэўна, усё ж адчувалі маю, старанна схаваную няпрыязь. Не да расейскае мовы, вядома. І, тым больш, не да іхных твораў. Мяне выводзіў зь сябе іхны выбар, хоць глуздамі я й разумеў, што мову не выбіраюць. Але зрабіць з сабою нічога ня мог. Як ня мог даць пачаткоўцам хоць якое прыдатнае парады наконт выданьня, дзе іх чакаюць. Была неяк спроба ў літаб'яднаньня «Полоцкая ветвь» выдаваць сваю газэту, але імпэту (ці грошай) хапіла толькі на адзін нумар. Разам з тым, падчас гэтых размоваў я ніяк ня мог пазбавіцца пачуцьця пераможцы. Хай не генэральнай бітвы, але немалаважнай лякальнай. Бітвы, якая пачалася даўно. Навязаная, як заўжды, небеларусамі. Аднак беларусамі даўно ўжо перадвырашаны яе вынік. Пацьверджаньні таму я знаходжу пры любым сутыкненьні з носьбітамі, ці дакладней, уцекачамі ў «лоно великой русской культуры».

Неяк занесла мяне ў адну кампанію, дзе рэй вялі расейскія інтэлігенты: ужо гадоў дваццаць «подающий надежды» бард і вельмі ж падобны на Высоцкага актор. Звыклыя да ролі «душы любой кампаніі», яны не скупіліся на свае, сто разоў апрабаваныя рэпрызы. Адзін чытаў мацерныя вершы «пад Пушкіна» («Я вас ... і г.д.), жартам называючы Аляксандра Сяргеевіча настаўнікам і сааўтарам, другі ж расказваў анэкдоты са свайго жыцьця. Ад усяго гэтага тхнула такой далёкай «перестройкой» ды «стыдабой», што жаданьне ў мяне было адно — зьбегчы як мага хутчэй, каб хоць ня ўносіць дысананс у кампанію. Але гэтыя зацейнікі, было бачна, таксама адчувалі ўсю сваю клёўнавасьць. Ды сіла інэрцыі прымушала іх крыўляцца далей, нягледзячы на тое, што ёсьць іншыя тэмы, іншыя ідэі, іншыя грошы, нарэшце, і ўсё гэта літаральна за вакном. Там, дзе мне стала лёгка-лёгка, як толькі я іх пакінуў. Лёгка ад таго, што ня трэба чырванець ды яшчэ й хаваць сорам. Да чаго я ўсё гэта? А да таго, што яшчэ гадоў шэсьць-сем таму я на абоіх глядзеў трохі зьнізу, як на шчасьлівых абітальнікаў сталічнае багемы.

А як жа ім хочацца быць сталічнымі насамрэч! Хоць на міг адчуць сваю абранасьць ды зорнасьць. Месяц таму я клюнуў на такі афішны тэкст: «Первая частная антреприза. Театральные звёзды. А.Володин «Пять вечеров». Падобныя антрэпрызы даўно практыкуюць маскоўскія акторы, зьбіраючыся на адну пастаноўку й гуляючы яе датуль, пакуль ёсьць попыт. А попыт на суквецьце імёнаў у Маскве ёсьць, як ёсьць і імёны. Тое ж, што я ўбачыў на менскай прэм'еры вельмі добрай і вельмі знаёмай усім з кіно п'есы... Я вельмі люблю тэатар і ведаю, што такое акторская праца. Таму гатовы дараваць любую «накладку» ў спэктаклі, любы перабор у гульні, любую рэжысэрскую «шызу». Але не люблю, калі зь мяне робяць дурня. У ролі «звёзд» я зноў убачыў даўно мне вядомых актораў нашага расейскага тэатра, якія разыгрывалі даўно знаёмае кіно. Строі й тыя былі як у Любшына ды Гурчанкі, што толькі падкрэсьлівала другаснасьць імпрэзы. Мне зноў было сорамна, ды й самотна ў паўпустой залі. Сталічная публіка ў гэты вечар валіла ў Дом афіцэраў, дзе па запрашэньні нашага галоўнага тэатрала гастралявала мадам Дароніна са сваёю трупай. Бедная наша публіка! Гмах даронінскага МХАТу на Цьвярскім бульвары пустуе нават на прэм'ерах (сам таму сьведка), Дароніна ніякі не рэжысэр, зоркі ўсе засталіся зь Яфрэмавым. Ці варта было так ламіцца, спытваючы пра лішні білецік каля мэтро? Атрымліваецца, жыхары Таржка й Вышняга Валачка — больш сталічныя? Ім жа ехаць да Цьвярскога гадзіны тры электрычкаю. Менавіта так.

Па-чалавечы шкада нашых «зорак эстрады»: Ялінскую, Ухцінскага, Саладуху. Якім трэба валодаць цярпеньнем, гадамі чакаючы запаветнага выкліку лёсу ў маскоўскую сінякуру на расейскія ганарары. І па-чалавечы радасна за тых, хто ўжо «прабіўся» ды зьехаў. Іх можна зразумець, яны рвуцца ня толькі з правінцыі, але й зь іншага часу.

Адзін цудоўны менскі актор неяк у захапленьні мне распавядаў, як яму ў адзін дзень прапанавалі адразу дзьве ролі: Вітаўта ў Купалаўскім і Дзяржынскага на ўрачыстасьць з нагоды юбілею КГБ. Ад князя ў галоўным тэатры краіны ён адмовіўся з творчых меркаваньняў — п'еса слабая (хоць яго, вядома, угаворвалі, як маглі — роля цягне на дзяржпрэмію, п'есу пераробім, аўтар, дзякуй Богу, жывы), а вось галоўнага чэкіста на гэбісцкім ранішніку ён згуляў. Як я зразумеў, зь меркаваньняў матэрыяльных. Сапраўды пацешыў. Толькі ўсё мне здавалася, быццам мы не па-расейску размаўляем. Хоць і расейскімі словамі — КГБ, собрание... Я ня стаў яго крыўдзіць пытаньнем: «А чаму табе й да сёньня не абрыдла ўсё гэта?» Тым больш, ведаў адказ. Не абрыдла таму, што ўсё расейскае тут толькі дажывае, разам са сваімі знакамі ды сымбалямі. І толькі ў выглядзе анэкдота можа стацца хітом. Кінаанэкдот Хашчавацкага, поп-анэкдот «Трубяцкога». Але анэкдоты два разы слухаць, як вядома, нецікава.

Цікава заваёўваць новыя абшары. Я зусім не разумею і не ладзяляю пэсымістычных настрояў адносна таго, што сёньня робіцца па-беларуску. Памятаю, як мае шматлікія расейскія знаёмыя, людзі адукаваныя ды культурныя, з разумнаю мінаю тлумачылі мне ўвесну 95-га пра «прагрэсіўнасьць» наданьня сваёй мове статусу другой дзяржаўнай. У выніку таго прагрэсу яны сталіся моўнымі закладнікамі: я не заўважаў пасьля іхнай радасьці ад таго, што сёньняшняя ўлада размаўляе адной зь імі моваю. Тыя, хто можа пралічваць на пару крокаў наперад, зразумелі, што ў наступнага рэжыму будзе іншы сродак зносінаў, ды знаходзяць у сабе сілы адолець непераадольны раней рубеж. Што да астатніх, то я даўно ўжо ня бачу ніякай небясьпекі зь іхнага боку. Пры ўсім жаданьні ім папросту ня дадзена засвоіць культурны плябарм Беларусь. Ня хопіць моцы ды й глеба ня іхная. Галодная публіка гастралёраў зь мінулага адыдзе разам зь мінулым. Яна ўжо адыходзіць. І ўжо пачынае вымалёўвацца тое, што застанецца. Ад былога «Альтернативного» застанецца «Камэдыя», адзіны беларускамоўны спэктакаль тэатру, што ўжо які год зьбірае забітыя залі ці то на 200 месцаў, ці то на 2000. Яшчэ зьменіцца не адзін склад удзельнікаў, яшчэ не адну шыльду для тэатру прыдумае Забара, а спэктакаль Андросіка будзе жыць. Яму проста не дадуць памерці тыя ж гледачы, што ходзяць на яго ў соты раз. Застануцца пастаноўкі Пінігіна, што нарабілі сапраўднага фурору ў «первопрестольной». Ужо ствараецца, дзякуючы рэжыму, легенда пра «Вольную сцэну». І гэта толькі тэатар, самы небеларускі з усіх відаў мастацтва...

Адказ я таксама бачу ў нашаніўскім «Грамафоне», дзе ёсьць вершы слабыя, ёсьць моцныя, ёсьць шэдэўры, ёсьць «ні ў якія вароты». Але чаго няма, ці амаль няма — дык гэта вершаў пра «ўчора». Ня пішуцца неяк. Асабіста мне, для аптымізму гэтага дастаткова.

ФОТА

Сховішча сьвятла

Фатаграфія — адна з самых унікальных творчых практык, вядомых чалавеку, паколькі мяжуе яна хутчэй з магіяй, чымся з тэхналёгіяй, альбо мастацтвам. Неверагодным, недасяжным разуменьню чынам промні сьвятла адлюстроўваюцца ад рэальнага аб'екта, што месьціцца перад камэрай фатографа. ТАМ і ТАДЫ дасягаюць нас, датыкаюцца да нас ТУТ і ЦЯПЕР, нібы, як казаў Ралян Барт «запозьненыя промні згаслае зоркі».

Вырваны зь бясконцай вечнасьці і запалонены фатаграфіяй пучок бясцэнных прамянёў, здольны вяртаць сваё магічнае сьвятло да невераемнасьці доўга — прынамсі да тае пары, пакуль існуе сам здымак. Дакладней, пакуль ён сьведама захоўваецца намі.

Фатаграфія — ці то старая, ці то зусім новая, вартая таго, каб да яе крохкае далікатнае паверхні дакрануліся руплівыя рукі захавальніка скарбаў. Наўзамен фота можа вярнуць страчанае апірышча ў жыцьці, ня даць канчаткова грунту сысьці з-пад ног. І тады кожнае імгненьне вашых дачыненьняў зь ёю напоўніцца невычэрпным сьвятлом водбліскаў рэчаіснасьці, якая ўсё ж калісьці была.

Камэрная, невялікая па колькасьці розных па часе іх стварэньня і тэматыцы, выстава «Сховішча сьвятла», складзеная на падставе прыватных зборaў Міхала Раманюка і Ўладзімера Парфянка. Гэтая акцыя мае на мэце прыцягнуць увагу публікі да першароднага вяўленчага сродку фатаграфіі. Арганізатары спадзяюцца таксама узьняць праблемы, зьвязаныя з захаваньнем і калекцыянаваньнем нацыянальнае фотаспадчыны.

Уладзімер Парфянок

Невядомы аўтар, г. Горадня 1900-я гады, 9,5х14 см. Здымак з прыватнага зборy М.Раманюка.

«Сховішча сьвятла». Выстава фатаграфіяў з прыватных зборaў Міхала Раманюка і Ўладзімера Парфянка. Адкрыцьцё 10 сьнежня а 18 гадзіне ў галерэі NOVA бібліятэкі Янкі Купалы. Менск, вул. Веры Харужай, 16. даведкі праз тэл.: 234-22-35, 234-46-21.

АРХЕАЛЁГІЯ

На абшарах «эўрапейскага нізу»

У пэўным сэнсе эўрапейская археалягічная навука перажывае мэтадалягічны крызыс. Так званая «працэсуальная археалёгія» апошніх дзесяцігодзьдзяў становіцца цеснай і ня вельмі зручнай для некаторых дасьледчыкаў. Кшталтуецца «постпрацэсуальная археалёгія», запачаткаваная ў 1980-х гадах. Яна вырастае на грунце ідэяў постмадэрнізму зь ягоным суб'ектывізмам, шматмернасьцю і шматзначнасьцю адзінкавых праяваў быцьця...

«Постпрацэсуальная археалёгія» адкрывае новыя пэрспэктывы, а па сьцьвярджаньню Яна Ходэра — аднога зь яе кембрыджскіх «бацькоў», зрэшты робіць археалёгію навукаю. Ідэі «археалёгіі кантэксту» ад Я.Ходэра і ягоных пасьлядоўнікаў паступова пашыраюцца на навуковыя асяродкі суседняй нам Польшчы.

Прыярытэт Познаньскай школы ў накірунку адаптацыі ідэяў постпрацэсуалізму на польскай археалягічнай глебе відавочная. Я адчуў і зразумеў гэта падчас свайго навуковага стажу ў найбуйнейшых археалягічных цэнтрах Польшчы. У сувязі з гэтым прыемна, што менавіта ва Ўнівэрсытэце імя Адама Міцкевіча ў Познані — асяродку даўніх і найлепшых універсытэцкіх традыцыяў, фармуецца кола навукоўцаў, якія разумеюць пэрспэктывы культурнадасьледніцкай повязі «Усход-Захад» і дзейнічаюць у гэтым кірунку. У якасьці прыкладу можна згадаць пра выхад некалькіх нумароў выданьня «Baltic-Pontic Studies», адкрыцьцё Ўсходняга Інстытуту, плённае супрацоўніцтва з навуковымі ўстановамі Кіева, Менску, Вільні.

Сумежжа Ўсходняй і Заходняй Эўропаў — так званая Эўропа Сярэдне-Ўсходняя, ўсё часьцей становіцца аб'ектам пільнай навуковай увагі. Што тычыцца дагісторыі (г. зн. першабытнай гісторыі) Сярэдняй Эўропы, то яна мае свой працяг на Ўсходзе. Эўрапейскі Ўсход у сваю чаргу культурна і духоўна сілкаваў тысячы гадоў

таму Эўропу Сярэднюю. Асабліва відавочна гэта праяўляецца на абшарах так званага «эўрапейскага нізу» — лясістых раўнінах, што цягнуцца ад Эльбы ўздоўж Балтыкі да нашага Падняпроўя. «Нізовыя» культуры ў старажытныя часы праяўлялі пэўную аднароднасьць. Прыкладам такога культурнага адзінства можа выступаць так званы «Тшцінец» — цыкль блізкіх і аднастайных культураў і групаў, якія існавалі ў межах 17-12 стагодзьдзяў да н. э. на прасторах Польшчы, Паўночнай Украіны й Беларусі.

Менавіта тшцінецкая супольнасьць эпохі бронзы і стала той першай і найбольш актуальнай праблемай, якою адкрываецца ў Познані цыкль міжнародных сымпозіюмаў, прысьвечаных спрэчным аспэктам разьвіцьця старажытных супольнасьцяў усходне-заходняга памежжа.

Сымпозыюм пад запытальнаю назваю: «Тшцінец» — культурная сыстэма ці інтэркультурны працэс?» праходзіў 13-16 кастрычніка ў невялікім гарадку Абжыцка пад Познаньню. Ва ўтульным палацы мінулага стагодзьдзя сабралася больш за 30 археолягаў з Польшчы, Нямеччыны, Славакіі, Літвы, Украіны. Я, маючы досьвед па тшцінецкай культуры Беларускага Палесься, рэпрэзэнтаваў Беларусь двума дакладамі.

Дылема «культурная сыстэма» ці «інтэркультурны працэс» на сымпозыюме вельмі часта была падставаю для спрэчак на мэтадалягічныя тэмы. Заўзята адстойвючы «інтэркультурнасьць» «Тшцінца» на прасторах эўрапейскага «нізу», прыхільнікі позна-ньскай школы сфармулявалі некалькі надзвычай нечаканых тэзаў. Паводле адной зь іх распаўсюджваньне культурных тшцінецкіх адметнасьцяў магло адбывацца ня столькі ў выніку эміграцыі ці іншакультурных уплываў, а шляхам пашырэньня адпаведных ідэяў («пакету адзнакаў»). Ці не магла ў аснове іх ляжаць ідэалёгія рэлігійная? Прапанаваная гіпотэза, як і шэраг іншых сьмелых меркаваньняў, была сустрэтая даволі стрымана, але ня выклікала моцнага пярэчаньня.

Паводле мэтадалягічных канонаў сучаснай «працэсуальнай археалёгіі», археалягічная навука ня ў стане сягнуць за межы сваіх (надуманых?) магчымасьцяў: рэканструяваць, скажам, ірэальны сьвет дагістарычнага чалавека, узнавіць сутнасьць палітычнага канфлікту ў глыбокай старажытнасьці і г. д. Аднак ці да канца археолягамі прачытваецца «кантэкст», г. зн. улічваюцца ўсе акалічнасьці знаходжаньня старажытнай рэчы, аб'ектаў, комплексаў? Разыходжаньні «працэсуальнай» і «постпрацэсуальнай археалёгіі» могуць вызначацца толькі супярэчнасьцямі паміж старымі і новымі ўзроўнямі разьвіцьця навукі...

Палякі не адзін раз віталі ўдзельнікаў сымпозіюму як прадстаўніцтва Першай Рэчы Паспалітай. Рэч Паспалітая, акрэсьліваючы некалі пэўны сярэдне-ўсходнееўрапейскі рэгіён, выконвала ролю стабілізацыйнага фактару ў адносінах паміж Усходам і Захадам. Аднак узьнікненьне сярэдне-ўсходнееўрапейскага рэгіяналізму ў гістарычныя часы магло быць апасродкаваным вынікам працэсу разьвіцьця архаічнага. Нашае грамадзтва, як і нашая геапалітыка, мае нашмат больш даўнія традыцыі, чым уяўляецца большасьці.

У сувязі з гэтым вялікую вартасьць набывае сума ведаў, якую назапасілі археолягі, вывучаючы першабытныя часы на абшарах Сярдне-Ўсходняй Эўропы. Прыкладам таму можа быць усё той жа «Тшцінец» часоў эпохі бронзы, які, дарэчы, некалі за савецкім часам штучна падзялялі на заходні і ўсходні ракою Заходні Буг — заходняю мяжой Савецкага Саюзу.

Мікола Крывальцэвіч

Славамір Адамовіч

RES PUBLICA FEMINA*

У Беларусі катастрафічна не хапае Мужчынаў. Мужчынаў зь вялікай літары, сапраўдных. Таму, відаць, няма і сапраўднай Свабоды. Таму і гаварыць я буду пра нашых беларускіх жанчын, самых розных, але якія вельмі часта аказваюцца мацнейшымі за тутэйшых мужычкоў.

MATER FAMILIAS**

Яна — і нам нікуды ад гэтай праўды ня дзецца, ды й ня хочам мы гэтага, — яна ёсьць вытокам і грунтам, справай і сэнсам усяго нашага існаваньня. І як бы цяжка ёй ні прыходзілася — яна выстойвае. І колькі б мужчынскае племя ні гаварыла пра яе brutto, яна застаецца netto. Баюся толькі, што страціўшы Матку нашу адзіную Беларусь, мы страцім і матак нашых у сем'ях, і сёстраў нашых родных і названых, і жонак нашых у шлюбе богапрызнаным... Страцім, як многія ўжо дагэтуль.

НЮТА

Ніколі не забуду момант, калі мне выпала быць сьведкам таго, як маці чакае сына. Я маю на ўвазе маю сястру, маю траюрадную сястру Нюту Кратовіч (прозьвішча, вядома, дзявочае). А гісторыя здарылася наступная. У сярэдзіне сямідзясятых дзьве сястрычкі, дзьве прыгожыя беларускі, Аня і Тамара, як і тысячы іхных равесьніц, зьехалі ў Менск шукаць сваё шчасьцейка. Абедзьве выйшлі замуж, у абедзьвюх па двое дзяцей: у старэйшай дачкі, у Нюты — дачка й сын. Дзесяць гадоў адпрацавала сястрыца ў ліцейным цэху менскага трактарнага — адрабляла трохпакаёвую кватэру, набытую разам з мужам, дарэчы, патомным менчуком. Праца ў ліцейцы падарвала здароўе, хоць ёй няма яшчэ й сарака. А муж аказаўся тым банальным мужычком, які сьпіўся і перастаў з гэтае прычыны быць, хоць, што праўда, яшчэ дзесь існуе. Гады два таму трактарны прастойваў асабліва часта, паколькі прэзыдэнт, як і абяцаў, заводы «запусьціў». Я тады час ад часу наяжджаў да сястры, каб неяк падтрымаць яе ў змаганьні зь лёсам, а заадно — што тут казаць — і лішні раз палюбавацца незьнішчальнай прыгажосьцю маёй кузыны.

Нюта — адно зь першых маіх, яшчэ дзяціных, захапленьняў. Ня цяжка здагадацца, што мне асабліва балюча было назіраць крах ейнага замуства. Але, на шчасьце, зь Нютай засталіся яе цудоўныя дзеці. Хутка яны стануць паўналетнімі. Дачка выйдзе замуж, а сын будзе пры ёй, адзіны й самы верны. Таму, калі неяк надвечар я заехаў да Нюты, то не сустрэў асаблівай радасьці ў ейных вачах. Я прыехаў раней за яе сына. Тады мне пашчасьціла ўбачыць адну з самых кранальных сцэнаў у нашым тэатры жыцьця: я бачыў, ЯК Маці чакае Сына. Паэты сапраўды ня хлусяць, калі пішуць пра Маці-птушку, якая імкне насустрач свайму дзіцяці, Маці-ільвіцу, Маці-патрыётку...

Седзячы за сталом на кухні і назіраючы, як Нюта выглядае за шыбаю — ці ня йдзе ўжо яе сын з трэніровак пасьля заняткаў у вучэльні, я думаў, што гэтае чаканьне й называецца «прагледзець вочы».

ВАЛЯ

Не магу не напісаць пра яе. Адна з сапраўдных захавальніц беларускай традыцыі. Родам з аднаго ваяўнічага і вольналюбівага мястэчка, са Случчыны. Яшчэ ў 70-х у мястэчку тым існаваў непісаны закон: выходзіць замуж толькі за свайго местачковага хлопца, жаніцца толькі са сваёй местачковай дзяўчынай. Валя так і зрабіла — выйшла за аднаклясьніка, нарадзіла дачку, скончыла мэдінстытут, усё жыцьцё ходзіць на службу, летам выхаднымі прападае на лецішчы. Шые, вышывае, абмывае мужа, які ходзіць на старану.

У Валі дачка ад мужчыны, за якога яна выйшла па традыцыі, паводле «закону», не зь вялікай любові, але й ня зь нехаці. Яна ціха і ўпарта цягне свой вазок, сваю каламажку лёсу паміж працай і двухпакаёўкай у Серабранцы-менскай. Адзінокая пры жывым мужы, прыгожая, гордая, раўнівая, мужная, ціхая нацыяналістка, работніца.

Даруй, што мы разьмінуліся ў часе і не змаглі парушыць традыцыю!..

ГЭЛЯ

Гэлена Дзісько, аўтарка «Нашай Нівы». Родная сястра Вітольда Дзісько, закатаванага гэбістамі ў 64-м, пра што ўжо пісалася.

Гэля мае дачку (працуе разам з маці на фэрме) і сына (служыць у войску). У свой час яна зь дзецьмі вярнулася на Бацькаўшчыну з-пад Сьвянцянаў, якія цяпер пад сучаснай Літвой. Ведае акрамя літаратурнай беларускай польскую і літоўскую мовы. Пасьля школы вельмі хацела пайсьці вучыцца, ды лёс распарадзіўся іначай. Любіць і чакае з войска сына. Даўно забылася, што такое мужчынская пяшчота. Нармальныя мужчыны ў правінцыі занятыя, а свой сьпіўся і адпаў, як счарнелы асінавы ліст-трапятун. У чарговым лісьце на маё імя Гэля піша: «... Яшчэ перадай маю падзяку за перавод, які прыйшоў якраз дарэчы. Грошы заўсёды бываюць дарэчы, асабліва ў нас. Я за іх выпісала газэты на наступны год... Самая галоўная падзея: Віця быў дома ажно тры дні. Ён там добра змайстраваў плот і яшчэ нешта рабіў, таму яго адпусьцілі на трое сутак... Віця думаў, што ў нас што-небудзь зьмянілася. Але ўсё па-старому: п'янства, дэбілізм і поўная абыякавасьць да ўсяго ў сьвеце.

Віця марыць зрабіць рамонт і тады паехаць да цябе ў Менск, бо, кажа, тут ён атупее і сап'ецца.

Сёньня ў нас у калгасе было сьвята. Давалі прэмію амаль што ўсім, хто добра працаваў. Людзі ў нас амаль усе добра працуюць, і старшыня ў нас цяпер нішто чалавек, не бальшавік, як быў той. Зоська мая атрымала 700 тысячаў... Я заняла 2-е месца па малацэ, далі двох парасят.

Што з тымі хлопцамі, што сядзяць у турме? Гэты зараза ўжо, як і Сталін, дзясей у турму садзіць. Перадай ад мяне словы падтрымкі і спачуваньня для маці Вадзіма Лабковіча...»

А яшчэ Гэлена Дзісько разам з дачкою падпісалася пад «Хартыяй-97». І лісты яна піша паводле «тарашкевіцы» з таго часу, як стала чытаць «НН».

МАРЫЯ

Марыя Ўладзімераўна. Дзетдомаўка. Яшчэ пяцідзесяці няма. Любімага мужа пахавала. Адыход ягоны перажывала так моцна, што й сама захварэла — зашчапіла нэрв у пазваночніку. Кажа, нетрадыцыйная мэдыцына дапамагла. Але працуе цяпер на спакойнай і лёгкай рабоце.

Знайшоўся быў чалавек, зь якім думала век давекаваць, ды не атрымалася. Чалавек гэты пачаў піць і хутка дапіўся да белай гарачкі. Урэшце пад час чарговага прыступу ўсадзіў сабе нож у сэрца. А нажом-ткі ён любіў размахваць. Зрэшты, як кажа Марыя, дзеці таксама маглі дапамагчы бацьку пайсьці на той сьвет. Часта яны яго таўклі, часта ён прыходзіў да сваёй Марыі зьбіты, у крыві. Але не для Марыі ён быў...

У свае сорак сем яна зусім сівая. Носіць кароткую стрыжку, але не фарбуецца. Есьць часнык і ўжо не спадзяецца спаткаць свайго мужчыну. Мае, між іншым, нямецкія карані ў родзе, муж быў расейцам. А вось з замужняй дачкой у яе ня склаліся адносіны, настолькі, што яна думае адпісаць сваю трохпакаёвую кватэру зусім староньняму чалавеку. Марыя верыць свайму новаму знаёмаму, вяжа яму швэдар і піша ў падараваным яму ж нататніку: «Желаю счастья очень много и все невзгоды избежать, ещё любви тебе желаю, хорошей, чистой как слеза...»

Ні другой дачкі, ні сына ў Марыі няма. У цэлым сьвеце іншай радні яна ня мае.

БАГУСЛАВА

Ужо даўно адна. У сваю двухпакаёўку пасьля мужа так нікога й не прывяла. Не, у яе няма праблемаў, што да мужчынскае ўвагі. Проста другое каханьне так і не прыйшло. Затое ёсьць любы сын, які ад яе далёка, у Расеі, займаецца бізнэсам. А вось унука яшчэ не падарыў.

Багуслава таксама кажа, што мае кроплю нямецкае крыві. Але найперш яна беларуска, нават нацыяналістка. Зь вялікае сям'і яна адна змагла выбрацца ў горад і атрымаць адукацыю. І гэта дзякуючы старэйшай сятры, якая была для меншай і за бацьку, і за матку.

Багуслава працуе пэдагогам, сьпявае ў фольк-гурце і не губляе жыцьцёвага аптымізму. Але, як і ўсе жанчыны, яна не цураецца ні сьлёзаў жалю да самой сябе, ні пачуцьцяў рэўнасьці, ні гатоўнасьці паверыць любімаму чалавеку безаглядна, беспаваротна.

ЧАТЫРЫ ІРЫНЫ

Ірына Мікалаеўна

Мае 34 гады. Выглядае на свой узрост. Працуе ў мэдычнай установе, да нядаўняга часу брала дадатковую работу ў «хуткай дапамозе»... Любімаму сыну Сяргею, народжанаму ад любімага некалі першага мужа, споўнілася трынаццаць. Ірына Мікалаеўна з захапленьнем расказвае, як лёгка яна вынасіла свайго першынца, як хацела нарадзіць яго. «Жывата» не было відаць настолькі, што, калі цяжарная заявілася ў раддом і сказала: «Я прыйшла нараджаць», дактары ёй не паверылі. Прыйшлося паказаць дакумэнты.

Сын Сяргей — гэта ўсё, што засталося ад першага ў жыцьці Ірыны Мікалаеўны мужчыны й мужа. Яна ўспамінае, як дружна, у якой любові жылі яны свае першыя пяць гадоў. У доме заўсёды было весела, частымі гасьцямі ў ім былі сябры і знаёмыя. Муж быў заўзятым паляўнічым і рыбаловам, разводзіў кактусы і акварыюмных рыбак, а аднойчы падабраў у тралейбусе бадзяжнага ката. Ірына Мікалаеўна мусіла потым выхаджваць тое божае стварэньне. А вось другога дзіця ейны мужчына так і не захацеў. І ці ня з гэтай нехаці пачалося потым тое, што пачалося: муж пачаў піць, нешта ў ім надламілася. Нібы чалавек датэрмінова выканаў сваю чалавечую праграму на зямлі. А тое, што яшчэ перамяшчаецца па паверхні фізычная абалонка былога мужа Ірыны, дык цяпер гэта проста фармальнасьць, бо ЧАЛАВЕК ейны зьнік, прапаў назаўсёды. І нават лёс уласнага сына яго не цікавіць.

А сын, сын сапраўды прыгожы, відаць, што народжаны ў любові. Сяргей займаецца бальнымі танцамі, вядзе свой юначы дыярыюш і захоўвае ў сваім спальным пакоі фатаграфію, на якой ён маленькі, а побач мама і тата. Час ад часу Сяргей дастае фота і глядзіць на такое добрае, маладое і вусатае аблічча бацькі. У дзёньніку Сяргей некалі запісаў: «Когда мама приходит с работы, я стараюсь её развеселить. Папа опять пьяный. Я его ненавижу...»

Другі раз Ірына Мікалаеўна выйшла замуж за мужчыну, маладзейшага за яе гадоў на пяць. Зь ім яна пражыла яшчэ менш, чым зь першым. Гэтым летам яны зьбіраліся разьвесьціся. Але здарылася так, што другі мужчына выехаў за мяжу, як ён казаў, на заробкі. А потым прыйшла позва зь міліцыі. Ірыну Мікалаеўну дапытваюць, дзе і пры якіх абставінах яна апошні раз бачыла мужа, які праваахоўнымі органамі падазраецца ў злачынстве.

Ірэна

Сорак гадоў. Калі яна затрымліваецца ў сяброўкі Ірыны Мікалаеўны, сын Зьміцер тэлефануе сыну Сяргею і просіць паклікаць маму.

Дзіма ўжо амаль дарослы і вучыцца ў вучылішчы. 23 лістапада ён разам з мамай і цёцяй Ірынай быў на апазыцыйным мітынгу і ад душы выкрыкваў антырэжымныя лёзунгі.

Мама Ірэна шукае новую работу і мужа. Першы ейны мужчына, якога яна так кахала яшчэ са школы, таксама сьпіўся, сьпіўся і памёр у няпоўныя сорак. Сьпіўся ён пасьля таго, як стаў займацца гарэлачным бізнэсам. А да гэтай пары яны ўдваіх служылі ў савецкім ВМФ, у горадзе Балтыйску. Потым распаўся СССР, муж, жонка і сын вярнуліся на Бацькаўшчыну... Цяпер Ірэна працуе домаўпарадчыцай трохпавярховай будыніны, якая належыць «новаму беларускану». «Новы» сплочвае спадарыні Ірэне за прыборку трох паверхаў два з паловай мільёны й тым самым падтрымлівае ў Краіне сытуацыю «а-ля 1917»...

Іра-сабачніца

Сабачніца, бо любіць сабак. А яшчэ — свайго сына, які застаўся ад мужа. Горатата зрабіў дзьве ходкі на турму і дзе цяпер знаходзіцца — сказаць цяжка. Іра больш не перажывае: яна мае працу ў краме, сына, сабаку, якога трэба кожны дзень выгульваць, і гэткіх жа адзінокіх сябровак, зь якімі можна сустрэцца і разам дружна паплакаць над сваёй бабскай доляй.

Іруся

Іруся мэдык, хірург. Гадкоў трыццаці пяці. Яна ўвогуле не была замужам. Не сказаць, што ня бралі, хутчэй сама ня йшла, усё хацелася «пагуляць». Дужа панікавала, калі даведалася, што стала цяжарнаю. Але Ірына Мікалаеўна адназначна парадзіла: нараджай, сяброўка, калі ня хочаш застацца векавухай.

Нарадзілася дачка. Бацька дзяўчынкі даў ёй сваё прозьвішча, хоць маму замуж яшчэ ня ўзяў. Аднойчы да Ірусі вярнуліся панічныя настроі, пачала папракаць сяброўку тым, што тая дала ёй дрэнную параду. Ірына Мікалаеўна падумала тады, ці не забраць нованароджаную сабе...

Пакуль што гадавалая Люба застаецца з роднаю мамай. Дачку Іруся назвала ў гонар сваёй маці, якой даўно ўжо няма побач.

ЯДЗЯ

Ядвіга Язэпаўна Лабковіч, маці Вадзіма Лабковіча (гл. №31 «НН» за 20 кастрычніка 1997 г.).

EX TOTO***

Можна было б яшчэ доўга распавядаць пра нашых жанчын, сярод якіх ёсьць ня толькі захавальніцы сямейнага агменю, але й таленавітыя гетэры, банальныя распусьніцы, істэрычныя дурніцы... Аднак сказана дастаткова, каб задумацца над праблемаю, якім чынам Беларуская Нацыя дваццаць першага стагодзьдзя зможа арганізаваць супрацію уласнаму фізычнаму й духоўнаму выміраньню. І запомніць наступнае: Quod non licet feminis, aeque non licet viris****.

** Рэспубліка Жанчына (лац.).*

*** Маці сямейства (лац.).*

**** Цалкам, поўнасьцю, бяз рэшты (лац.).*

***** Што не дазваляецца жанчынам, тое самае не дазваляецца і мужчынам (лац.).*

Аляксей Каўка

Недыпляматычныя нататкі

Беларускі дзёньнік

«Страсьці беларуса ў небеларускіх абставінах»... Пасавала б, мабыць, і гэткая назва да прапанаваных ніжэй нататак. Кожан з нас на свой лад пакутуе й суцяшаецца ад сваёй Беларусі — паколькі слугаваць ёй цэльна, арганічна скрозь было й застаецца праблемай вельмі няпростай для нашага чалавека. Беларусь — малітва мая, споведзь, дыханьне маё, таемны сакрум мой. Але ці толькі мой? Перачытаў свае дыпляматычныя запісы амаль дваццацігадовае даўніны, і не пакідае адчуваньне вострае іх надзённасьці, што сягае за межы асабістых перажываньняў. Адышла ў нябыт эпоха («мирового социализма») — час паўстаньня нататак; краіна мая сінявокая (хто мог толькі падумаць...) сіганула ў замежжа з уласнымі амбасадамі, прадстаўніцтвамі; нараджаецца беларуская палітыка — няхай пакуль вельмі неадназначная, супярэчлівая ў сэнсе сваёй нацыянальна-дзяржаўнае адэкватнасьці. І пытаньне беларускасьці ў беларусе, служывым, як ніколі на часе. Ды й само паняцьце беларуса ў сёньняшнім вымеры не падаецца мне адназначным. Адзнака ў так званай пятай графе (кажуць, ужо адмененая)? Прафэсія (пісьменьнік, настаўнік беларускае мовы...)? Грамадзянская, маральная пазыцыя (супраціў асымілятарству ў тваёй Бацькаўшчыне)? А можа інакш: Беларус у табе — гэта крыж горычы й сьвятла. Пакуль нясеш яго — жывеш, будзеш жыць.



Аўтар
Масква, 1997

4 красавіка 1979.

«Решение на Вас состоялось. Надо выезжать срочно», — так сустрэлі ўчора ў ССОД'дзе*. І пачалося: новыя людзі, новыя імёны, новыя праблемы, шмат ва ўсім гэтым, на першае ўражаньне, мітульгі, прапаганды і, здаецца, вельмі мала культуры, прадстаўляць якую й садзейнічаць азнаямленьню зь якой пакліканы лёсам аблыселы заўчасна хлапец-дзяцюк зь беларускай вёскі Машчаліна. Мова пра культуру ня толькі, мо й ня гэтулькі Яўтушэнкі, Акуджавы, Магамаева, Пугачовай. Але таксама, для мяне ж мо перадусім — культуры Дастаеўскага, Твардоўскага, Коласа, Рыльскага, Паліеўскага, Брыля... Тое ж і з навукай...

Слухалі-глядзелі з Соняй на ўчорашнім канцэрце «польскай культуры» ў Крамлёўскім Палацы. Клімук, Гермашэўскі і... канцэрт Шапэна. Палітык з польскага боку прыгадаў на ўрачыстым адкрыцьці аб «вячыстай непарушнай пшыязьні двух народув — польскі і СССР». Не з уласнай, зрэшты, віны мыліцца ён адносна колькасьці тых самых народаў-сяброў. Заснавальнікі Люблінскай вуніі некалі таксама далей «двух народаў» ня рушылі, чым дужа заклапацілі — і надоўга! — нашчадкаў.

Добра, не адной палітыкай жывы чалавек, прынамсі на «Днях культуры». Культурай найперш, той культурай, што словамі паляка Бранеўскага (артыст Т.Ламніцкі) удакладніла — ды як пранікнёна, шчыра, па-польску! — імёны народаў і справу іх супольнай духоўнасьці:

Подай мі длонь Бялорусь,
Подай мі длонь Украіно..

8 красавіка 1979.

(...)Да ўчарашняга спэктаклю ў тэатры «Вспулчэсны» (гастролі на сцэне маскоўскага МХАТу). А праймалі-такі маральныя пакуты салдата-малдаваніна (Іон Друцэ, «Сьвятая сьвятых»). Годам раней давялося гэтую ж пастаноўку ў купалаўцаў менскіх бачыць, — ні мовы (па што, бадай, і сігануў быў з Масквы ў стольны Менск), ні дзеяньня, ні відовішча. Пазяхаў менскі глядач і самаедзтваваў — за актораў і публіку — маскоўскі псых. І вось зусім іншае дзейства на польска-габрэйскай (рэж. М.Энглерт, арт. Ян Эглерт, Р.Пэрыт) «вэрсіі» драматычнай: плакаў, прасьвятляючыся, ачышчаючыся душою, глядач. Госьці з Варшавы не сказаць каб «ігралі» п'есу — яны жылі ідэяй і дзейнічалі, апантаныя, узьнёслыя, у імя ідэі. Ну й форма: і драма, і камэдыя, і рамантычная акрыленасьць, і трошкі польскага пацешна-хлёсткага кабарэту, але ні кроплі эклектызму; скразная захапляючая дынаміка ў слове й вобразе. Трэба было ўбачыць, параўнаць і трошкі зажурыцца за беларускі тэатар.

9.04.1979 г.

Бягу ва Ўстанову, да новых сваіх працадаўцаў — «паказвацца», запасацца задачамі, абавязкамі, не без усьмешкі згадваючы учорашнюю засьцярогу аднаго з начальнікаў: «Какой ужас... Вы же совершенно не ориентируетесь в специфике...» Нічога, у нечым жа такі арыентуемся. Ці ня так, Васілька, дружа мой?

Апоўначы. Наогул дзень, як і папярэднія ў гэтай звычайнай гаспадарцы мітусьлівай, нічым цікавым ня ўцешыў, не ўсхваляваў. Ды й ЛІМ, як і папярэднія, — сумны, нават самога клясыка Т. белыя вершы чамусь не кранаюць. Загляну ў «Контекст-78», амаль «крамольны», кажуць, па ўсёй Маскве ў росшуках кнігаманы й ня толькі яны. Пакуль асэнсаваць ідэю юліянскага старажытнарускага календара, занатую простую рэпліку Мэрымэ:

«... Я ахвотна аддаў бы Фукіда за спраўдныя мэмуары Аспазіі ці якога Пэрыклавага раба, бо толькі мэмуары, гэтая непасрэдная гутарка аўтара з чытачом, даюць нам той малюнак чалавека, які цікавіць і займае мяне».

Такім чынам, чым бы я ні займаўся, памятаць пра непасрэднае, жывое...

11.04.1979.

«... тых, што пакідаюць шляхі простыя, каб валачыцца шляхамі цемры...» Ад ранку да вечара калідорамі, сходкамі, зь дзьвярэй у дзьверы. Слухаў, выслухоўваў. Можа, Фіхтэ («Сучасная эпоха») і дапамог прыстойна зьнесьці нудныя настаўленьні, павучаньні. Горшае, аднак, наперадзе. І гэта разумею. Ці падрыхтаваны на горшае? Ці не «сарвуся», не закрычу, не залямантую? Калі б начасе ведаць тое, запаветнае: сьвяцільнік, што ў табе ды не патухне.

16.IV.79.

Варшава... Яшчэ не зусім тая , што da się lubić. Заклапочаная, запрацаваная — імчыць, сьпяшаецца на «Фіятах», «Старах», «Татрах», насустрач сонцу й вясьне. Той самай, амаль забытай, дзіўнай вясьнянцы з далёкага дзяцінства. Бусьлінае крыло над страхой, згледжанае ўчора ўжо на гэтым баку савецкае граніцы. Бялун даўгадзюбы застыў над гняздом урачыста, ацярушаны смугою блакітнаю, сонечнай. Пралязгатаў цягнік — бусел не страпянуўся: прызвычаіўся, мабыць, да шумоў нязвыклых, надакучлівых, а можа проста ўсьвядоміў сваю бусьліную непадуладнасьць нашай зацывілізаванай таропкасьці. Са мною ж, у валізе, таксама харашыня «бусьліная»: «Зямля пад белымі крыламі» Караткевіча...

17 красавіка 1979.

Пакрысе прадстаўнік стаецца дыпляматам, хоць наўрад ці набудзе адпаведныя кандыцыі, нават «некар'ернага». Затое кнігі ў Варшаве ўжо набываюцца, ды якія. Дзеля вось такой вечаровай гадзіны варта было трывожыцца, пабойваючыся нечаканасьцяў, цэлы дзень. Дзе яшчэ паласкавела б вока, згледзеўшы нязвыклае выданьне: «Antologia poezii białoruskiej». І сэрца ўзварухнулася б ад нечага мілага, пяшчотнага.

30 красавіка 79.

«Францішак Скарына паходзіў зь Беларусі, але пачуваўся палякам» (Perspektywy, 1978, N 48) — ня больш, ня менш. Што ж, дачакаемся Сьцяпанавых (Александровіча) нататкаў аб беларускім асьветніку на адной з сусветных моваў ды пашлем — чаму б не? — пану Будкевічу.

3 траўня 1979.

«Гаворыць Менск...» Так, сюды, у польскую сталіцу далятае радыёхвалямі голас мае Беларусі.

Хаця ня надта нашыя галасы слухаюць, а часам увогуле замоўчваюць. З пачуцьцём прыкрасьці гартаў «Antalogie opowiadania radzieckiego». 40 аўтараў! Усім знайшлося месца: і Зошчанку, і Аксёнаву, не забыты й мой знаёмы з далёкага Азэрбайджану Акрам Айлісьлі (пэўне ж варты «польскай» пашаны). Вось толькі пра бліжэйшых суседзяў пановe-«анталягісты» забыліся. Няма ні Коласа, ні Брыля, ні Стральцова, ня кажучы пра маладзейшага векам ды сьпелага талентам Алеся Жука. На мапе «радзецкего» апавяданьня няма беларусаў, няма Беларусі. Нешта ж трэба рабіць. Ня жаліцца, але сказаць, не прыніжаючыся, пра Дні польскай літаратуры ў Беларусі.

6 траўня 1979.

Траўня — цёплага, тапалінага — пакуль не чуваць. Змрочна, сіверна. Карчом цалюсенькі дзянёк (нядзелька) за сталом. Банальная справа, прымітыўнейшы сюжэт, а наколькі мулка даецца, каб «скляпаць» яго па зададзеных мерках.

Падвечар — галава, што цэбар: пустая й цяжкая.

Дыбаў атулены цямрэчай ціхаю сьцяжыной парку Лазенкавага, намармытваючы радкі спольшчанага Багдановіча. Лягчэла глуздам, сьвяжэла ў галаве, спакайнела на душы. Хораша й смачна прагучваецца слова роднае ў польскім перакладзе:

Ciemnieje brzeg zębaty boru...
I oto ręka mimowolnie,
Zamiast uczonych pierskich wzorów
Zaczyna tkać bałwaty polne.

І нечакана неяк «Слуцкія ткачыхі» зь лірычных сутоняў паляка Тадэвуша Хрусьцялеўскага нібы знову набываюць беларускую таемнасьць:

Смуга нябёс над сінім борам...
Рука дзяўчыны мімаволі
Замест чужой зямлі ўзораў
Сноуе блакіт льнянога поля.

Мабыць з такім рэфрэнам пачнецца заўтра слова маё пра Беларусь перад «пілотамі»-турыстамі. Прыдбаць яшчэ экзэмпляр «Анталёгіі паэзіі беларускай» ды падараваць Ежы В. — няпростаму сябру майму з палякаў — сыну польскага чыгуначніка з Баранавічаў, пакрыўджанага верасьнем 1939... Ды й Васілю паслаць трэба — у падзяку за «Этымалягічны слоўнік», што ціхенька прытаіўся тут, на «варшаўскай» паліцы й чакае свае пары.

7 траўня 1979. Дакладней — ужо 8-га.

Поўнач тут цяжэй пераносіцца. Сьвінцовая галава. Чародны ж дзень не лягчэйшым ад учарашняга будзе.

Працяг на старонцы 11.

Чысты жанр

Гэтым разам чытачам «Шуфляды» прапануюцца нататкі аднаго савецкага дыплямата, які працаваў у Польскай Народнай Рэспубліцы ў 1979-1982 г. Гэтыя нататкі насычаныя культурнымі рэаліямі і ўнутранымі дыскусіямі тае эпохі — і яны значна адрозьніваюцца ад вобразу тае эпохі, які ствараюць сёньняшнія «саветы-затары» ў Беларусі. Праз імёны тады забароненых аўтараў і прыхаваныя думкі пра сыстэму мы можам бачыць, як уся сыстэмы паступова пасоўвалася ў нябыт. І гэтыя нататкі створаныя менавіта тады — у канцы 70-х — пачатку 80-х. Яны не перапісаныя й не падпраўленыя пазьней — таму ўяўляюць сабою жанрава чысты дакумэнт для архіўнае паласы.

Але, апроч усяго, аўтар гэтых нататак — беларускі нацыяналіст. За тры гады да ад'езду ў Польшчу Аляксей Каўка ўжо напісаў свой «Ліст да расейскага сябра». Як узгадвае сам аўтар, увосені 1976 году ў адной з чарговых «застольных» гутарак з расейскім сябрам, колішнім калегам па міжнароднай дзейнасьці ў ЦК ВЛКСМ («ён зь Піцера, філёляг, балканіст, востры інтэлектуал, зь ліку радзецеляў і пакутнікаў за Русь, творца і носьбіт расейскае ідэі ў яе «единонеделимой собирательной» сутнасьці»), суразмоўца сп. Аляксея ў кантэксьце развагаў пра беларусаў паблажліва заўважыў, не без блюзьнерства: «Ну, вы не хахлы. Нашыя, крэўныя. На вас можна пакласьціся. А калі так даражыце сваёй мовай, дык пакіньце сабе сваё «ў».

Вось тады пачалася праца Аляксея Каўкі над «Лістом да расейскага сябра». Джым Дынглі пераклаў яго на ангельскую мову; тэкст выходзіў па-польску, па-ўкраінску, натуральна, па-расейску.

І вось пасьля гэтых падзеяў аўтар становіцца савецкім дыпляматам. Раздвоенасьць нарастае.

Затое наяўнасьць дыпляматычнага пашпарту спрыяе перасылцы на Захад паштовак Яўгена Куліка да 1000-годзьдзя Беларусі (надрукаваныя там ў 1980), рукапісу Алега Бембеля «Родная мова й маральна-эстэтычны прагрэс» (кніга выйшла ў Лёндане ў 1985).

Кожны выкарыстоўвае сваю кар'еру па-свойму.

Алег Дзярновіч

ІНФАРМАТАР

Бясплатныя прыватныя абвесткі

Тыя, хто вызнае сапраўдную рэлігію продкаў і шануе старажытных багоў, калі вы шукаеце аднадумцаў, пішыце. 220093, Менск, пр-т Пушкіна, 83-98. Аляксей

Зборнікі «Беларускія патрыятычныя песьні», «Беларуская нацыянальная партызанка». Тэл.: 240-78-01. Віталь

Летувіскае радыё па-беларуску штодня на сярэдніх хвалях а 21.05

Ёсьць у вас, як і ў іншых, сьвятыня. Не давайце сваю сьвятыню псам! Ул. Караткевіч

Польскае радыё па-беларуску штодня на кароткіх хвалях а 14.30, 16.30 і 20.00

Ватыканскае радыё па-беларуску штодня на кароткіх хвалях а 6.20 і 20.00

Прадаю мэблю ўзору 70-х гадоў. Тэл.: 236-43-08

Куплю 1-ы том энцыклапэдыі «Міты народаў сьвету» 1992 г. в. 220114, Менск, Кучынскай Н. Да запатрабаваньня

Здольнай дзяўчыне з вышэйшай адукацыяй патрабуецца крэдыт для навучаньня ў Менскім лінгвістычным універсытэце. Па заканчэньні адпрацую

Запрашаем у беларускамоўнае асяродзьдзе, дзе вы спраўдзіце патрэбу ў духоўных дачыненьнях. Даведкі штосеравы з 17.00 да 18.00 праз тэл.: 265-74-12

«Гарызонт» CTV 655-TI новы, гарантыя, танна прадаю. Тэл.: 211-21-08

Ліцьвінаў-паганцаў запрашаю да перапіскі. Шукаю больш падрабязныя зьвесткі пра паганства. 211440, Наваполацак-6, а/с 24. Зьмітро Аўсянікаў

Пераклады: нямецкая, польская мовы. Тэл. у Гомелі: 57-77-27, з17 да 22. Ірына Ўладзімераўна

Zaprašajem liečvinaŭ manarchičnaha kirunku. VKL! 246012, Homiel, a/s 124. Aleś Čorny

Шукаю працу перакладчыка альбо выкладчыка зь веданьнем беларускай ды іншых моваў. Школы не прапаноўваць. Тэл.: (8-277) 3-33-20

Пазнаёмлюся з прыхільнікамі ліцьвінскай мовы. Тэл.: 241-19-42

Танны запіс з CD, LP. Тэл.: 249-04-19 (Міхаіл)

Шукаю паплечнікаў для абмену інфармацыяй і далейшай працы на тэму «Малая фартэфікацыя ў Беларусі». Тэл.: 249-56-09

Прадаю значкі, запісы, плякаты гуртоў «NRM», «Новае Неба», «Палац», «Крама», «Жыгімонт Ваза» і інш. 220085, Менск, а/с 5. Тэл.: 231-04-08, 249-08-88

Куплю альбо прыму ў падарунак артыкулы, плякаты, рэдкія запісы беларускіх гуртоў. Вельмі патрэбныя запісы «Магістрата», «Рэй», «Рокаў», Сокалава-Воюша і інш. 220085, Менск, а/с 5. Тэл.: 213-50-41. Сяргей

«Малады Фронт» запрашае на свае паседжаньні моладзь шточацьвера а 19 гадзіне. Менск, Варвашэні, 8

Прадаю тэксты гурта «Камэлот» з акордамі. 220085, Менск, а/с 5. Тэл.: 231-04-08. Супрановіч Віталь.

Zaprašajem liečvinaŭ manarchičnaha kirunku. VKL! 246012, Homiel, a/s 124. Aleś Čorny

КУПОН

Бясплатнай прыватнай абвесткі

Тэкст:

Імя і прозьвішча

Адрас, тэлефон

Запоўніце гэты купон і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. 220123, Менск, а/с 71

НАРОДНАЯ КНІГА

Васіль Быкаў. Сьцяна

Пасьля неаднаразовых прапановаў нашых чытачоў і з ласкавае згоды народ-нага пісьменьніка Беларусі Васіля Быкава выдавецтва «Наша Ніва» ажыцьцяўляе выданьне новае кнігі прозы В.Быкава «Сьцяна». Гэтае выданьне рыхтавалася ў дзяржаўным выдавецтве, але сёньняшні палітычны рэжым спыніў выхад кнігі. Мы далёкія ад думкі, што беларускае слова можа ў прынцыпе існаваць толькі за дзяржаўныя датацыі, і мяркуем, што паміж творамі народнага пісьменьніка, як, зрэшты, і іншых таленавітых літаратараў, з аднаго боку, і чытачом — з другога, ня мусяць паўставаць непераадольныя бар'еры чынавенскае прыхамаці. Кнігі лепшых беларускіх літаратараў будуць выходзіць у такім аб'ёме і датуль, колькі і дакуль у гэтых кніг будзе чытачоў. Гэтак нарадзілася ідзя стварыць прэцэдэнт Народнае Кнігі. Мы імкнемся, насуперак цынічнаму да нашае мовы й культуры рэжыму, сьцьвердзіць, што беларускія кнігі мусяць выходзіць за грошы і дзеля патрэбаў беларускага грамадзтва.

Кніга «Сьцяна» складаецца з празаічных твораў Васіля Быкава апошніх гадоў.

Васіль Быкаў у новай кнізе прозы паказвае, наколькі немагчыма, але наколькі важна на самых фатальных этапах гісторыі захоўваць чалавечнасьць, прыстойнасьць, годнасьць. Псыхалягічныя сытуацыі ў крытычных абставінах становяцца напружанымі сюжэтамі, а дакладныя характарыстыкі самых розных чалавечых тыпаў змушаюць чытача ўвесь час адчуваць уласную прысутнасьць сярод быкаўскіх пэрсанажаў і рабіць свой маральны выбар.

Кніга Васіля Быкава «Сьцяна» выйдзе ў сьвет сёлета. Выдавецтва «Наша Ніва» зьбірае папярэднія замовы на кнігу.

Нагадаем, што той, хто замаўляе кнігі «НН» да іх выхаду ў сьвет, аплочвае толькі сабекошт і кошт перасылкі, тады як гатовая кніга з гандлёвымі нацэнкамі будзе каштаваць значна даражэй.

Пра тое, як замовіць кнігу Васіля Быкава, чытайце на наступнай старонцы газэты.

У Менску зноў пачаў працу ШАПІК ТБМ

Тут можна набыць сьвежыя і старыя нумары пэрыёдыкаў, у тым ліку «Нашае Нівы», кнігі. Шапік ТБМ працуе на вуліцы Леніна каля Дзяржаўнага Мастацкага Музэю паміж вуліцамі Маркса і Кірава.

Беларускі патрыятычны сьпеўнік

«Наша Ніва» супольна з камэрным мужчынскім хорам «Унія» працягвае новы праект — стварэньне сучаснага Беларускага патрыятычнага сьпеўніка. Апрацаваныя намі тэксты і ноты песень будуць друкавацца на старонках газэты, а вынікам праекту стане кніга «Беларускі патрыятычны сьпеўнік» і аднайменная аўдыёкасэта або CD у выкананьні хору «Унія». Выкананьне гэтага праекту мы прымяркоўваем да 80-х угодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі (25 сакавіка 1998 г.).

О, Беларусь, Мая Шыпшына

Словы У.Дубоўкі.

О, Беларусь, мая шыпшына,
Зялёны ліст, чырвоны цвет.
У віхры дзікім не загінеш,
Чарнобылем не зарасьцеш. (а-а...)

Пялёсткамі тваімі стану,
На дзіды сэрца накалю,
Тваіх вачэй пад колер сталі
Праменьне яснае люблю. (а-а...)

Варожасьць шляху не зачыне,
У перашкодах дух расьце.
О, Беларусь, мая шыпшына,
Зялёны ліст, чырвоны цвет. (а-а...)

Падаецца для жаночага ансамблю ці дуэту з акампаніямэнтам фартэп'яна. Можа выконвацца й салёва — верхні голас.

Пытайцеся ў шапіках «Белсаюздруку» і ў прыватных распаўсюднікаў, а яшчэ лепш — выпісвайце

Дык падпісвайся!

НАША НІВА

Падпісны кошт у 1998 годзе:
на месяц — 18.000 руб.
на квартал — 54.000 руб.

НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЭТА Індэкс 63125

Шаноўныя чытачы. З кожным месяцам няўхільна пашыраецца кола падпісчыкаў «НН». Прычым так адбывалася і сёлета ў летнія месяцы, калі газэты звычайна пераживаюць зьмяншэньне колькасьці падпісчыкаў у «мёртвы сэзон», так адбываецца і цяпер. Але сёньня мы хочам зьвярнуць увагу тых, хто яшчэ ня выпісаў «НН», што гэта — вельмі практычная мера. У складанай сытуацыі, калі русіфікатарскі аўтарытарны рэжым гвалтам выгнятае зь Беларусі ўсё беларускае, можа стацца так, што мы здолеем дастаўляць Вам газэту ТОЛЬКІ ПРАЗ ПАДПІСКУ. Таму мы звяртаемся да ўсіх нашых прыхільнікаў стаць нашымі падпісчыкамі, а ўсім нашым падпісчыкам разам з падзякаю адрасуем наступную просьбу: дашліце, калі ласка, на адрас рэдакцыі Вашыя падпісныя квіткі і адрасы. Тады пры любых абставінах Вашая сувязь з «НН» не перапыніцца.

Рэдакцыя

ПАДПІСКА

Васіль Быкаў
Сьцяна

Каб замовіць новую кнігу прозы Васіля Быкава «Сьцяна», трэба 68.000 (кошт выданьня) + 20.000 (паштовыя выдаткі) пералічыць на рахунак: БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поіск» г. Менску, Код 987.

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» указаць назву кнігі й Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсьць, тэлефон.

Аляксандар Лукашук
«За кіпучай чэкісцкай работай»

Сцэны з жыцьця катаў

Новы кніжны праект «НН» — вынік шматгадовага архіўнага пошуку, на падставе дакумэнтаў дасьледуюцца ўнутранае жыцьцё НКВД і норавы чэкістаў-курапатчыкаў, мэханізмы цэнзуры і драма сучаснага маральнага выбару, адкрываюцца невядомыя старонкі нацыянальнай трагедыі.

Кніга «За кіпучай чэкісцкай работай» стане чарговым ілюстраваным выданьнем пад грыфам Архіву Найноўшае Гісторыі сьледам за ўжо вядомымі нашаму чытачу «Менскай вясной — 96», «Гартам» і «Філістовічам». Мяркуецца, што новая кніга ўбачыць сьвет у кастрычніку.

Папярэдняя замова (сабекошт + кошт перасылкі) складае 44.000 + 15.000 БРБ.

Каб замовіць кнігу, неабходна пазначаную суму плюс суму за перасылку праз пошту пералічыць на наступны рахунак: БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поіск» г. Менску, Код 987.

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» указаць назву кнігі й Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсьць, тэлефон.

Зьвяртацца можна праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч. Тэлефон для кантакту (8-017)-2-31-04-08 у працоўны час.

КНІГІ – ПОШТАЙ

Каб замовіць патрэбную Вам кнігу, неабходна пазначаную суму плюс суму за перасылку праз пошту пералічыць на наступны рахунак: БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поіск» г. Менску, Код 987.

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» указаць назву кнігі й Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсьць, тэлефон.

Зьвяртацца можна праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч. Тэлефон для кантакту (8-017)-2-31-04-08 у працоўны час.

№	Аўтар і назва	кошт	кошт перасылкі
1	Гарт. З успамінаў пра Саюз Беларускіх Патрыётаў.	60.000	16.000
2	А.Лукашук. Філістовіч. Вяртаньне нацыяналіста.	28.000	12.000
3	А.Цьвікевіч. «Западнорусизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў 19 і пачатку 20 в.	40.000	16.000
4	І.Абдзіраловіч. Адвечным шляхам. Дасьледзіны беларускага сьветапогляду.	10.000	10.000
5	Е.Ширяев. Русь Белая, Русь Чёрная и Литва в картах.	40.000	12.000
6	М.Говард. Сучасная культурная антрапалёгія.	25.000	16.000
7	У.Ла Бар. Асабістасьць з псыхалягічнага пункту гледжаньня.	12.000	10.000
8	Дж.Эйчысан. Гаваркія істоты. Уводзіны ў псыхалінгвістыку.	10.000	12.000
9	Што такое параўнальнае літаратуразнаўства.	25.000	12.000
10	Б.Фэйган. Уводзіны ў археалёгію.	10.000	12.000
11	Дж.Лоўзі. Гістарычныя ўводзіны ў філязофію навукі.	20.000	12.000
12	Ж.Дзюрасэль. Эўропа з 1815 году да нашых дзён.	15.000	16.000
13	Ф.Брэтон. Выбух камунікацыі.	20.000	12.000
14	Ж.Эрш. Філязофскае здумленьне.	30.000	12.000
15	Ш.Дэбаш. Уводзіны ў палітыку.	30000	16.000
16	К.Рын. Дэмакратыя і этычнае жыцьцё.	25.000	10.000
17	Дж.Бэрдшоў. Эканоміка. Ч1: Мікраэканоміка. Дапаможнік для студэнтаў.	45.000	20.000
19	Фрагмэнты (філязофіі, культуралёгіі, літаратуры) №2(97)	40.000	20.000
20	Крыўя. №1, 1994	45.000	12.000
21	Крыўя. №1, 1996	55.000	12.000
22	В.Кіпель. Беларусы ў ЗША.	15.000	16.000
23	М.Грыгор'еў. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі.	20.000	10.000
24	Т.Сапач. Восень.	10.000	6.000
25	А.Глёбус. Толькі не гавары маёй маме.	30.000	16.000
26	А.Глёбус. Скрыжаваньне.	10.000	6.000
27	Э.Сміт. Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі.	15.000	12.000
28	Беларускі вайсковы строй і зброя.	20.000	6.000
29	Беларускі рок-н-рол.	10.000	6.000
30	П.Бэрк. Рэнэсанс.	25.000	12.000
31	Ю.Штайнэр. Эўрапейскія дэмакратыі.	25.000	20.000
32	Ё.Тэрборн. Эўропа сёньня і заўтра(1945-2000).	32.000	16.000
33	А.Дэні. Гісторыя эканамічнай думкі.	70.000	24.000
34	Я.Найдзюк. Беларусь учора і сёньня.	30.000	12.000
35	В.Гапоненка. Іван Яркоўскі. У пошуках гармоніі сусьвету.	10.000	6.000
36	А.Ятусевіч. Слоўнік зоапаразітаагічных тэрмінаў.	20.000	10.000
37	Ніл Гілевіч. Любоў прасьветлая.	35.000	12.000
38	С.Станкевіч. Русіфікацыя беларускае мовы ў БССР і супраціў русіфікацыйнаму працэсу.	10.000	6.000
39	Г.Сяржаніна. Беларуская навуковая тэрміналёгія. Біялёгія.	10.000	10.000
40	Ніл Гілевіч. Талісман.	15.000	10.000
41	Я.Станкевіч. Маленькі МАСКОЎСКА-БЕЛАРУСКІ слоўнік ак.	10.000	6.000
42	Л.Мірачыцкі. Сьветлым ценем Адама Міцкевіча.	10.000	6.000
43	Рэформа беларускага правапісу 1933 года.	6.000	6.000
44	Тэрміналягічны СЛОЎНІК па вышэйшай матэматыцы для ВНУ.	20.000	10.000
45	И.Хозеров. Белорусское и смоленское зодчество 10-13 вв.	30.000	12.000
46	Ул.Арлоў. Адкуль наш род.	85.000	15.000
47	Я.Запруднік. Беларусь на гістарычных скрыжаваньнях.	55.000	16.000
48	Новы Запавет.	65.000	16.000
49	Каралеўства Беларусь: Посткаляніяльная культура.	105.000	15.000

ДЗІЦЯЧАЯ КНІГА

1	Кася ў школцы.	9.000	14.000
2	Шарль Пэро. Чарадзейныя казкі.	20.000	26.000
3	Лагодны Цмок.	15.000	21.000
4	Гарасьо Кірога. Казкі трапічнага лесу.	15.000	21.000
5	Графіня дэ Сэгюр. Зачараваная хатка.	20.000	26.000
6	Марві Яла. Дзівосная Ноч.	15.000	21.000

КАСЭТЫ – ПОШТАЙ

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць касэты (кошт 38.000 + 7.000 БРБ)

Ален. Нармалёк (1995)
Ален. Нармалёк 2 альбо Мафія (1996)
Вольга Акуліч.Трохкутнік
Вальжына Цярэшчанка (1991-1995)
Беларускія народныя казкі
Музычныя казкі (1996)
Бонда. Найлепшыя песьні
Данчык. Я ад вас далёка. Мы адной табе належым
Данчык. Мы яшчэ сустрэнемся.
Новае неба. Дзеці чорнага гораду (1991)
Новае неба. Сон у трамваі (1994)
Новае неба. Go home (1995)
Новае неба. Мая краіна (1996)
Крама. Хворы на рок-н-рол (1993)
Крама. Гэй, там, налівай! (1994)
Крама. Камэндант (1995)
Крама. Лепшыя песьні (1993-1995)
Мроя. Найлепшыя песьні з праграмаў 1988-1990
NRM. LaLaLaLa (1995.)
NRM. Одзірыдзідзіна (1996)
Беларуская музычная літаратура (т.1-4)
Залаты фонд Беларускага рок-н-ролу (т.1-5) т.1. Бонда. Уліс. Рэй. Мясцовы час. Блізьняты (1986-1990) т.2. Бонда. Уліс. Мроя. Крама. Новае неба. Мясцовы час. Тутэйшыя хлопцы (1990-1993) т.3. Золотая середина. Отражение. Алексей Шедько & Доктор Моро. Гранит. Метро. Сузор'е. Зартипо (1986-1991) т.4. Палац. Уліс. Крама. Новае неба. Мроя (1992-1994) т.5. Зиндан. Why Not. Отражение. Инспектор. Торнадо. Флэт (1992-1994)
Рок па вакацыях-96 (НРМ. Уліс. Флэт. Торнадо. Крама. Рублёвая зона. Новае неба. А.Шадзько і А.Юшын)
Будзьце аптымістамі, рабіце дзетак (Новае неба. Ляпис Трубецкой. НРМ. Палац, 1996)
Беларускі джаз т.1. Рэнэсанс т.2. Ігар Сафонаў т.3. Яблычная гарбата. Пчаліны танец.
Беларуская гітарная музыка (1996)
Беларуская сымфанічная музыка (1996)
Яўген Паплаўскі. Творы (1996)
Лепшыя музычна-драматычныя творы радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная» т.1. Чалавек, якому хацелася ўсяго (памяці Ф.Мэркуры) т.2. Лесьвіца ў нябёсы (фантазія па матывах Лед Зэпэлін, Робэрта Планта і Рычарда Баха) т.3. Танец поўні (прагулка са Стынгам)
Андрэй Мельнікаў. Успамін (1994-1995)
Андрэй Мельнікаў. Салам Саўкам (1993)
Андрэй Мельнікаў. Песьні выгнаньня (1991-1993)
Андрэй Мельнікаў. Камяні майго вогнішча (1994-1995)
Андрэй Мельнікаў. Да апошняга камісара (1995-1996)
Андрэй Мельнікаў. Гэта мы (1996)
Андрэй Мельнікаў. Шлях. 2 часткі (1996)
Уліс. Краіна доўгай белай хмары (1990)
Уліс. Чужаніца (1991)
Уліс. Танцы на даху (1993)
Уліс. Life-96
Уліс. Блуканьне (1996)
Мясцовы час. Наша ўскраіна (1991)
Віктар Шалкевіч. Смутны беларускі блюз (1996)
Палац (1995)
Песьні беларускіх бардаў (1992)
Рок супраць рэвалюцыяў (Новае неба. Зіндан. Уліс. Мроя. Крама, 1994)
Маладзёжныя хрысьціянскія сьпевы. Прыйдзі і праслаўляй (1996)
Ліцьвіны. Неба і зямля (1994)
Ліцьвіны. Пятае сакавіка (1996)
Зьміцер Бартосік. Да пабачэньня... (1996)
Уладзімер Клімовіч. Дзеці вятроў (1997)
Камэлот. У краіне талераў. (1995)
Эдуард Акулін. Мая Крывія. (1996)
Неруш (1997)
Ігар Палівода. «Максім» (1997
Новае неба. Выбранае. Песьні з альбомаў 1990-1996 г.
Уліс. Ратуйце вашыя душы. Песьні з альбомаў 1996 г.
NRM. Made in NRM. Песьні з альбомаў 1995-1996
KRIWI - праект фольк-мадэрн студыі «Палац»
Купалінка - Kupalinka. Folk-group.
Ліцьвіны. Галуб на чарэшні.
Песьнярок. Песьні «Песьняроў» у выкананьні «Крамы», NRM, «Троіцы», «Тарнада», «Пані Хіды», «Ляпис Трубецкого», «Нейродюбеля», Валіка Грышко.
Белы сон (Беласток, 1997)
Харошкі. Полацкі сшытак, традыцыйная музыка (1997)
Жыгімонт Ваза. Стан Галюцынацыі
Марыя Скуратовіч. Табе, Хрысьце!
Песьнярок. CD (170.000)
Кардон. Радыяцыя
Мроя. Дваццаць восьмая зорка
Небясьпечная Зона (Exhumator, Sarcastic Green, Barfly's Dreams, Gernunnos, God's Tower ды інш.)

КОШТ КАСЭТАЎ 43.000 + 7.000 ПОШТА

Gods Tower. The Eerie.
Gods Tower. Canticles.
Plastic Hardcore. Ultra.
Chemical Warfare. Demolition Tape.
Headcleaner. Hash. Hash. Resistance.
Insania Trivium. Candle of Fire.

Касэты можна замовіць праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч

ЛІТОЎСКАЯ МЭТРЫКА

Выйшла з друку чарговая кніга Мэтрыкі – том 11 (Кніга запісаў). Папярэдне выходзілі тамы 5, 6, 7, 8, 10. Просьба ахвотным дасылаць свае заяўкі пісьмова на адрас: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч. Калі Вы маеце тэлефон, пазначце яго.

Даведкі праз тэл.: 249-08-88 да 10 гадзінаў раніцы; 231-04-08 у працоўны час.

БЕЛАРУСКІЯ МУЗЫЧНЫЯ НАВІНКІ:

1. Кардон. Радыяцыя. – Б.А.С. (1995 г.), З.Б.С. (1997 г.)
2. Мроя. Дваццаць восьмая зорка. – Мэлёдыя, З.Б.С. (1997 г.)
3. Небясьпечная Зона. Лепшыя беларускія ангельскамоўныя гурты.
4. Рэзэрвацыя. Частка І. Зборка альтэрнатыўнай музыкі.
5. Андрэй Мельнікаў. За сьцягі, за волю... – Літаратурна-мастацкая суполка.
6. Алмазный Фронт. Жизнь в городе без моря.
7. Пани Хида. Проза и стихи. – Пан Records.
8. Кали Юга. Дороги. – Skat Records.

Новыя кнігі, дасланыя у рэдакцыю

Антонович И. После современности: Очерк цивилизации модернизма и постмодернизма. – Мн.: Беларуская навука, 1997. – 446 с. – Наклад 1.000 ас. ISBN 985-08-0067-4

Брестская уния 1596 г. и общественно-политическая борьба на Украине и в Белоруссии в конце XVI – начале XVII в. Часть I. Брестская уния 1596 г. Исторические причины события / Ответственный редактор Б.Н. Флоря. – Москва: Издательство «Индрик», 1996. (Институт славяноведения и балканистики). –199 с. – Наклад 1.000 ас. ISBN 5-85759-045-0

Философский поиск. Белорусский философский журнал. – Выпуск 3, 1997. – Менск: Пропилеи, 1997.

НАРЭШЦЕ!

У сыстэму кнігараспаўсюджаньня паступае каталёг мастацкае акцыі «Каралеўства Беларусь: Посткаляніяльная культура». У рэпрадукцыях і тэкстах праз кансэрватыўнае мысьленьне, але авангардныя формы рэпрэзэнтаваная сучасная беларуская культура. Цікавая ўжо не залежна ад рэжыму.

Умовы падпіскі – у блёку «Кніга – поштай» (пазыцыя № 49).

АРХІЎ БЕЛАРУСКАЙ РОК-МУЗЫКІ

Беларускі Гуманітарны Фонд «Наша Ніва» стварае Архіў беларускай рок-музыкі. Галоўная мэта новага праекту – збор матэрыялаў і дасьледаваньне сучаснай незалежнай музычнай традыцыі Беларусі.

Архіў зьбірае: старыя, рарытэтныя аўдыёвідэаматэрыялы, друкаваную прадукцыю (газэты, часопісы, афішы, плякаты і да т.п.).

Зацікаўленым асобам просьба зьвяртацца на адрас:

Архіў беларускай рок-музыкі, а/с 5, Менск 220085,

або праз тэлефон: (017) 231-04-08 (Сяргей Сахараў).

НАВІНКА!

Брестская уния 1596 г. и общественно-политическая борьба на Украине и в Белоруссии в конце XVI – начале XVII в. Часть 1. Брестская уния 1596 г. Исторические причины события. –Москва: «Индрик», 1996. ISBN 5-85759-045-0

Кніжка выйшла ў рамках праекту «Бібліятэка» маскоўскага Інстытуту славяназнаўства й балканістыкі. Гэты зборнік – першае спэцыяльнае дасьледаваньне пытаньня ў расейскае гістарыяграфіі апошніх 50-ці гадоў.

МУЗЫЧНЫЯ АБВЕСТКІ

2 сьнежня ў Пэдагагічным універсытэце а 20 гадзіне адбудзецца канцэрт беларускага рок-гурта «Крама». Кошт квіткоў 40.000 рублёў.

4 сьнежня «Малады Фронт» запрашае на прэзэнтацыю акустычнай праграмы Касі Камоцкай («Новае Неба») «Мне на сэрцы золатам вышывалі краты...» Канцэрт адбудзецца ва Ўправе БНФ (Варвашэні 8) у 19.30. Кошт квіткоў 15.000 рублёў.

грамафон.

Алесь Айна

(зь Яна Твардоўскага)

КОЛЬКІ РАЗОЎ

Маўчаньне падчас размовы
маўчаньне ў лісьце
маўчаньне ў тэлефоннай кнізе
бо застаўся толькі нумар
маўчаньне ў маўчаньні
маўчаньне вялікага шчасьця
маўчаньне, бо прыйшло каханьне
а сэрца ў клініцы
маўчаньне бо дом бацькаў прыгадаўся
бо сьнегу выпала няшмат
маўчаньне па маўчаньні
маўчаньне перад цэнзурай
маўчаньне бо сабака завыў як да вайны

колькі разоў
ня верачы нават
мы сустракаемся ў іншым сьвеце

Андрэй Аляксандраў

НАТОЎП — ЧОРНЫ

Калі я шукаў паратунак,
Асьлеплы ў імгле канфармізму,
Я ў сэрца прыняў боль сусьвету —
І раптам расплюшчыў я вочы!
Угледзеўся ў душы людзкія,
Знайшоў там людзкую бяздушнасьць,
Якую старанна хаваюць
У мёртвыя хвалі натоўпу.
І я са зьдзіўленьнем убачыў,
Што колер гніючае масы
Бяз волі,
Бяз сэрца,
Бяз твару,
Бяз гонару
І без сумленьня,
Якая завецца натоўпам,
Зусім не такі, як здаецца:
Ня шэры ён, бо ў ім ня кроплі
Няма ні сьвятла, ні паветра.
Ён — чорны,
Як подых нябыту,
Як злая сымфонія сьмерці,
Як стогн, што даносіцца зь пекла.
І толькі здаецца ён шэрым,
Таму што яго асьвятляе
Магутны агонь неўміручы,
Што з сэрцаў гарачых ірвецца,
Каб зьнішчыць маўклівую цемру...
Натоўп ім ня можа прабачыць —
Сьвятым, сьмелым рыцарам Праўды,
Што ведаюць Ісьціны словы, —
Іх сьмеласьць, сьвятло й неўміручасьць.
Ён полымя топча старанна,
Каб больш не ўзыходзіла сонца,
Якое нясе прасьвятленьне.
І гіне агонь гэты дзіўны
У пашчы халоднае твані,
Каб з попелу зноў нарадзіцца
І зноў асьвятліць нерухомасьць,
Якая здаецца нам шэрай.

НОЧ — СЬВЕТЛАЯ

Ня верце таму чалавеку,
Хто скажа вам:
Ноч — гэта цемра,
Бясконцая чорная бездань
І мёртвай пустэчы прастора.

Ноч — сьветлая
(Гэта дакладна),
Бо вечна яе асьвятляюць
І месяц,
І дзіўныя зоры,
І яркі, нястрымны, чароўны
Агонь маладога Каханьня,
Які блаславёны сусьветам;
І сэрцаў гарачых паходні,
Якія да шчасьця імкнуцца;
Пакутнікаў вочы сьвятыя
І душы іх, што надзяляюць
Любоўю,
Надзеяй
І Верай
Зямлі нашай грэшную кволасьць...

І толькі здаецца ноч чорнай
З-за страху,
і зайздрасьці подлай,
і здрады,
і думак нядобрых,
Якія жыцьцё растварае
У чорных атручаных сэрцах...

***

Мы ў саюзьнікі клічам ворагаў,
Каб змагацца з самімі сабой.
Зноў заплацім мы вельмі дорага —
Але ж мы не стаім за цаной,
Асаблівa, калі пытаньне
Стаіць аб змаганьні
З сабой.

Аляксандар Антончык

ЮНАК І МАРА

Займеў мару юнак слаўны
Неаб'ёмну, як сусьвет,
Сарамлівую й маўкліву,
Прыгажэй за ружы цвет.

Зь ёю ён ў хвіліну вольну
Узьлятаў вясёлкай у неба,
Забываўся пра нягоды
Быў давольны куском хлеба.

Яна роспач і тугу
З думак выганяла,
Узамен радасьцю й надзеяй
Душу напаўняла.

Жыла ў сэрцы, як ў садочку,
Усім была давольна,
Жыцьцё яе ў цяпле і ласцы
Ішло, цякло павольна.

Але з часам птушцы-мары
Стала сумна жыць,
І пачала яна ў хлопца
Ласкава прасіць:

«Адпусьці на волю, браце,
Не магу маўчаць.
Я хачу хоць раз у небе
Песьню прасьпяваць.

Убачыць сонейка прамені,
Кветачкі ў полі,
Ручаіну гаманліву,
Жаўрукоў на волі».

«Што ж, відаць, ты маеш права
На лепшую долю», —
Сказаў юнак сваёй любай
І пусьціў на волю.

Мара ж, выляцеўшы, села,
Сьвету яснаму дзівясь.
Убачыў яе цынік жорсткі
І ўтаптаў у гразь.

Утаптаў, замілаваўся
Працаю сваёю.
Быў ён з сэрцайкам халодным
І чорнаю душою.

Стаў юнак бяз мары сохнуць
У суме й скрусе жыць.
Пакуль не рашыўся думкі
Свае загубіць,

Паразьвеяць іх, каб болей
На сьвет не глядзець,
Замест зорак у бездань чорну
Дзень і ноч глядзець.

***

Калі ў сэрцы ня маеш ты Бога
І ня любіш свой люд і Айчыну,
Мне шкада цябе, істота ўбогая,
Як нямую, разумну скаціну.

Віктар Асіпенка-Ліцьвінаў

№29

Сіняе бязьмежнае неба, мусіць
ёсьць тканка арнамэнтаў жывых душаў,
спадзяюся, што гэта будзе
не скульптурных кампазіцый музэй,
нягледзячы на пацеркі сьлёз,
шэрыя ад поглядаў пагосцкіх бяроз
з усьмешкай у поўны рост.

Нябожчыкі адкрываюць вочы
жывым яшчэ адценьнем ночы.
Цяпла ў сонца столькі,
колькі ў дзесяці запаведзях, зноўкі;
улетку асабліва, зьўяецца лайно
адным краем зь пяшчотных колераў
чырвонага арнамэнту сьмялей,

душа ж сонца на тры месяцы
перасяляецца ў сьцябліны лугавых траў,
каб накіраваць іх погляд
удзень — на сонца, уночы — на зоркі:
чырвоныя, белыя, жоўтыя капялюшы
разрываюць ціш луга на глухую,
бліскучую ноч тваіх прагных вачэй,

якая ўласьцівa позірку ката Сьцівa
на расхрыстаным крэсьле каля
фортэ «Беларусь», дзе памножыўшысь
удвая,
гамы свабоднага зорна-паласатага гуку
лятуць проста на Паўночны бок бруку,
каб затым апынуцца на Поўдні мар,
бо зямля ж — амаль шар,

і паступова апанаваць думак сумнеў,
зводзячы з тонкіх нэрваў дрэў
і хмызьняку заклапочаную нуду і апошняе
адценьне прыгажосьці
ў далёкім, мілым позірку
лёгкай і прывабнай беларускай гамонкі,
падобнай на мяжу паміж ноччу і раніцай,

добра, што гук тузіна жаб не перабівае
жалезных гукаў старога трамвая ў крывых,
прычым гэта было ня што іншае, як
мігценьне начных травінак у каляровым
сьне,
які прысьніўся пад белай коўдрай
лёгка-руковым адценьням пазногцяў,
.....
хворых на рэўматызм...

Бога

ЧАМ...

— Чаму як пустэча ляжу я ў ложку
— Чаму як хвароба нікому патрэбны
— Чаму як нястача: хопіць і трошкі
— Чаму як улада заўсёды ганебны?

Напэўна, так лепей!

ЯК

Як сінайскі рыбак я шукаю рыдлёўку
І вачыма раблю зь цябе замалёўку.
Я маўчу, бо я ведаю, дзе адказы жывуць
Там адно толькі думкі свае душы ліюць...

КРО...

Кропкі згарэлі адна праз адну
Чырвоныя кроплі зьніклі раптоўна
Полымя сьлізка глытае сьліну
І ўсюды ўсё сьпяваюць чароўна

Вынесьлі кветкі, спакою няма
Бо нехта сіпіць: «Ня тое! Трэ розы!»
Подых спыніўся, мая галава
Вачыма хапае церпкія сьлёзы...

УСЁ

Ўсё скончылася раптоўна
Ніхто не пасьпеў заўважыць
Зьніклі ўсьмешкі і лёсы
Ня прыйдзецца болей бачыць

Куды ўсё пайшло, навошта
Ці варта варту шукаць
Мо трэба ісьці далей
І новыя гукі гукаць

А можа мажлівасьць адужаць
Напэўна пэўна пінаць
Здаецца зданям зьесьці
Надзейна надзею схаваць

Źmitruś Babroviec

TY ŽYVIEŠ

Dzień viasioły ŭ hości śpiašajecca;
Maci-sonca pradzie svajo pradziva,
Na daśviećci haryć-razharajecca,
Razhaniaje viasnovaje hraziva.

Dub la chaty šapoča listotaju,
A biarozka jamu azyvajecca;
Dy takoj niečuvanaju cnotaju
Pieśnia hetaja ŭ serca ŭlivajecca.

A na vilčyku busieĺ z buślichaju
Ładziać chatu, zimoj rabavanuju.
Maci-sonca z uśmieškaju cichaju
Ciahne nitku, kaliś abarvanuju.

Ty, Staronka maja rastaptanaja,
Zrabavanaja złymi čužyncami, —
Ty ŭskrasaješ iznoŭ, apantanaja,
Dy idzeš vickavymi haścincami.

Ty, pramieniami sonca zalitaja,
Šmatpakutnaja, kvoła-cnotnaja,
Niezabitaja, niezabytaja, —
Ty žyvieš, Bieĺarus maja rodnaja.

Сьвятлана Верас

СЫМБАЛЬ

Аброчны крыж на скрыжаваньні
Даўно забыў пра ручнікі.
Усе прыкметы шанаваньня
З дажджамі канулі ў вякі.

У ноч адну да ўсходу сонца
Рабіла вёска, як адзін.
Ён цьвёрда стаў, як абаронца
Ад чорных пошасных часін.

І хто б сказаў, што лёс абрыне
Бяду бяспамяцтва на край,
Зьдзічэлай жоўтаю вяргіняй
Пазначыць сьлед прыблудных згрэй?

Збуцьвелы знак маёй Айчыны...
Пануе скрозь чужынскі дух.
Дзе твой народ? Адно ўспаміны
Пра моц душы і сілу рук.

Віна, як шашаль, точыць прыкра!
Ня зьвёў бяду, не засьцярог,
Адно застыў зьнямелым крыкам
На скрыжаваньні трох дарог.

ПЕРАДЗІМОВАЕ

Я — нібы той вясновы журавель,
Што кружыць над асушаным балотам.
О, як сьпяшаўся ён з чужых зямель!
А тут — ані купіны, ні чароту.

Цяпер цішком ляцець у белы сьвет
І па глухіх ускраінах бадзяцца.
Пара прайшла, зьмяніўся зорны сьлед —
Ані назад вярнуцца, ні застацца.

Шукала я прыстанішча ля вас,
Апошнія рамантыкі стагодзьдзя,
І летуцела: вось настаў мой час,
Здабуду шчасьце ў веры і свабодзе.

А давялося жыць з душой ня ў лад,
Пасьля начы бяссоннай на сьвітаньні
Пазначыць у сіроцкім сьпісе страт
Народ, краіну, мову і каханьне.

Застаўся дым ад леташняй травы...
Але чаму, адно мне адкажыце,
Як і раней, кранаюць журавы —
Няроўны клін у выцьвілым блакіце?

МРОЯ

Нясе мяне вір, як сухую траву,
І кружыць кругамі няўхільна-павольна.
Пакуль што трымацца магу на плыву,
А плыць насупор ужо болей ня здольна.

Бяздоньне Сусьвету мігціць нада мной,
І бліскаюць зоры зь люстэрка прадоньня.
А поўня такая вісіць над ракой,
Што нават ня шкода памерці сягоньня.

Да вока далёка, яшчэ паляжу
На гладкай пасьцелі тугое вадзіцы...
Ня страшна: душою наверх палячу,
А целу таксама да зорак спусьціцца.

ПАКАРАНЫ

Пане Божа, а дзе ж маё крылы?
Я прачнуўся на грэшнай зямлі.
Сьвет ніякі — ні прыкры, ні мілы,
Угары — кола поўні астылай,
Пада мной — груды шэрай ральлі.

Адабралі прастор без затрымак.
Хто, чаму, за якую віну?
Адчуваю душой, не вачыма,
Што няма іх, няма за плячыма —
Студзіць гладкую вецер сьліну.

Значыць, кара... Ну, што ж, пацягнуся,
Пакідаючы ў пыле сьляды.
Сярод іншых істот загублюся,
Мо празь век, мо к налецьцю вярнуся,
Мо да літасьці — безьліч-гады.

Росна пахнуць здалёку мурогі,
Па мяжы зайчанятка бяжыць...
Уставай, чалавеча, на ногі —
Разыходзяцца ў полі дарогі,
Выбірай: трэба йсьці, трэба жыць.

Volha Haŭrylčyk

***

Dziciačyna-dziaŭčyna
Ad nachabnych zhraj
Uciakła, niaščasnaja,
U biarozavy haj.
Na kamli prysiela
Kab ślazami ŭmycca,
Supakoić serca,
Na biadu zabycca.
Maładaja ż pamiać
Šmat čaho ŭvabrała —
Z tych časoŭ dziaŭčyna
Sumavać pačała.
U žałobie chodzić
(Dy ŭ sukiency bielaj) —
Jaje ŭsie ličyli
Z vyhladu niaśmiełaj.
Svatoŭ nasyłali
Žanichi z uschodu,
Kab žyła dziaŭčyna
Tolki jim va ŭhodu.
Nie zmahli susiedzi
Atrymać ničoha,
Bo była dziaŭčyna
Pad apiekaj Boha.
Zhvaltavali cieła —
Volu ż nie złamali,
Što ŭ dušy šumieła
Jak na mory chvali.
I žančyna-maci
Naradziła syna,
Kab žyła ščaśliva
Rodnaja krajina.
Navučali chłopca
Viatry i dubrovy:
„Zbiracaž radzimu
Ad varožaj zmovy.
Matčyny pakuty
Apłacić prymusi...
Zastavajsia synam
Volnaj Bielarusi!»

Мікола Дубоўскі

СЬВЕЧКІ Ў ЦЕМРЫ

Мова бацькоў — крыніца.
Ведай пра гэта, паэт.
Чэрпай зь яе — і сініца
Памкне за табою ўсьлед.

Хоць вершы твае пра калёсы
Старыя-старыя, як сьвет.
Іх грукат і скрып шматгалосы
Дарэчы сягоньня, паэт.

Надарыцца цётчыным словам
Аздобіць удала радок —
Гучнее народная мова
Ад веку да веку, браток.

Бог ведае... Мо акадэмік,
Выбітны лінгвіст і знаток,
Падкрэсьліць слаўцо ў паэме
І мовіць: «Вось гэта выток!»

Нічога, калі і няўдача —
Ля грубкі зь вершамі дзед
Расчуліцца, ледзь не заплача
(Ня ў кожнага ўнучак — паэт).

І раптам ускрыкне: «Памылка!»
Во тут жа, у гэтым радку:
Гавораць ня «сілка», а «жылка»,
Каторы ўжо год на вяку.

Адна твая цётка Тадора
«Жылка» сказаць не магла —
Бяззубая рана ад гора,
Ох! Ад усялякага зла...

А калі ўжо здарыцца гэтак,
Ты вершы складаць не кідай —
Сягоньня яны — беларусаў прыкмета,
Як сьвечкі ў цемры, бадай.

Радкуй пра забытыя рэчы —
Супоню ці калаўрот...
Празь іх мо з манкурства пустэчы
Вернецца ўрэшце народ.

Уладзімер Жаўняк

***

Твае вочы заўсёды глядзяць на мяне,
Яны просяць аб тым, што зрабіць я ня вольны.
Я хацеў бы зрабіць, ды на мне ланцугі
Я такі ж, як і ты, я ўсяго паднявольны.

Ты такая, як я — любіш волю, жыцьцё,
Любіш птушкі палёт і ня любіш падзеньні,
Толькі воля, твая і мая, у яго,
Ды ўладарыць яму засталіся імгеньні.

Пад ім трэскаюцца дошкі,
Ён ляціць, ляціць, ляціць...
Ён ня ведае, што ёсьць
Ні ў яго, ні ў мяне крылы.

І як толькі сьдзе, будзе шчасьце і сьмех,
Будзе толькі каханьне паміж мной і табою.
І ты вочы заплюшчыш ад новых пацех,
Ад таго, што заўсёды ты будзеш са мною.

***

Я хачу быць з табою сягоньня,
Гэтай доўгай восеньскай ноччу.
Я хачу цябе ўзяць за далоні,
Зазірнуць у блакітныя вочы.

Я хачу, каб яны зіхацелі
Дабрынёю, каханьнем і згодай.
І хачу дакрануцца нясьмела
Я да губ тваіх мяккіх, зь пяшчотай.

Я хачу, каб і ты прачытала
У маіх вачах чалавечнасьць.
Я хачу, каб маёю ты стала
Хоць на міг, хоць на ноч,
хоць на вечнасьць.

Андрусь Клікуноў

БЕЛАРУСАМ

Ня сьпіце, нашы нашчадкі,
Ўжо час азвацца вам прыйшоў,
Каб на зямлі апошні зь беларусаў,
Як з магікан апошні, не прайшоў.

Чаму штодня сядзіце па хацінах?
Што ў спадчыну пакінеце дзіцям:
Галечу, ганьбу, з цынку дамавіны?
Нашчадкі ж слаць праклёны будуць вам!

Мы ж сьпім, у дрымоце слодкай, цёмнай,
У вачох агонь схаваўся і ў душы.
Паслухайце, штось б'е ў наш мозг — то томны,
Мярцьвячы бубна гул на шабасы.

Ня сьпіце, нашы нашчадкі,
Ўжо час азвацца вам прыйшоў,
Каб па зямлі АПОШНІ ЗЬ БЕЛАРУСАЎ
Як з магікан апошні, не прайшоў...

ЭЛЕГІЯ

Ціха дожджык цярушыць па гзымсе,
Ахінае душу дзіўнай марай:
Велізарныя чорныя шаты
Паглынаюць усё, манячы воляй,
Паглынаюць усё, душачы воляй,
Гідкай воляй, бязьмежнай ад жалю...
Зачыняюцца мройныя шаты,
Дождж цярушыць на краты, за краты,
На здранцьвелых крыжоў скрыжаваньні,
На маё і тваё пакараньне;
Пакараньне з адвечнага болю,
З хвейных мар, што ў жыцьці патанулі,
Зь сьветлых душ, што навекі паснулі,
З словаў сябра, якіх не прызналі,
Зь ясных зьнічкаў, якія сканалі...

Мікола Максімаў

2020 ГОД

Дзьве тысячы дваццаты год ідзе,
І хутка мне ўжо пяцьдзесят.
У краіне роднай па-беларуску кажуць усе,
Ня тое што дваццаць пяць гадоў назад.

Тады тут «вялікі інтэгратар» кіраваў,
Але ня вытрымаў выпрабаваньня ўладай.
Усё расейскае народу насаджаў,
І быў на могілках ён пахаваны.

Хоць моцнаю аховаю сябе ён атачаў,
Але сьмерць прыйшла зь іншага боку.
Адтуль, адкуль і не чакаў,
Зьнянацку зазірнула ў вока.

У адно, у другое... У вачах
Убачыла вялікі жах.
І правадыр славянаў усіх,
Падрыгаўся і раптам сьціх.

Пачаўся потым іншы час,
Знайшлося беларусам месца ў сьвеце.
Хапіла шчасьця і для нас,
Як і ўсім людзям на сьвеце.

Зьміцер Піскун

***

Восень у горадзе, зноўку дождж,
На бруку драны ліст.
Коткай заснула пад дахам ноч,
Вятрыска — анархіст

Ўсё мітусіцца. Няўцям, чаму
Ён уздымае тлум.
Ногі занесьлі мяне ў карчму
Хмелем памножыць сум.

Месяц з-за хмары высунуў рог,
Сьвеціць у Вакхаў храм.
У карчме пуста, сядзелі удвох:
Я і Амар Хаям.

Браніслаў Пяткевіч

ПАМЯЦЬ

Добрым словам памянём
Тых, хто жыў для нас,
Абрабляў зямлю канём
І стварaў свой час.

І каго разбурыў штых,
Выпіў кроў вампір,
Хто спаткаў са сьмерцю стык,
Каб жыла Сібір.

Хто з жыцьця навечна зьнік
Невядома дзе,
На касьцях чыіх пікнік
Сатана вядзе.

Тлум спраўляе вараньнё,
Выюць воўк, шакал.
Несканчоны ноччу, днём
Ветру дзікі шал.

А ля печкі ў цяпле
Засядзеўся той,
Хто ў сталінскім катле
Тоўк сваёй пятой.

Юры Чарнякевіч

ВЕРАСЬНЁЎСКІ РАНАК

Над ракою — сінь. Новы дзень.
У хмызьняках шапочуць вужы.
А туман — як сьнег, — і прамень,
Сустракае зямлю, дрыжыць.

І спатканьне доўгачаканае,
І раптоўны стрэл у паветры
Абуджаюць сонную раніцу
Ды прыроды сховішчы-нетры.

І з малюнкаў, пафарбаваных
У празрысты сонечны колер,
Зіхацяць расінкі сьвітанкам
На сьлязьлівым весеньскім полі.

ТРЫЯЛЕТ

Пагоні срэбраны абрыс —
Барвовы колер кроўных лёсаў.
Адбітак васількоў-нябёсаў —
Пагоні срэбраны абрыс.
Маўклівая жалоба вёсак,
З глыбінь гісторыі — званы.
Пагоні срэбраны абрыс —
Барвовы колер кроўных лёсаў.

А.Шадрын

***

Пазбаўся ўласнай турмы
У выглядзе грэшнага цела,
Кінь выклік, у чаканьні зімы,
Нябёсам — рашуча ды сьмела.

Калі цішыня навакол —
Зруйнуй яе лямантам гучным,
Калі прылятае Анёл —
Ня псуй твар свой выглядам штучным.

Калі прад табою туга —
Ня сьмейся зь яе ты зацята,
Бо поруч — сьвятло і смуга,
Бо разам — жалоба і сьвята.

Пазбаўся няволі зямной,
Пакінь вечны змрок сутарэньня!
І мы паспрабуйма з табой
Убачыць абрысы Збавеньня.

***

Чалавек, ты хто? Ты кім жадаеш стаць?
Кім ты быў дагэтуль? Ці ты меў патрэбу
Раней спадзявацца, у цішыні сьпяваць,
Плакаць, абурацца, слаць праклёны Небу?

Чалавек, ты хто? Ты кім жадаеш быць?
З чым зьвязаць свой Лёс ты хочаш назаўсёды?
Ці ты здольны зноўку верыць і любіць?
Крыж свой цяжкі несьці, крыж Сьвятой Свабоды?

Чалавек, ты хто, што "шчэ жадаеш жыць,
Гледзячы на сьвет драпежна-звар'яцелы?
Хто ты, што ня можаш забіць, схлусіць,
Ды ратуеш сьцяг наш — бел-чырвона-белы?

«Чалавек, ты хто?» — пытаю зноўку я,
«Як ты выжыць змог у трывожна-цьмянай
скрусе,
Хто ты?» — а ў адказ — начная цішыня,
Ды апошні енк забітай Беларусі...

Сымон Шаўцоў

МНЕ КРЫЎДНА І МАРКОТНА

Дарагая мая Беларусь!
Як мне крыўдна і маркотна.
Зь цябе сьмяюцца, гаротнай,
Мову тваю зьневажаюць,
Звычаяў не паважаюць...
Ты бываеш заўсёды пакорнай,
На зьнявагу цябе не адпорнай.
Адшчапенцы з твайго народу —
Твае неразумныя сыны й дочкі
Разрываюць твае грудзі
Разам і ў адзіночку.
Адракаюцца мовы сваёй,
Сьпеваў мілагучных,
Чужынцам ідуць у падручныя.
Мову дзеда, бабулі і мамы,
Што вучылі з маленства,
Цяпер забываюць, паганяць
Ды топчуць у яму.
Хай будзе за гэта ім сорам,
А як памруць — зямля ім колам!

МАТЧЫН ДАР

Мая мова — матчын дар.
Я шаную яе, як найлепшы гаспадар.
Як думаю, так гавару і пішу.
У паходзе ён шлях мне шырокі.
У палёце — гэта моцныя крылы.
У плаваньні — карабель акіянскі.
У нядолі — мой паратунак.
У рабоце — памочнік няўтомны.
У адпачынку — ўвесь супакойны.
У бяседзе — лепшы дарадца.
У застольлі — весялун нязьменны.
У небяспецы — абаронца надзейны.
У думках — дапаможнік ідэйны.
Бяз роднае мовы — ні «бэ», ні «эм».
Бяз гэтага дару я быў бы нем.
Гэты дар даражэй усяго на сьвеце,
Я яго берагу і перадаю
Сваім дзецям.

ПРАТАКОЛЫ

да Эўрапейскай Канвэнцыі аб
Абароне Правоў Чалавека й Асноўных Свабодаў

Заканчэнне. Пачатак у папярэднім нумары.

ПРАТАКОЛ №6
адносна скасаваньня сьмяротнага пакараньня

Дзяржавы-ўдзельніцы Рады Эўропы, якія падпісалі гэты Пратакол да Канвэнцыі аб абароне правоў чалавека й асноўных свабодаў, падпісанай у Рыме 4 лістапада 1950 году (далей называнай «Канвэнцыя»),

прымаючы, што разьвіцьцё, якое адбылося ў некалькіх краінах-удзельніцах Рады Эўропы, выяўляе агульную тэндэнцыю на карысьць скасаваньня сьмяротнага пакараньня,

дамовіліся аб наступным:

Артыкул 1

Сьмяротнае пакараньне скасоўваецца. Ніхто ня можа быць прысуджаны да сьмяротнага пакараньня альбо пакараны.

Артыкул 2

Дзяржава можа прадугледзець у сваім заканадаўстве сьмяротнае пакараньне за дзеяньні, учыненыя падчас вайны альбо пры непазьбежнай пагрозе вайны; такое пакараньне прымяняецца толькі ва ўстаноўленых законам выпадках і ў адпаведнасьці зь ягонымі палажэньнямі. Дзяржава паведамляе Генэральнаму сакратару Эўропы пра адпаведныя палажэньні гэтага заканадаўства.

Артыкул 3

Адхіленьні ад палажэньняў гэтага Пратаколу на падставе артыкула 15 Канвэнцыі не дапускаюцца.

Артыкул 4

Агаворкі ў дачыненьні да палажэньняў гэтага Пратаколу на падставе артыкула 64 Канвэнцыі не дапускаюцца.

Артыкул 5

1. Любая дзяржава падчас падпісаньня альбо здачы на захаваньне сваёй ратыфікацыйнай граматы альбо дакумэнта аб прыняцьці або ўхвале можа пазначыць тэрыторыю альбо тэрыторыі, да якіх ужываецца гэты Пратакол.

2. Любая дзяржава можа пазыней, у любы момант, праз заяву, накіраваную на імя Генэральнага сакратара Рады Эўропы, пашырыць ужываньне гэтага Пратаколу на любую іншую тэрыторыю, пазначаную ў заяве. У дачыненьні да гэтай тэрыторыі Пратакол уваходзіць у сілу ў першы дзень месяца, які сьледуе за датай атрыманьня такой заявы Генэральным сакратаром.

3. Любая заява, якая зробленая на падставе двух папярэдніх пунктаў і датычыць любой пазначанай у ім тэрыторыі, можа быць адкліканая праз паведамленьне, накіраванае на імя Генэральнага сакратара. Адкліканьне ўваходзіць у сілу зь першага дня месяца, які сьледуе за датай атрыманьня Генэральным сакратаром такога паведамленьня.

Артыкул 6

Дзяржавы-ўдзельніцы разглядаюць артыкулы 1-5 гэтага Пратаколу ў якасьці дадатковых артыкулаў да Канвэнцыі, і ўсе палажэньні Канвэнцыі ўжываюцца адпаведна.

Артыкул 7

Гэты Пратакол адкрыты для падпісаньня дзяржавамі-чальцамі Рады Эўропы, якія падпісалі Канвэнцыю. Ён падлягае ратыфікацыі, прыняцьцю альбо ўхвале. Дзяржава-чалец Рады Эўропы ня можа ратыфікаваць, прыняць альбо ўхваліць гэты Пратакол без адначаснай альбо папярэдняй ратыфікацыі Канвэнцыі. Ратыфікацыйныя граматы альбо дакумэнты аб прыняцьці альбо ўхвале здаюцца на захаваньне Генэральнаму сакратару Рады Эўропы.

Артыкул 8

1. Гэты Пратакол уваходзіць у сілу ў першы дзень месяца, які сьледуе за датай, на якую пяць дзяржаваў-членаў Рады Эўропы выказалі сваю згоду прыняць на сябе абавязкі паводле Пратаколу ў адпаведнасьці з палажэньнямі артыкула 7.

2. Для любой дзяржавы-ўдзельніцы, якая выкажа сваю згоду прыняць на сябе абавязкі паводле Пратаколу ў далейшым, Пратакол уваходзіць у сілу ў першы дзень месяца, які сьледуе за датай здачы на захаваньне ратыфікацыйных граматаў альбо дакумэнтаў аб прыняцьці альбо ўхвале.

Артыкул 9

Генэральны сакратар Рады Эўропы паведамляе дзяржавам-чальцам Рады пра:

a) любое падпісаньне;

b) здачу на захаваньне ратыфікацыйнай граматы альбо дакумэнта аб прыняцьці або ўхвале;

c) дату ўваходжаньня гэтага Пратаколу ў сілу ў адпаведнасьці з артыкуламі 5 і 8;

d) любое іншае дзеяньне, паведамленьне альбо інфармацыю, якія датычаць гэтага Пратаколу.

У доказ гэтага ніжэйпадпісаныя, належным чынам на тое ўпаўнаважаныя, падпісалі гэты Пратакол.

Зьдзейсьнена ў Страсбургу ў дваццаць восьмы дзень красавіка 1983 году на ангельскай і французскай мовах, прычым абодва тэксты зьяўляюцца аднолькава аўтэнтычнымі, існуюць у адзіным экзэмпляры, які захоўваецца ў архіве Рады Эўропы. Генэральны сакратар Рады Эўропы накіроўвае засьведчаныя копіі кожнай дзяржаве-чальцу Рады Эўропы.

Публікацыя зробленая паводле замовы Рады Эўропы.

ПРАТАКОЛ №7

Дзяржавы-чальцы Рады Эўропы, якія падпісалі гэты Пратакол,

поўныя рашучасьці зрабіць захады дзеля забесьпячэньня калектыўнага выкананьня некаторых правоў і свабодаў з дапамогай Канвэнцыі аб абароне правоў чалавека й асноўных свабодаў, падпісанай у Рыме 4 лістапада 1950 году (далей называнай «Канвэнцыя»),

дамовіліся пра наступнае:

Артыкул 1

1. Іншаземец, які на законных падставах пражывае на тэрыторыі якой-небудзь дзяржавы, ня можа быць высланы зь яе інакш як дзеля выкананьня рашэньня, прынятага ў адпаведнасьці з законам, і мусіць мець магчымасьць:

a) падаць аргумэнты супраць сваёй высылкі,

b) перагляду сваёй справы, і

c) дзеля гэтых мэтаў паўстаць перад кампэтэнтным органам альбо адной ці некалькімі асобамі, прызначанымі такім органам.

2. Іншаземец можа быць высланы да выкананьня сваіх правоў, якія пададзеныя ў пунктах a, b і c пункту 1 гэтага артыкула, калі такая высылка неабходная ў інтарэсах грамадзкага парадку альбо матывуецца меркаваньнямі дзяржаўнай бясьпекі.

Артыкул 2

1. Кожны, прысуджаны судом за ўчыненьне крымінальнага злачынства, мае права на тое, каб ягонае асуджэньне альбо прысуд былі перагледжаныя вышэйшай судовай інстанцыяй.

2. З гэтага права могуць рабіцца выключэньні ў дачыненьні да нязначных правапарушэньняў, вызначаных законам, альбо калі адпаведная асоба была асуджаная ўжо ў першай інстанцыі судом высокага ўзроўню альбо была асуджаная пасьля разгляду апэляцыі супраць яе апраўданьня.

Артыкул 3

Калі якая-небудзь асоба канчатковым прысудам была прызнаная ва ўчыненьні крымінальнага злачынства і калі ў далейшым вынесены ёй прысуд быў скасаваны альбо асоба была памілаваная на той падставе, што якая-небудзь новая ці наноў расшуканая акалічнасьць пераканаўча паказвае на наяўнасьць судовай памылкі, то гэтая асоба, якая панесла пакараньне ў выніку такога асуджэньня, атрымлівае кампэнсацыю ў адпаведнасьці з законам альбо практыкай адпаведнай дзяржавы, калі толькі ня будзе даказана, што гэтая асоба сама вінаватая цалкам альбо часткова ў тым, што гэтая акалічнасьць ня была своечасова адшуканая.

Артыкул 4

1. Ніхто ня можа быць паўторна асуджаны альбо пакараны ў крымінальным парадку ў межах юрысдыкцыі адной дзяржавы за злачынства, па якім ён быў канчаткова апраўданы альбо асуджаны ў адпаведнасьці з законам і крымінальна-працэсуальным правам гэтай дзяржавы.

2. Палажэньні папярэдняга пункту не перашкаджаюць перагляду справы ў адпаведнасьці з законам і крымінальна-працэсуальным правам адпаведнай дзяржавы, калі маюцца зьвесткі пра новыя альбо наноў адшуканыя акалічнасьці альбо калі ў папярэднім разьбіральніцтве меўся істотны дэфэкт, які мог паўплываць на ягоны вынік.

3. Адхіленьні ад палажэньняў гэтага артыкула на падставе артыкула 15 Канвэнцыі не дапускаюцца.

Артыкул 5

Муж і жонка маюць роўныя правы й роўную адказнасьць прыватна-прававога характару ў дачыненьнях паміж сабою і ў дачыненьнях са сваімі дзецьмі, ва ўсім, што датычыць заключэньня шлюбу, знаходжаньня ў шлюбе й ягонага скасаваньня. Гэты артыкул не перашкаджае дзяржавам рабіць такія захады, якія неабходныя дзеля захаваньня інтарэсаў дзяцей.

Артыкул 6

1. Любая дзяржава можа падчас падпісаньня альбо здачы на захаваньне сваёй ратыфікацыйнай граматы альбо дакумэнта аб прыняцьці альбо ўхвале пазначыць тэрыторыю або тэрыторыі, на якія пашыраецца ўзьдзеяньне гэтага Пратаколу, і пазначыць ступень, у якой палажэньні гэтага Пратаколу гэтая дзяржава абавязваецца прымяняць да гэтай тэрыторыі альбо да гэтых тэрыторыяў.

2. Любая дзяржава можа ў любы час пазыней, праз накіраваньне Генэральнаму сакратару Рады Эўропы заявы, пашырыць прымяненьне гэтага Пратаколу на любую іншую тэрыторыю, пазначаную ў заяве. Пратакол уваходзіць у сілу ў дачыненьні да такой тэрыторыі ў першы дзень месяца, які сьледуе за сканчэньнем двухмесяцовага тэрміну з даты атрыманьня Генэральным сакратаром такой заявы.

3. Любая заява, зробленая на падставе двух папярэдніх пунктаў, якая тычыцца любой пазначанай у ёй тэрыторыі, можа быць адкліканая альбо зьмененая праз інфармаваньне Генэральнага сакратара Рады Эўропы. Адкліканьне альбо зьмяненьне ўваходзяць у сілу ў першы дзень месяца, які сьледуе за сканчэньнем двухмесяцовага тэрміну з даты атрыманьня Генэральным сакратаром такога паведамленьня.

4. Заява, зробленая ў адпаведнасьці з гэтым артыкулам, разглядаецца ў якасьці зробленай у адпаведнасьці з пунктам 1 артыкула 63 Канвэнцыі.

5. Тэрыторыя любой дзяржавы, да якой ужываецца гэты Пратакол з прычыны ратыфікацыі, прыняцьця альбо ўхвалы такой дзяржавай, і кожная з тэрыторыяў, да якіх прымяняецца гэты Пратакол з прычыны заявы такой дзяржавы ў адпаведнасьці з гэтым артыкулам, могуць разглядацца як асобныя тэрыторыі дзеля мэтаў спасылак у артыкуле 1 на тэрыторыю дзяржавы.

Артыкул 7

1. Дзяржавы-ўдзельніцы разглядаюць артыкулы 1-6 гэтага Пратаколу ў якасьці дадатковых артыкулаў да Канвэнцыі, і ўсе палажэньні Канвэнцыі ўжываюцца адпаведна.

2. Аднак права індывідуальнага зьвяртаньня, прызнанае заявай, зробленай у адпаведнасьці з артыкулам 25 Канвэнцыі, альбо прызнаньне абавязковай юрысдыкцыі Суда праз заяву ў адпаведнасьці з артыкулам 46 Канвэнцыі ня дзейнічаюць у дачыненьні да гэтага Пратаколу, калі толькі адпаведная дзяржава не зрабіла заяву аб прызнаньні вышэйпазначанага права альбо такой юрысдыкцыі ў дачыненьні да артыкулаў 1-5 гэтага Пратаколу.

Артыкул 8

Гэты Пратакол адкрыты для падпісаньня дзяржавамі-ўдзельніцамі Рады Эўропы, якія падпісалі Канвэнцыю. Ён падлягае ратыфікацыі, прыняцьцю альбо ўхвале. Дзяржава-чалец Рады Эўропы ня можа ратыфікаваць, прыняць альбо ўхваліць гэты Пратакол без папярэдняй альбо адначаснай ратыфікацыі Канвэнцыі. Ратыфікацыйныя граматы альбо дакумэнты аб прыняцьці альбо ўхвале здаюцца на захаваньне Генэральнаму сакратару Рады Эўропы.

Артыкул 9

1. Гэты Пратакол уваходзіць у сілу ў першы дзень месяца, які сьледуе за сканчэньнем двухмесяцовага тэрміну пасьля таго, як сем дзяржаваў-чальцоў Рады Эўропы выкажуць сваю згоду быць зьвязанымі Пратаколам у адпаведнасьці з палажэньнямі артыкула 8.

2. Для любой дзяржавы-чальца, якая ў далейшым выказвае сваю згоду быць зьвязанай Пратаколам, ён уваходзіць у сілу ў першы дзень месяца, які сьледуе за сканчэньнем двухмесяцовага тэрміну пасьля здачы на захаваньне ратыфікацыйнай граматы альбо дакумэнта аб прыняцьці альбо ўхвале.

Артыкул 10

Генэральны сакратар Рады Эўропы паведамляе ўсім дзяржавам-удзельніцам Рады Эўропы пра:

a) любое падпісаньне;

b) здачу на захаваньне ратыфікацыйнай граматы альбо дакумэнта аб прыняцьці альбо ўхвале;

c) дату ўступленьня ў сілу гэтага Пратаколу ў адпаведнасьці з артыкуламі 6 і 9;

d) любое іншае дзеяньне, паведамленьне альбо заяву, якія тычацца гэтага Пратаколу.

У доказ гэтага ніжэйпадпісаныя, належным чынам на тое ўпаўнаважаныя, падпісалі гэты Пратакол.

Зьдзейсьнена ў Страсбургу ў дваццаць другі дзень лістапада 1984 году на ангельскай і французскай мовах, прычым абодва тэксты зьяўляюцца аднолькава аўтэнтычнымі, існуюць у адзіным экзэмпляры, які захоўваецца ў архіве Рады Эўропы. Генэральны сакратар Рады Эўропы накіроўвае засьведчаныя копіі кожнай дзяржаве-чальцу Рады Эўропы.

ПРАТАКОЛ №9/

Дзяржавы-чальцы Рады Эўропы, якія падпісалі гэты Пратакол да Канвэнцыі аб абароне правоў чалавека й асноўных свабодаў, падпісанай у Рыме 4 лістапада 1950 году (далей называнай «Канвэнцыя»),

поўныя рашучасьці ўнесьці далейшыя паляпшэньні ў працэдуру, прадугледжаную Канвэнцыяй,

дамовіліся аб наступным:

Артыкул 1

Для ўдзельнікаў Канвэнцыі, якія зьвязаныя гэтым Пратаколам, Канвэнцыя зьмяняецца так, як гэта прадугледжана ў артыкулах 2-5.

Артыкул 2

Пункт 2 артыкула 31 Канвэнцыі абвяшчае наступнае:

«2. Даклад накіроўваецца Камітэту Міністраў. Даклад таксама накіроўваецца зацікаўленым дзяржавам і, калі ў ім разглядаецца пэтыцыя, пададзеная ў адпаведнасьці з артыкулам 25, ён накіроўваецца й падавальніку пэтыцыі. Зацікаўленыя дзяржавы й падавальнік пэтыцыі ня маюць права апублікаваць яго».

Артыкул 3

Артыкул 44 Канвэнцыі абвяшчае наступнае:

«Толькі Высокія Дамоўныя Бакі, Камісія й асобы, недзяржаўныя арганізацыі альбо групы асобаў, якія падалі пэтыцыю на падставе артыкула 25, маюць права перадаваць справу ў Суд».

Артыкул 4

Артыкул 45 Канвэнцыі абвяшчае наступнае:

«Юрысдыкцыя Суда пашыраецца на ўсе справы, якія тычацца тлумачэньня й прымяненьня гэтай Канвэнцыі, якія перададзеныя яму ў адпаведнасьці з артыкулам 48».

Артыкул 5

Артыкул 48 Канвэнцыі абвяшчае наступнае:

1. «Пры ўмове, што зацікаўлены Высокі Дамоўны Бок, калі ён зьяўляецца адзіным, альбо зацікаўленыя Высокія Дамоўныя Бакі, калі іх больш за адзін, падпадаюць пад абавязковую юрысдыкцыю Суда, альбо, у іншым выпадку, са згоды зацікаўленага Высокага Дамоўнага Боку, калі ён зьяўляецца адзіным, альбо зацікаўленых Высокіх Дамоўных Бакоў, калі іх больш за адзін, перадаваць справу ў Суд могуць:

a) Камісія;

b) Высокі Дамоўны Бок, грамадзянін якога зьяўляецца меркаванай ахвярай;

c) Высокі Дамоўны Бок, які перадаў справу на разгляд Камісіі;

d) Высокі Дамоўны Бок, супраць якога пададзеная скарга;

e) Асобы, недзяржаўныя арганізацыі альбо група асобаў, якія падалі скаргу ў Камісію.

2. Калі справа перадаецца ў Суд выключна ў адпаведнасьці з пунктам 1.e, то спачатку яна выносіцца на разгляд групы, якая складаецца з трох чальцоў Суда. У ёй засядае ў якасьці чальца групы «ex officio» судзьдзя, абраны ад Высокага Дамоўнага Боку, супраць якога пададзеная скарга, альбо, калі такога няма, асоба на ягоны выбар, якая засядае ў якасьці судзьдзі. Калі скарга пададзеная супраць больш чым аднаго Высокага Дамоўнага Боку, то адпаведным чынам павялічваецца памер групы.

Калі справа не выклікае сур'ёзных пытаньняў, якія закранаюць тлумачэньне альбо прымяненьне гэтай Канвэнцыі й не заслугоўвае зь нейкай іншай прычыны разгляду яе Судом, група можа прыняць адзінагалоснае рашэньне аб тым, што справа ня будзе разглядацца Судом. У такім выпадку Камітэт Міністраў вырашае ў адпаведнасьці з палажэньнямі артыкула 32, ці мела месца парушэньне Канвэнцыі».

Артыкул 6

1. Гэты Пратакол адкрыты для падпісаньня дзяржавамі-чальцамі Рады Эўропы, якія падпісалі Канвэнцыю, якія могуць выказаць сваю згоду стаць ягонымі ўдзельнікамі наступным чынам:

a) падпісаньне Пратаколу без абмоўкі адносна ратыфікацыі, прыняцьця альбо ўхвалы;

b) падпісаньне Пратаколу з абмоўкай адносна ратыфікацыі, прыняцьця альбо ўхвалы з далейшай ратыфікацыяй, прыняцьцем альбо ўхвалай.

2. Ратыфікацыйныя граматы альбо дакумэнты аб прыняцьці альбо ўхвале здаюцца на захаваньне Генэральнаму сакратару Рады Эўропы.

Артыкул 7

1. Гэты Пратакол уваходзіць у сілу ў першы дзень месяца, які сьледуе за сканчэньнем трохмесяцовага тэрміну з моманту, калі дзесяць дзяржаваў-чальцоў Рады Эўропы выказалі сваю згоду быць зьвязанымі Пратаколам у адпаведнасьці з палажэньнямі артыкула.

2. Для любой дзяржавы-ўдзельніцы, якая ў далейшым выказвае сваю згоду быць зьвязанай Пратаколам, ён уваходзіць у сілу ў першы дзень месяца, які сьледуе па сканчэньні трохмесяцовага тэрміну пасьля падпісаньня альбо здачы на захаваньне ратыфікацыйнай граматы альбо дакумэнта аб прыняцьці альбо ўхвале.

Артыкул 8

Генэральны сакратар Рады Эўропы інфармуе ўсе дзяржавы-ўдзельніцы Рады Эўропы пра:

a) любое падпісаньне;

b) здачу на захаваньне любой ратыфікацыйнай граматы альбо дакумэнта аб прыняцьці альбо ўхвале;

c) дату ўваходжаньня ў сілу гэтага Пратаколу ў адпаведнасьці з артыкулам 7;

d) любое іншае дзеяньне, паведамленьне альбо заяву, якія тычацца гэтага Пратаколу.

У доказ гэтага ніжэйпадпісаныя, належным чынам на тое ўпаўнаважаныя, падпісалі гэты Пратакол.

Зьдзейсьнена ў Рыме ў шосты дзень лістапада 1990 году на ангельскай і французскай мовах, прычым абодва тэксты зьяўляюцца аднолькава аўтэнтычнымі, існуюць у адзіным экзэмпляры, які захоўваецца ў архіве Рады Эўропы. Генэральны сакратар Рады Эўропы накіроўвае засьведчаныя копіі кожнай дзяржаве-ўдзельніцы Рады Эўропы.

ЗНОСКІ:

14/ European Treaty Series, №46.

15/ European Treaty Series, №140.

Недыпляматычныя нататкі

Працяг са старонкі 6.

Аднак нешта ж зроблена — хаця б вось гэтыя 24 старонкі тэксту. Не «бесьсьмяроцьця» дзеля і ўсё ж сумленнага, прынамсі з інтэнцыяў аўтара.

Калі ж зачэрпнуць з «Чаши мудрости», можна засынаць, хоць і не саўсім спакойна:

«Не заплюшчвай вачэй, калі пацягне на сон, не разабраўшы ўсіх сваіх учынкаў за прамінулы дзень», — Піфагор.

8 траўня 1979.

У Доме савецкай навукі й культуры (ДСНК) слухаў Сяргея Бандарчука: «Знаете, я украинец и считаю эту работу (фільм «Тарас Шаўчэнка») самой дорогой для себя. Был я тогда к тому же молод — 27 лет». І спасьціглася, здаецца, таямніца ягонае ўпэўненасьці, недагаворанасьці, сьціпласьці й культуры. І мне ўцешна за іншага чалавека, што вось так непасрэдна, выразна можа гаварыць пра сваю нацыянальнасьць. Якое госьць мой вячэрні, зямляк, ня вельмі ахвочы трымацца. Хіба што «паміж намі», чаркуючы: «В нашей службе искренность, эмоции исключены. С тобой откровенен только потому, что ты из Белоруссии...»

Калі б ня быў я зь Беларусі... Каб беларусам я ня быў... Аднак жа адтуль я і ім ёсьць, — ёсьцяка, як звыклася гаварыць у маім Машчаліне. Адсюль — дыханьне, сіла й ненапісаная (недапісаная?) мая аповесьць.

17 траўня 1979.

У цэнтральнай сядзібе Таварыства польска-савецкай дружбы, на Крэдытовай — літаратурная імпрэза. Гучэла й беларуская сылабатоніка, — Язэп Семяжон чытаў фрагмэнты свайго абеларушчанага «Пана Тадэвуша». Далікатна, між іншым, прыгадаўшы і пра нашае права на «засьцянковага шляхціца» пана Адама.

Наогул жа — напружана, мітусьліва. Сустрэчы, выставы, нарады, званкі ды пасьпешлівыя сьпічы-экспромты «W imeniu». Не бяз нутранага разладу, нейкае закамплексаванасьці. Адчужанасьць, здаецца, з боку і «кар'ерных», і «некар'ерных». Трэба навучыцца маўчаць. — «Ні перад кім не варушы...» Бо інакш адсюль звычайным ходам выберасься. Пра тое ж і Аляксандар Трыфанавіч:

Не сунімаць празь іншых дабрадзеяў
Уласных крыўд агорклую тугу. —
Жыць, як жывеш: цярпеньнем і надзеяй.
Ў аглоблі стаў — забудзь пра не магу.
Сьцяжынай жорсткай мераючы крокі,
Па шчырай праўдзе — іншае няма —
Лёс асабісты гэтак узьнімаць,
Па ім каб іншы ўсходзіў лёс высока
І боль свой востры нехта сунімаў.

Санэту: да ўсяго, слова б тваё пачуць, дыханьне адчуць, Мучаніца мая, парату-нак мой.

29 траўня 1979.

«Бо калі вы будзеце дароўваць людзям выступы іхныя...» Але — покі выбачаць другім, сябе ўзяць бы за морду й анікому ані слова лішняга, запальчывага. Ні ў імя «пшыязьні», ні дзеля асабістых боляў і пячаляў. Тыя, апошнія, захліствающь. Навокал духоўная й душэўная блякада. Людзі — даруй ім Госпадзе — зарабляюць грошы й чыны, па меншай меры, не прайм аюцца, здаецца, высакародствам, маральнай цнатлівасьцю. Тут праблема «паміж» (прыслугоўваньнем і служэньнем) яшчэ вастрэй і безнадзейней.

Вечарамі — суцяшэньне ў «Цёркіне». Мог жа смаленскі хлопец-франтавік азвацца ў іншай іпастасі, пэўна й адзываўся, з-пад Слуцку ці Ігумена:

Нібы ў сьвята на гулянцы
Памасьніцы ў хаце гне.
Жарты жменяй, хай іх пранцы,
Сыпануць не праміне.
.....
А гармонь гудзе набатам,
Мілагучны сьпеў вядзе...
Людзкі вы народ, салдаты,
Пашукаць такіх людзей!

Урэшце, ня скрозь фэстывалямі, мітынгамі «прадстаўніцтву» майму прабаўляцца, ня скрозь «трыбуньнічаць». Пэўне й да «Нарадовай» (бібліятэкі), усьцяж якой пакуль што працмыгоўвае дыпляматычная «Волга», яшчэ збочыцца. І памаўчыцца.

Дак жа паспрабуй усьміхнуцца ранічцы новай і ўсьмешку лухце, хцівасьці наперакор, пранясі да вечара.

30 траўня 1979.

Урэшце і бібліятэка — пры мне, хатняя. Першае знаёмства зь філязофіяй Трэнтоўскага. Філязофія як «самапазнаньне праўды». Праўда ж у польскага мысьляра арганічная, почвенная, а ў нечым — вельмі ж мая, беларуская: «Як няможна мець дзьвюх душ, так нельга мець дзьвюх айчынных моваў». Хоць сам філёзаф выспавядаў думкі духа свайго па-нямецку, сэрцам і розумам прыпаяны быў да мацеркі-Польшчы: «Ты, гаротніца ўцісканая, плачка-сіраціна. Табе я быў бы нашмат карысьнейшы, чымся гэтай чужаніцы, абдараванай геніямі аж занадта. Толькі хто ж ёсьць гаспадаром свайго прызначэньня?»

31 траўня 1979.

Пра ўчарашняе. Быў аднак мой беларускі дзень: жыў Ёю, слухаючы, сумуючы, гаворачы. Хоць справы — тыя ж, мітусьлівыя — шыбавалі сваім торам.

Да поўдня — на пленуме Галоўнага Праўленьня Таварыства польска-савецкай дружбы. Прамоўцы даводзілі, як важна ўзмацняць яе, прыязьнь, і як яно ў кожнага робіцца. Ваявода зь Бела-Падляскі прыгадаў пра 60-годзьдзе БССР, супольнае з суседзямі-берасьцейцамі сьвяткаваньне юбілею.

Пазьней залучылася да рэстарану паабедаць зь літоўскай дэлегацыяй. Нашчадкі Гедыміна, сьветлатварыя, годныя зь сябе людзі, неяк адразу пацяплелі, паласкавелі, заўважыўшы ў сваім субяседніку беларуса. — «У нас ведь с белорусами хорошая дружба. Да и Беларусь за последнее время шагнула далеко. Раньше из Минска — за покупками в Вильнюс, а теперь и наши зачастили в магазины к соседям...»

Магазіны... Калі б толькі па іх меркаваць аб узьлёце й заняпадзе майго народа. Нешта спрабаваў удакладніць, маўляў, пабагацелі людзі, ад самазабыцьця ачуньваюць, годнасьць іхная нацыянальная ўзварушваецца.

Пра тое ж і на тэарэтычнай канфэрэнцыі дыпляматаў: няма інтэрнацыяналізму за межамі канкрэтнае нацыі, адданасьці свайму народу. Я — рускі, я — літовец, я — беларус; я — савецкі чалавек. Адно без другога не існуе. Нічога, слухалі, хай сабе не без паблажлівасьці. Мо каторому мроілася штось іншае, процілеглае: загавары кожан паляк па-руску ды яшчэ катэгорыямі «морального кодекса строителя...», пазачыняй касьцёлы (пад музэі атэізму й сьвінарнікі), абагуль сялянскія гаспадаркі — вось вам і трыюмф, «конечная цель» савецка-польскага братэрства...

2 чэрвеня 1979.

На ціхай маёй вулачцы Явожыньскай — дзіцячы галасок у ранішні блакіт: «Papież jeszcze nie przyjechał?» Тварык у хлапчаняці вясёлы, забаўны. Урэшце й Варшава — і каталіцкая, і марксісцкая — коціць чародкамі да Лазенкаўскай трасы. Сюдой вось-вось мае праехаць Сын народа, «прадстаўнік» Богачалавека на зямлі, у нядаўнім польскі кардынал Войцех Вайтыла. Пэўне горад над Віслай праймуецца ня толькі Папам Рымскім. Але наколькі хораша, аднадушна выказвае ён найпатаемнейшыя азнакі польскага патрыятызму. З расчыненых вокнаў другіх, трэціх і вышэйшых паверхаў мігцяць сьвечачкі аказіянальных, хатніх алтараў. І тутака ж, уздоўж трасы, на полі Макатоўскім загараюць варшавяне — з тых, для каго зямныя слабасьці нагэтулькі ж натуральныя, як і найвышэйшыя, «нябесныя» парыванні.

4 чэрвеня 1979.

Трэба нешта цёплае, узьнёслае пра Дзіцячую песьню польска-савецкую, пра беларускі танец і «Ручнікі» ў Зялёнай Гуры, адкуль сёньня вярнуўся. Нявыспаны, стомлены. А на кватэры «Представителя» — новы госьць, новае знаёмства. Гэтым разам — бліжэйшае, цікавейшае. Бо й тэма таго вартая: польска-беларускія літаратурныя сувязі. І субяседнік — прафэсар Базыль Бялаказовіч здаецца дастойным носьбітам і слова, і справы; добрае спалучэньне інтэлекту й практычнай дынамікі.

Але — позна й вочы ацяжэлі.

Хоць дзёрзкі Адам Ганушкевіч — з тэлеэкрану — здатны ўзварушыць ня толькі зморанага. Папулярнага рэжысэра атакуюць (мэляманы) за эклектыку, непашанаваньне клясыкі й г.д. Ды той бароніцца-наступае ўпэўнена, бліскуча: «Чаго вы хочаце? Мы перажываем часы, калі ўсё мастацтва стаецца эклектычным. І папрок да мяне можна трактаваць камплімэнтам».

14 чэрвеня 1979.

Празь пяць хвілінаў адыйдзе й гэты дзень. Быў ён харошы, працавіты й людзкі. Давяршыўся сустрэчай з Іванам Антонавічам Брылём. Мудры, ненапышлівы майстар слова, ён і ў размове — сонечны й просты. Закранулася й польскае «мэсіянства», і «ziemic zagarnięte», а найперш яснавокая Беларусь наша, якая, што б там ні было, нямець зусім не зьбіраецца. Калі меркаваць хаця б па Брылёвых кнігах, што чытаюцца сёньня й палякамі, і немцамі, і чэхамі, і баўгарамі... Днём раней на вечарыне ў ДСНК свае ўражаньні ад фэстывалю савецкай песьні (у Зялёнай Гуры) пісьменьнік падагуліў цёплаю сьмяшынкай-іскрынкай: «Песьні — песьнямі, пагода — пагодай, але работа — работай». Вось табе і парада, і засьцярога.

17 чэрвеня 1979.

У лесе Яноўскім, бліжэй да польска-савецкай мяжы, зьбіраюцца вэтэраны-партызаны, сярод іх і некалькі пасівелых дзядзькоў, што ўратаваліся падчас трагічнага прарыву блякаднага ўлетку 1944. На Парытовым пагурку пад мэмарыяльнаю плітой супачывае прах і беларуса Бабіча (можа, з маіх, суседніх ад Машчаліна Лядоў?), абок грузіна Мамерашвілі, сярод Ивановых, Довыденковых...

Да Варшавы з дарогі далёкай, з жытоў наліўных прыдарожных «прыбеглі» чародкай блакітнай валошкі. Сярод іхнае ціхай сінечы тры пушыстыя галоўкі чырвонай канюшыны.

Пра беларуса Галубовіча — аднаго з ацалелых прарыўнікоў — заўтра.

18 чэрвеня 1979.

Гісторыя яшчэ аднаго «маскоўскага беларуса» ў некалькіх словах такая:

— Я ведь тоже белорус. Но пишусь русским. Отец почему-то так записал. Ему, видимо, всё равно было. Да и сам я в деревне своей (на Аршаншчыне) только один раз бывал — в раннем детстве, с отцом. Но вот каждый раз проезжая Московским шоссе защемит почему-то в душе на подъезде к тому указателю. Что-то в этом есть... Вот дочка моя — ничего ведь не знала, а как-то спрашивает: «Папа, а почему ты белорусом не записался?» Я ей говорю: «Вот вырастешь, можешь себя белоруской записать». Знаете, она у меня упрямая — сделает, как задумала.

Вечарам — званок тэлефонны пана прафэсара: «Ну як, ці чытаецца, пане радцо?» Сапраўды, кнігі дорацца, каб чыталі. Тым больш, калі ў гэтым чытаньні тваё суцяшэньне. Як суцяшаўся, мабыць, у свой час Аляксандар Ельскі над старонкамі Міцкевічавай эпапэі паэтычнай: «Чытаючы «Пана Тадэвуша», дарагія беларусы, палюбіце ўсім сэрцам сваю родную, занядбаную, сьвятую беларускую мову, якая спрадвеку ня толькі была вашай у сёлах, але яе ўжывалі самыя даўнейшыя манархі краю й іх вяльможы»...

Цалкам «Недыпляматычныя нататкі» Аляксея Каўкі будуць надрукаваныя ў альманаху «Шуфляда».

* ССОД — «Союз советских обществ дружбы и культурных связей с заграницей». Аўтару давялося працаваць прадстаўніком гэтае арганізацыі і адначасова радцам пасольства СССР у Польшчы ў 1979-1982 г.

Канвэер сьмерці:

Дакумэнты, сьведчаньні, успаміны.

Архіў Найноўшае Гісторыі рыхтуе да друку зборнік унікальных дакумэнтаў, апрацаваных і падрыхтаваных да друку гісторыкам Ігарам Кузьняцовым.

Пра масавыя рэпрэсіі напісана нямала. Асаблівую цікавасьць да гэтых трагічных старонак гісторыі тлумачыцца перш за ўсё імкненьнем выкрыць таталітарызм у мінулым і будучым, не дапусьціць ягонага рэцыдыву.

Дакумэнты, якія прадстаўленыя ў гэтай кнізе, дазваляюць аспрэчыць спрошчаныя на сёньня стэрэатыпы, удакладніць некаторыя ацэнкі, а значыць, больш яскрава ўявіць адзін з самых складаных і трагічных пэрыядаў нашай гісторыі.

Гэтая кніга складзеная з дакумэнтаў, бюракратычных паводле паходжаньня й характару, напісаных канцылярскай мовай. Яны раскрываюць мэханізм рэпрэсіяў і канкрэтныя спосабы іх ажыцьцяўленьня, якія характарызуюць структуру і прынцыпы дзеяньня дзяржаўнай машыны, што ствараласа для арганізацыі катаржнай працы й зьнішчэньня людзей у масавых маштабах.

У кнізе даецца аналіз стварэньня і функцыянаваньня рэпрэсіўнай сыстэмы на тэрыторыі СССР у пэрыяд з 1920 да пачатку 1950-х гадоў.

Сярод дакумэнтаў, што публікуюцца ў гэтай кнізе — дырэктывы, пастановы, загады, дырэктыўныя лісты, дакладныя запіскі і справаздачы ОГПУ—НКВД—МГБ, рашэньні ВКП(б), СНК і УЦВК СССР. У спэцыяльны разьдзел выдзеленыя ўспаміны ўраджэнцаў Беларусі, якія прайшлі празь пекла сталінскіх канцэнтрацыйных лягераў. Большасьць дакумэнтаў друкуецца ўпершыню.

Сачыце за анонсамі!

«Шуфляда»: незалежнае дасьледаваньне

На пачатку 1998 году ў Беларусі зьявіцца новы часопіс. Ён будзе называцца «Шуфляда» й кола яго сталых чытачоў, як ні дзіўна, ужо склалася. Газэта «Наша Ніва» на сваёй паласе «Шуфляда» запачаткавала традыцыю сталага публікаваньня дакумэнтаў і ўспамінаў па гісторыі Беларусі XX ст. Многія гэтыя дакумэнты й асабліва ўспаміны настолькі цікавыя па-асобку, што могуць друкавацца ў газэце без асаблівага камэнтару. А ў сваёй масе, без выключэньняў і цэнзуры яны ствараюць кантэкст XX ст.

Здабываючы й назапашваючы гістарычную інфармацыю супрацоўнікі Архіву Найноўшае Гісторыі імкнуцца пазьбягаць у працы праяваў сваіх палітычных сымпатыяў, а таксама не зважаць на пазыцыю ўладаў. Мы вядзем незалежнае дасьледаваньне. Часам, пераадольваючы эмоцыі й хваляваньні, мы таксама папаўняем тэчкі Сучаснай гісторыі. Гэтыя матэрыялы сыстэматызуюцца, некаторыя зь іх рыхтуюцца да публікацыі.

Дык ці ёсьць сэнс нарошчваць вал інфармацыі, ствараць яшчэ адно выданьне, прыцягваць да яго ўвагу? Ці ёсьць сэнс у нашых высілках?

Супрацоўнікі Архіву й рэдакцыя часопіса сыходзяць з наступных прынцыпаў:

— Беларуская гісторыя ёсьць адной з самых цікавых, непрадказальных і супярэчлівых гісторыяў у Эўропе;

— на Беларусі сканцэнтраваўся фокус Эўрапейскае пэрспэктывы; будучыня Эўропы залежыць ня толькі ад Беларусі, але Беларусь ёсьць індыкатарам Эўрапейскіх працэсаў, Беларускую сытуацыю кшталтуюць ня толькі Беларусы, але й глябальныя сілы;

— Беларускі дакумэнтальны матэрыял — гэта жывы матэрыял, практычна заўжды эксклюзіў.

Таму мы ўсё ж ідзем на новы праект — бо ня хочам быць толькі паддосьледнымі, але дасьледчыкамі. А колькасьць накопленага фактычнага матэрыялу ўжо настолькі крытычная, што асэнсаваньне яе патрабуе спэцыялізаванае прасторы.

У часопісе будуць чыста архіўныя старонкі, будуць праграмныя тэксты. Заплянаваная асобная рубрыка па Сярэдняй Эўропе — з мэтамі кампаратыўнага аналізу. Праблематыка Сярэдняй Эўропы, яшчэ зусім нядаўна ўзьнятая асяродкамі «Эўрафоруму» і «Нашай Нівы», знаходзіць сваё гучаньне для Беларусі й у гістарычных матэрыялах XX ст. Падобна, што «Шуфляда» будзе часопісам супярэчнасьцяў.

Да спатканьня!

Алег Дзярновіч

«Свабода» вяртаецца?

У дні закрыцьця газэты «Свабода» ў Архіве Найноўшай Гісторыі пры фондзе «Наша Ніва» рыхтуецца да друку Каталёг незалежных пэрыядычных выданьняў, якія выходзілі ў Беларусі з пасьляваенных часоў да 1990 году. Спачатку гэтыя выданьні зьбіраліся ў Архіве, потым апісваліся і вось, нарэшце, усё зьведзена ў адну кнігу.

Гартаючы яе, я згадваю, з чаго ў мяне і маіх сяброў пачалося захапленьне незалежнай выдавецкай дзейнасьцю. Гэта быў самы канец васьмідзясятых. Мы задумалі друкаваць падпольную газэту пад назвай «Вястун».

Я тады працаваў у друкарнях «Во славу Родины» і МУС, і па літарцы цягаў адтуль шрыфты. Памятаю, гэта была акадэмічная гарнітура, 10 кегаль. Ігар Гермянчук на Менскім паліграфкамбінаце вырабіў клішэ загалоўка, а Сяржук Сокалаў з дапамогаю швагра ў Наваполацку зрабіў мэталёвы валік з гумоваю абалонкай. Арына Вячорка пашыла фартух наборшчыка з кішэнямі для касаў... Гэтак супольнымі намаганьнямі была фактычна створаная матэрыяльная база падпольнай друкарні. Аднак неўзабаве нас з Гермянчуком загрэблі ў войска. Вінцук Вячорка і Сяргей Запрудзкі, якія вучыліся на філфаку БДУ, адчулі на сабе перасьлед КГБ, пасьля чаго С.Запрудзкі закапаў друкарню ў вёсцы сваіх бацькоў. (Апошнім часам, думаю, кожны з нас усё часьцей згадвае той наш юнацкі НЗ — недатыкальны запас.)

Што нас натхняла? Напэўна, рамантычны прыклад Кастуся Каліноўскага і ягонай «Мужыцкай праўды». (На той час больш чым стогадовая газэта Каліноўскага таксама была схаваная ад шырокага доступу.) Тое самае, што натхняла Янку Філістовіча, які ў 1952 годзе ў лясах пад Маладэчнам выдаў сваю газэту «Жыве Беларусь!» Як бачым, сама гісторыя паваеннага незалежнага друку пачынаецца зь лясной друкарні...

Калі ж разглядаць газэту Філістовіча як легенду, то пачынаць трэба з «Падсьнежніка», які гісторык Мікола Ермаловіч пачаў выдаваць ў 1963-м. Друкаваў на машынцы і раздаваў блізкім знаёмым.

Гэта значыць, пачатак друку быў наўпрост зьвязаны з хрушчоўскай адлігай.

Ад «Жыве Беларусь!» да «Падсьнежніка» — 11 гадоў. Напэўна, увесь наступны друк (да другой паловы 80-х) па сутнасьці сваёй істотна не адрозьніваўся ад «Падсьнежніка». Новыя павевы залежалі хіба што ад зьмены пакаленьняў выдаўцоў.

На мяжы 70-80-х мы распачыналі выданьне часопіса «Люстра Дзён». Усяго выйшла чатыры нумары. Агульны наклад сягаў за сто асобнікаў. Адзін з нумароў быў прысьвечаны 1000-годзьдзю Беларусі і адкрываўся вершам Казімера Ўсюдыгнанага:

Мая. Не мая? Мая!
Вам спрэчкай мяне ня здолець,
Бо праўды ад маскальля
Ня мушу пачуць ніколі.
Гісторыю нашу ўшчэнт
Разьнесьлі. У сілы права.
І нейкі сьляпы дацэнт
Закрэсьліў маю дзяржаву...

Казімер Усюдыгнаны — гэта псэўдонім Сяржука Сокалава. Памятаю, адзін з матэрыялаў Вінцука Вячоркі быў прысьвечаны югаслаўскаму (на той час прагрэсіўнаму) сацыялізму. Таксама друкаваўся ліст літоўскай дзяўчыны, якая распавядала пра абставіны самаспаленьня ў Коўне ў пачатку 70-х Ромаса Каланты. Гэты ліст фактычна быў замоваю рэдакцыі, а перакладаў яго зь літоўскай Антанас Глейзьніс, вайсковы фатограф.

Друкаваўся часопіс на машынцы ў рэдакцыі дывізійнай газэты «Боевой призыв», што мясьцілася ў Менскім апэратыўным палку (або Белпалку) на вул. Грушаўскай, дзе служылі Глейзьніс і я. Амаль усе тэксты рыхтаваліся Вячоркам і перадаваліся з вуліцы праз краты рэдакцыі. Гэтаксама праз краты мы па некалькі гадзінаў абмяркоўвалі чарговы нумар. Згадваю ўсё гэта, чытаючы артыкул пра «Люстра Дзён» у новым Каталёгу незалежнага друку. Артыкул сканчаецца словамі: у фондах Архіву адсутнічае...

Усяго ў Каталёгу больш за сто назваў, некалькі соцень нумароў. Я знаходжу там наступнае наша прадпрыемства: 1986-ы, часопіс «Бурачок».

У 70-я гады яшчэ не было і не магло быць рэалістычнай размовы пра незалежнасьць Беларусі, антыкамунізм, правы чалавека і г.д., што стала магчымым у другой палове 80-х. Без нацяжкі першы пэрыяд можна назваць рамантычным, а другі — рэалістычным. «Бурачок» стаўся якраз зьвязкай, пераходам ад дысыдэнцтва да таго шумлівага маладзёвага руху, які ахрысьцілі нефармальным.

Тады, у канцы 80-х незалежны друк стаў індустрыяй. Газэты рабіліся на машынцы ці кампутары. Макеты завозіліся ў Вільню, найчасьцей у Інстытут фізыкі АН Літвы, дзе нехта спадар Вайтэкунас кіраваў ксэракапіяваньнем такіх газэт ледзьве не з усяго былога СССР. У чарзе на друк разам з намі стаялі азэрбайджанцы, татары, украінцы. У Літве ўлады на такое ўжо закрывалі вочы. Затым тыражы прывозіліся ў Дом літаратара ў Менску, у кабінэт А.Емяльянава і М.Міхноўскага, дзе заўсёды тоўпілася шмат людзей з усіх рэгіёнаў Беларусі. Адсюль прэса развозілася па краіне...

Істотны эпізод — грошы. Калі ў першым пэрыядзе адзіночкі друкавалі толькі за свае асабістыя, то ў канцы 80-х, з прыходам вялікіх накладаў (10-50 тысяч) і продажам выданьняў (чаго не было ў першы пэрыяд), стварэньнем рэдакцыяў і найманьнем людзей, пачалі абяртацца такія сумы грошай, якія былі недаступныя для інсьпіратара-адзіночкі. Гэта ўжо не маглі быць асабістыя сродкі. Масавы гандаль пачаўся на пляцах, вакзалах, у электрычках... Які-кольвек камунізм быў начыста выцесьнены з дачыненьняў у альтэрнатыўнай прэсе. Можна дапусьціць, што ў канцы 80-х менавіта альтэрнатыўны друк стаў першай сфэрай, у якой грамадзтва сутыкнулася з капіталізацыяй, з рынкам.

У Каталёгу незалежнага друку называюцца ўсе, хто рабіў выданьні і хто ў іх публікаваўся. Гэтыя людзі «сьвяціліся» першымі, гэта быў іхны грамадзянскі чын, яны давалі прыклад іншым.

Так выйшла, што з выданьнем гэтага Каталёгу зьвязана шмат парадоксаў. Па-першае, ужо сёньня ён сам можа стаць нелегальным. Па-другое, задуманы без працягу, ён выдаецца з думкай пра наступны, другі том. Некалькі гадоў таму нам і ў галаву не прыходзіла, што давядзецца стаць сьведкамі адраджэньня падпольнага друку. Але сёньня архіўныя калекцыі так імкліва папаўняюцца новымі незалежнымі выданьнямі, а закрыцё легальных газэтаў такое брутальнае і адназначнае, што зьбіральніцкую працу давялося арыентаваць і на сёньняшні дзень. Магчыма, у нашых калекцыях неўзабаве зьявіцца і новая — нелегальная — «Свабода»? Як ні дзіўна, а такое прадчуваньне мяне не засмучае. Бо галоўнае ў ім слова — зьявіцца. Не прападзе.

Сяргей Дубавец

Вострая Брама

беларускі культурны кантэкст XX ст.

Новы супольны праект «Нашай Нівы» і беларускай рэдакцыі Радыё Свабода: рэпартажы, рэфлексіі, гутаркі — кожную нядзелю на зьмененых хвалях Свабоды. Кожную сераду — паўтор перадачы.

Адсутнасьць кантэксту культуры — гэта адсутнасьць глябальных арыенціраў нацыі. Яна нявечыць нашае жыцьцё і на вялікім і на малым узроўні. Беларусь нібыта сьцьвярджае сябе як незалежная дзяржава, але дзеля чаго гэта робіцца, дзеля чаго тая незалежнасьць — разумее ня кожны. Людзі не задумваюцца над тым, што сувэрэнітэт патрэбны для самабытнага існаваньня нацыі, бо менавіта ў самабытным існаваньні нацыя найлепшым чынам рэалізуе свой патэнцыял, уладкоўвае жыцьцё ў адпаведнасьці са сваімі прыроднымі рысамі характару. Калі народ існуе ў культурным кантэксьце, яму не прыходзяць у галаву розныя самаедзкія, дзікунскія ідэі, ён не азлоблены, а прагны да творчасьці і працы.

Кожную нядзелю на хвалях Радыё Свабода паводле абноўленага раскладу:

RADIO FREE EUROPE
RADIO LIBERTY

БЕЛАРУСКАЯ СЛУЖБА РАДЫЁ СВАБОДА

Новыя Хвалі, Пастаянны Час,
Нязьменная Свабода
(ад 26 кастрычніка 1997)

Час	К/Hz	Хвалі
18.00 - 19.30	6170	49
	7155	41
	7295	41
22.00 - 23.30	6095	49
	6170	49
	7155	41
	9750	31
06.00 - 07.00	5995	49
	7295	41
	9750	31

Паштовы адрас: 220005, Менск-5, п/с 111 У 22.00 беларускую праграму можна слухаць у Інтэрнэце: http://www.rferl.org/bd/be/index.html

Заставайцеся са Свабодай!

Помнік К.Т.

Калі ў 70-я гады нас, школьнікаў, вадзілі ў Купалаўскі парк, то перад славутым фантанам «Купалінкі» нашыя настаўніцы сарамліва хіхікалі. Дзяцей, вядома, вабілі пырскі вады, а ня бронзавыя выявы аголеных дзяўчат. А настаўніцы, можа, першы раз у жыцьці, атрымлівалі ўрок чыстае эстэтыкі. Таму й хіхікалі зь незвычайнага для савецкага мастацтва сюжэту. Помнік самому Купалу, створаны ў 1974 годзе скульптарам Анікейчыкам у суаўтарстве з Гумілеўскім і Засьпіцкім, на той час мала запомніўся. Ды і тагачасная крытыка млява адрэагавала на ягонае зьяўленьне. У той час менавіта «Купалінкі» — першае савецкае манумэнтальнае «ню» — сталі візытоўкаю беларускае пластыкі 70-х гадоў...

Вобраз самога Купалы выйшаў няўцямным. Адкуль відаць, што гэта паэт? З расхінутага крысься шынялю? Ці з кія ў руцэ? Брутальнасьць стылістыкі пазбаўляе вобраз нават намёку на рамантыку. Гэта мог быць помнік і старшыні калгасу, які ўзіраецца ў свае палеткі...

Не паддаюцца беларускім скульптарам вобразы дзеячоў нацыянальнае культуры. Падобную да Анікейчыкавай кампазыцыю абраў скульптар Голубеў, робячы помнік Язэпу Драздовічу. Шырокая хада, кій у руцэ... Добра што яшчэ помнік падпісалі: «Язэп Драздовіч. Беларускі мастак», а то ніхто б не зразумеў, навошта яго, маленькага, паставілі перад дзьвярыма парцалянавае крамы. Дзеля рэклямы хіба што?..

Помнік Максіму Багдановічу скульптар Вакар спачатку не падпісаў. І праз гэта часта здараліся непаразуменьні. Чаму ён стаіць перад Опэрай? Сьпявак? Кампазытар? З дыялёгу у аўтобусе: — Каму гэта помнік? — Ня ведаю, можа, Высоцкаму? — Не, Высоцкаму рана... Нехта знайшоўся: Багдановічу!.. — А хто гэта? — Партызан нейкі...

Памятаю, як адбываліся абмеркаваньні праекту аднаўленьня Верхняга гораду. Тады ўвагу гледачоў і апанэнтаў прыцягнуў квадрацік з подпісам «Помнік К.Т.» На запытаньне архітэктары адказалі, што тут плянуецца помнік Сьвятому Кірылу Тураўскаму. Маўляў, ён дзяяч старажытнай культуры, а помнік будзе ў старым горадзе і гэтак далей... Чаму не Э.П. (Эўфрасіньні Полацкай), альбо Ф.С. (Францішку Скарыну)? Адказу не было...

Фармалізм вынікае зь незасвоенасьці вобразаў культурных герояў у нацыянальнай сьведамасьці. На гэтым штучным фармальным патасе была пабудаваная ўся сыстэма адукацыі, культуры, і як вынік — няпэўных мастацкіх вобразаў. Можа, прычына ў савецкім урбаністычным асяродзьдзі, у савецкай самацэнзуры, дзе няма месца прасьветленай старасьвеччыне, нацыянальным героям? Але ж і ў Празе беларусы паставілі Скарыну, які ўсім духам сваім просіцца на плошчу якога-небудзь з нашых безаблічных райцэнтраў! А ў Менску Скарыну гэтак і не паставілі. Ня здолелі стварыць вобраз. Нават такі, які скульптар Глебаў зрабіў для Полацку. Там гэта работнік у сярмязе з закатанымі рукавамі. Гэткі задуменны сьлесар у барэце: «Георгий Скорина». Калі сам скульптар недасьведчаны, альбо няшчыры, рэакцыя гледачоў зазвычай непасрэдная. Можна скласьці цэлую нізку показак і кпінаў, якімі дасьціпнікі ўзнагародзілі «Коласа на кучы», «самую вялікую настольную статуэтку» — помнік песьняра на аднайменнай плошчы ў Менску.

Мае рацыю Адам Глёбус у сваёй кнізе «Сьмерць-мужчына», калі кажа, што ў беларусаў няма сваіх могілак. Помнікі на могілках падпісаныя ў нас па-польску, па-расейску, па-жыдоўску... а па-беларуску няма. Значыць, манумэнты дзеячам Беларушчыны зьявяцца не раней, чым зьявяцца Беларускія магілы? Але ж надмагільлі нашых паэтаў — беларускія. Ці ў беларусаў паміраюць толькі паэты? Ці толькі паэты — беларусы?..

Рана ці позна мы знойдзем адказы на гэтыя пытаньні. Пакуль жа мы ходзім да тых нацыянальных помнікаў, якія такіх пытаньняў не нараджаюць. Напрыклад, да фантану ў Купалаўскім парку. Перад «Купалінкамі» ўжо ніхто не хіхікае. Значыць, нешта зьмяняецца, цячэ разам са сьвіслацкімі водамі. А яшчэ мы ходзім да драўлянага крыжа ў Курапатах, які людзі самі прынесьлі на руках і самі паставілі. Гэты крыж не выклікае пытаньняў: навошта ён тут? Нават у тых, хто яго некалькі разоў ламаў... Гэта ўжо НАШ крыж.

Сяргей Харэўскі

Францыя зачытваецца «Чорнай кнігай камунізму»

Чорная кніга камунізму. Злачынствы, тэрор, рэпрэсіі. Стэфан Куртуа, Нікаля Вэрт, Жан-Луі Панэ, Анджэй Пашкоўскі, Карэл Бартошак, Жан-Луі Марголін. — Парыж: Робэр Ляфонт, 1997.

Гістарычны том таўшчынёй у 846 старонак — плён трохгадовай працы групы дасьледчыкаў — узначальвае ў Францыі сьпіс бэстсэлераў немастацкай літаратуры. Выхад кнігі быў прымеркаваны да 80-х угодкаў бальшавіцкага пераварота ў Расеі; за першыя два тыдні было прададзена больш за 50 тысяч асобнікаў. Для практыкі заходняга кнігагандлю гэта фантастыка.

«Мінімальная ацэнка, якая патрабуе далейшага ўдакладненьня» — так у прадмове прадстаўлены папярэдні сьпіс непасрэдных ахвяраў камунізму: СССР — 20 мільёнаў, Кітай — 60 млн., Паўночная Карэя — 2 млн., Камбоджа — 2 млн., Аўганістан — 1,7 млн., Афрыка — 1,7 млн., Усходняя Эўропа — 1 млн., Віетнам — 1 млн., Лацінская Амэрыка — 150 тысячаў. Існуюць розныя мэтодыкі падліку, і самі аўтары дапускаюць, што агульная колькасьць ахвяраў вымяраецца сотнямі мільёнаў. Імя Сталіна можна сустрэць на 155 старонках, Ленін і Мао згадваюцца больш за 80 разоў, Кастра і Берыя — па 34 разы, Гітлер і Гамулка — па 10.

Хоць у кнізе скарыстаныя дакумэнты, якія былі рассакрэчаныя толькі апошнім часам, усё ж сэнсацыйнай тэму не назавеш. Мёртвыя ня надта цікавяць жывых.

Папулярнасьць кнігі ў Францыі, якая ніколі не была пад уладай камунізму, і дзе камуністы нават уваходзілі ў склад урадаў, сьведчыць пра тое, што мінулае яшчэ перасьледуе французскае грамадзтва, што марксісцкі дыскурс і тут паўплываў на інтэлектуальнае жыцьцё, што і сёньня на новай глебе працягваюцца старыя бітвы.

Члены сёньняшніх кампартыяў, ад Парыжу да Менску і Пэкіну звычайна заяўляюць: мы самі нікога не забілі, лепшыя з нас сталіся ахвярамі — якія могуць быць прэтэнзіі. «Чорная кніга камунізму» даводзіць: у канцы 20-га стагодзьдзя называць сябе камуністам злачынна.

Пасьля выхаду кнігі апазыцыя ў французскім парлямэнце запытала: як прэм'ер-міністар Жаспэн можа быць у кааліцыі з кампартыяй — саюзьніцай сьмертаносных рэжымаў. Гучалі апраўданьні і абвінавачаньні, прайшлі акцыі пратэсту. Прэм'ер-міністар, у сваю чаргу, абрынуўся на не такі ўжо й новы тэзыс пра падобнасьць нацызму і камунізму. Куртуа тлумачыць балючую рэакцыю левага істэблішмэнту тым, што злачынствы нацысцкай Нямеччыны вельмі добра вывучаныя, а ўсеабдымнага акадэмічнага дасьледаваньня практыкі камунізму дагэтуль няма. Прычыны: па-першае, Савецкі Саюз быў саюзьнікам у другой сусьветнай вайне; па-другое, злачынствы трымаліся ў тайне, бо ідэя рэвалюцыі была ўлюбёнай у колах французскіх інтэлектуалаў.

Цікавасьць публікі падагрэла й спрэчка паміж укладальнікам і двума аўтарамі. Стэфан Куртуа ў прадмове і пасьляслоўі даводзіць, што тэрор — гэта ўнутраная характарыстыка камунізму, а ня проста інструмэнт дзеля дасягненьня ягоных мэтаў; два аўтары з гэтым рэзка не пагаджаюцца. Яны дамагліся зьмены назвы выданьня. Першапачатковы варыянт — «Кніга злачынстваў камунізму»; тады Куртуа, сам мааіст у маладосьці, назваў так свой уступ.

У Беларусі ў друку ідуць падобныя ідэалягічныя спрэчкі, а вось такая шырокая чытацкая рэакцыя, як у Францыі, малаверагодная — у нас мінулае яшчэ не мінула.

На жаль, у выданьні адсутнічаюць прадметны і геаграфічны паказальнікі. Глыбіня асьвятленьня той ці іншай праблемы і краіны залежала, не ў апошнюю чаргу, ад моваў, якімі валодалі аўтары. Ніхто зь іх, да прыкладу, не карыстаўся ўласна беларускімі ці ўкраінскімі, кітайскімі ці літоўскімі крыніцамі.

Камунізм у сьвеце канае — аднак калі працягласьць агоніі сувымяральная з працягласьцю жыцьця, гэта суцяшае не канечне. Поўную кнігу злачынстваў складуць самі народы, якія сталіся ахвярамі д'яблавай спакусы. Калі падсумаваньне — гэта справа будучыні, то трэба шукаць у мінулым. У пасьляслоўі, якое называецца «Чаму?», у якасьці адказу прыводзіцца гегелеўская формула: усё нечалавечае — бессэнсоўнае і бескарыснае. Слушна. І аплочана яно па самым высокім рахунку.

Аляксандар Лукашук

Ня ўсім дадзена

Пісьменнік і кінадраматург Георгі Марчук год таму ўзначаліў выдавецтва «Мастацкая літаратура». Ці зьмянілася што-небудзь у жыцьці выдавецтва за мінулы год. Напрыклад, цікавасьць чытачоў да беларускае літаратуры? Пра гэта карэспандэнт «НН» спыталася ў спадара Марчука.

Г.М.: Цікавасьць да беларускіх кніг, я лічу, трохі зьнізілася. Можа, у свой час іх было выдадзена, як кажуць, зашмат. Ды й не заўсёды пісьменьнікі змагаліся за якасьць літаратуры. Ужо й абмежаваньні ідэалягічныя зьніклі: толькі пішыце! Пішыце сьмела, цікава, філязафічна... Пішыце ды прыносьце. Думаеце, за гэты год і чатыры месяцы, што я тут працую, прынесьлі шмат **новых рукапісаў?** Не, памыляецеся. Калі паэты яшчэ, так бы мовіць, змагаюцца за духоўнасьць, дык празаікі адмоўчваюцца, яны, галоўным чынам, просяць перавыдаць тое, што ўжо было выдадзенае. Вось перад вамі другі том Сіпакова, зь цяжкасьцю выдалі. Другі том Навуменкі, які таксама чакаў тры гады. І зараз, у плянах на 1998 год, як бачыце, стаяць зборы Крапівы, Купалы, Барадуліна, Гілевіча. Мы адначасова працуем над двухтомнікам Міцкевіча ды над аднатомнікам Пушкіна — да іхных юбілеяў. Як толькі да нас у выдавецтва паступіць рукапіс ксяндза Чарняўскага, выдадзім ягоны «Мудраслоў», перакладзены на беларускую мову зь Біблії (а ён змагаецца за гэтае выданьне ўжо 25 гадоў). Мы падрыхтавалі цудоўную сэрыю «Паэзія XX стагодзьдзя», гонар адкрыцьця якой належыць Еўдакіі Лось. У гэтай сэрыі выйдуць кнігі Раісы Баравіковай, Алеся Разанава. У празаічнай сэрыі будуць надрукаваныя аповесьць Уладзімера Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім», творы Віктара Казько й Анатоля Кудраўца. Зьбіраемся выдаць усё, што складае гонар беларускага пісьменства. Напрыканцы наступнага году, спадзяюся, у гэтай сэрыі выдадзім зборнікі Янкі Брыля й Васіля Быкава. Ёсьць у нашых плянах імёны пісьменьнікаў, якія працуюць на расейскай мове. Дэбютуе Цмых зь Пінску, гатовая да выданьня кніга Сульянава, які чакае ўжо чатыры гады.

«НН»: Чаму ўсё ж здарылася гэтак, што зборнік Васіля Быкава «Сьцяна» ў апошні момант выпаў з плянаў выдавецтва?

Г.М.: Упершыню я пачуў пытаньне наконт «Сьцяны» Быкава на зьездзе беларусаў сьвету, калі распавядаў пра цяперашні стан «Мастацкай літаратуры». Я прыйшоў у выдавецтва пасьля таго, як Васіль Быкаў ужо забраў свой рукапіс. На той момант, сапраўды, гады з два ці з год ён чакаў выхаду ў сьвет. І ня толькі тая ягоная кніжка. Зараз мы перажываем пераходны пэрыяд: пачынаючы з 1994 году і па сёньняшні дзень, мы ўсе яшчэ знаходзімся ў нэрвовым стане. Таму што, ня маючы замоваў на беларускую літаратуру, мы ня можам нішчыць выдавецтва ды лезьці ў пазыку. Акрамя твораў Быкава, мы не змаглі выдаць творы Ўладзімера Арлова, вэтэрана журналістыкі Сьвірыдава, паэтаў Спрынчана, Зуёнка, а таксама чарговыя тамы Адамчыка і Гілевіча. Прытарможаныя былі, калі можна так сказаць, 18 кніг. Іх ніхто не выкрэсьліваў з плянаў — проста ікнае выданьне часова адклалі. Зараз мы ўзмацнілі службу маркетынгу, выйшлі на абласныя бібліятэкі. Спадзяемся, што нас уратуюць бібліятэчныя замовы. Я гатовы пагадзіцца нават з Васілём Уладзіміравічам, які сказаў у адным з інтэрвію, што некаторыя рэчы паздымаў і адшліфаваў час, і яны страцілі сваю злабадзённасьць. А «ЛіМ» раптам заяўляе — нібыта, рэжым забараняе выданьні. Я не люблю гэтага слова, таму што слова «рэжым» звычайна ўжываецца адносна турмы альбо да псыхічна хворых у шпіталі. Сёньня мы ня можам дазволіць, як у часы сацыялізму, выдаваць кнігі, што па чатыры гады ляжалі на складзе. Бо выдавецтва толькі ледзь-ледзь выкараскалася з даўгоў, якія складалі 1,5 млрд. рублёў. І мы, дзякуючы падтрымцы дзяржкамдруку, які ў той час узначальваў Замяталін, дзякуючы ягоным намесьнікам, Нічыпаровічу й Прыгодзічу, якія любяць яшчэ беларускую кнігу, выпаўзьлі з гэтых даўгоў. Зараз кніжка набывае асаблівую якасьць. Можа, некаторыя творы даставаць выдаць і ў часопісе.

«НН»: Літаратурныя часопісы «Нёман» і «Полымя» імкнуцца публікаваць арыгінальныя творы, другасныя ўзоры іх не цікавяць. Гэта агульнае правіла. Наколькі я ведаю, яго трымаецца і часопіс, «хросным бацькам» якога Вы зьяўляецеся. Я маю на ўвазе часопіс «Всемирная литература». Але беларускія аўтары друкуюцца тут эпізадычна. На першы нумар 98-га году не заплянаваны ніводзін беларускі твор...

Г.М.: Так, гэты часопіс — наш боль. Але каб індывідуальна замовіць пераклад, патрэбны час, якога ў нас спачатку не было. Што тычыцца беларускай літаратуры, то яна цяпер знаходзіцца ў страшэннай ізаляцыі. Мы нават нікога ня можам сёньня прадставіць да Нобэлеўскай прэміі, таму што ў сьвеце ня ведаюць беларускіх пісьменьнікаў. Але ж у часопісе месца не хапае...

«НН»: Тым ня менш, у некалькіх нумарах запар знайшлося месца для публікацыі эзатэрычных твораў, якія ані ў мастацкім, ані ў якім іншым сэнсе нельга аднесьці да літаратуры сусьветнага ўзроўню. І гэта зьдзіўляе пісьменьнікаў і перакладчыкаў, зь якімі я размаўляла. Яны адмаўляюцца друкавацца побач з творамі такога гатунку. Таксама ў іх выклікае пытаньне пэрсанальны склад рэдкалегіі, ад якое залежыць твар часопіса.

Г.М.: Я не разумею, што Вы маеце на ўвазе?

«НН»: Тое, што ў рэдсавет уваходзяць пісьменьнікі, палітычны імідж якіх прымушае Быкава альбо Сёмуху пазьбягаць супрацоўніцтва з часопісам...

Г.М.: Скажыце, калі ласка, у які час працавалі Быкаў, Барадулін, Жук? Ці ўзьдзейнічалі палітычны лад ці структура ўлады на мастацкасьць «Ніжніх Байдуноў» альбо «Халоднай птушкі»? Палітыка палітыкай, але мастак — ён як бы над палітыкай, ён толькі каля Бога. Я ня ведаю, ці народзяцца пры, як зараз кажуць, татальнай свабодзе й пераходзе да капіталізму творы, якія нараджаліся ў «ціхай затоцы» сацыялістычнага разьмеркаваньня сродкаў. Нехта напіша пра ўсё гэта з надрывам ці зь мінорам. А нехта і наадварот: пачакае, а пазьней асэнсуе наш час. Але пакуль што няма твораў, роўных тым, што былі зробленыя, пачынаючы з пасьляваеннага часу да дзевяностых гадоў.

Зараз пачынаецца штучны падзел у грамадзтве. У нас няма звычаю дараваць адно аднаму — і з таго боку і з другога. Усё дзеліцца на «чырвоных» і «белых». Калі нехта робіць нейкія палітычныя заклікі да нечага, тады ты можаш яму рукі не падаць. Але ж ёсьць факты. Я ж ніколі ня згадваю пра тое, што Быкаў некалі падпісаўся за выгнаньне Салжаніцына з Савецкага Саюзу. (Больш за дваццаць гадоў таму Васілю Быкаву патэлефанавалі дахаты й папярэдзілі, што ў ранішнім нумары «Правды» пад лістом супраць Салжаніцына стаіць і ягоны подпіс. Патрабаваньне пісьменьніка спыніць нумар і зьняць ягоны подпіс былі цынічна праігнараваныя. Да сёньня пісьменьнік ня ведае, хто праявіў ініцыятыву, жадаючы «дагадзіць» яму. — **А.Л.**) Калі б я помніў гэта ўвесь час, я такама гаварыў бы: а што Быкаў, ён таксама кан'юнктуршчык, ён з падвойным дном. Адмаўляйся ад таго часу, ад Ленінскай прэміі, каб ня быць «чырвоным». Падтрымаў некалькі разоў Шамякін прэзыдэнта Беларусі, і яму кажуць, што ён ужо «ня зь імі». А хто такія «яны», куды ідуць? Але ж я люблю ўсіх. Для мяне галоўнае — беларускі пісьменьнік, які жыве на маёй зямлі, цягнецца да дабра й справядлівасьці. Пісьменьнік — не вар'ят, які будзе заклікаць да забойства ці сеяць варожасьць. А калі такое здараецца, дык на ўзроўні памфлету, калі нехта выступае па тэлебачаньні, дзе можна дапусьціць нейкія кпіны. Але татальнага зьдзеку над сутнасьцю беларускага народа я ні ў кога ня бачыў. А калі нехта марыць пра мінулае, ну, дык ня ўсім дадзена адчуць час.

Гутарыла Алена Лукашэвіч

Адам Глёбус

Мая Вільня

Успамін

Ня пішуцца вершы пра Вільню...

Бог зь імі, з рытмамі. Буду занатоўваць успаміны. Іх шмат. Яны блытаюцца, плывуць, як аблокі над касьцельнымі вежамі, над царкоўнымі званіцамі й купаламі сынагогаў.

Вось я хлопчык, сыходжу зь цягніка і іду ў аўтобус. Нас прывезьлі на экскурсію на гару Гедыміна. Дзюбаносы экскурсавод, ці лепей, гід у барэтцы расказвае пра вялікі літоўскі народ, пра Міцкевіча і Каліноўскага — знакамітых літоўцаў. А я, сьміклясьнік, вазьмі й скажы, што Каліноўскі — беларус. «Так, так, — пагадзіўся даўганосы. — Але ён змагаўся за незалежнасьць літоўскага народу й быў павешаны расейцамі тут — каля вежы Гедыміна».

Сапраўды, выглядала пераканаўча... Вільнюс, Гядымінас, Калінаўскас, тут, у нас, Літва.

Экскурсія скончылася. Вольны час. Гуляю па Вільні адзін. Халадэча. Хочацца ў прыбіральню. Нарэшце знаходжу нейкую шпакоўню. Яна занятая. Чакаю. Пераступаю з нагі на нагу. Выходзіць маладзіца ў халаце, размаляваным у ружовыя агуркі. І як ёй не халодна ў халаце і хатніх пантофлях? Яна сьмяецца. Рот поўняць сталёвыя зубы. Бліскавічная ўсьмешка. Яна пасьміхаецца зь мяне. Дастае з кішэні ключ і зачыняе прыбіральню. Мне ажно перахацелася. «Трэба хадзіць у сваю прыбіральню!» Першыя літоўцы, якіх я помню: дзюбаносы і жалезназубая — непрыемныя людзі, але яны не віленчукі. Яны чужыя, а Вільня мая, бо я закаханы ў яе зь першага погляду, ці яшчэ раней, вядома, раней...

Ня пішуцца, ня строяцца вершы пра Вільню...

Мой бацька, Чэсь, праглынуў жалезную бляшачку ад гадзіньніка. Яна захрасла ў горле. Ні наваградзкія, ні гарадзенскія дактары не змаглі тую цацку дастаць. Дзед Валодзя павёз малога Чэсіка ў Вільню, дзе лекары выцягнулі жалязяку моцным магнітам. Так вось польская Вільня ўратавала майго будучага бацьку. З гэтага апавяданьня пра цудадзейных эскулапаў і пачынаецца мая любоў да нашай Вільні.

І дагэтуль бацька захаваў у душы ўдзячнасьць да ўсяго віленскага, польскага і літоўскага. Ён пісаў пра тое ў сваіх раманах пра чужую Бацькаўшчыну. А літоўцы й палякі перакладалі бацькавы творы на свае мовы. Што казаць, было прыемна зайсьці ў віленскую кнігарню набыць бацькаў раман па-літоўску й прывезьці ў сям'ю такі незвычайны падарунак. Чамусьці бацька вельмі ганарыўся літоўскімі перакладамі. Маленькая нацыя, а знаходзіць сілы на перакладаньне ўсяго ўсялякага і нават нашага, беларускага. Калі мяне пачалі перакладаць літоўцы, ні той радасьці, ні той удзячнасьці я не адчуваў. Пэўна, з-за таго, што, у адрозьненьне ад бацькі, нарадзіўся ня ў Польшчы, на крэсах усходніх, а ў СССР. А таму хацелася заваяваць прасторы расейскамоўнай імпэрыі і англамоўны сьвет. Вільня ўспрымалася як беларуская правінцыя, як старажытная сталіца, як неперапісаная гісторыя. А таму я езьдзіў на выходныя дні ў нашу Вільню, каб намаляваць балёнікам на мурах чырвоных анёлаў з трубамі й напісаць: наша Вільня, тут жыве Беларусь... Балтыйскія дажджы даўно змылі тыя надпісы, літоўскія маляры зафарбавалі тое, што не змаглі змыць дажджы. Засталіся ўспаміны й рэальнасьць.

Ня пішуцца вершы пра Вільню...

Зрэшты, яны ніколі не пісаліся, нават калі зьбіраўся перабірацца ў каханы горад. Спробы пераезду было дзьве.

Першая зьвязаная з каханьнем. На вясельлі ў сяброўкі Ларысы пазнаёміўся я з Іраю, статнай і ў той жа час вытанчанай дзяўчынаю зь Вільні, што прыехала ў Менск вучыцца на архітэктара. Мы пачалі сустракацца, цалавацца, кахацца, але нейкі рок увесь час замінаў нам. Ці то яна, гатуючы мне гарбату, выпадкова хапалася за аголены дрот, а я ледзь пасьпяваў вырваць штэпсэль з разэткі. Ці ў лесе пад час мілаваньняў на нас накідваўся вар'ят, зь якім даводзілася разьбірацца. І які пасьля гэтага настрой? Толькі мы ўсё адно імкнуліся адно да аднаго. Будавалі пляны. Як паедзем у Вільню, дзе Іра будзе архітэктарам, а я пачну рабіць вітражы. Я быў захоплены літоўскімі вітражамі і літоўскім жывапісам 60-х: Джаўкштасам, Шважасам, Савіцкасам... Іра не падзяляла мае захапленьні, літоўцаў лічыла за мужыкаватых правінцыялаў, якім недаступныя тонкія матэрыі. Яна пагаджалася вярнуцца ў Вільню выключна дзеля мяне. Іра пазнаёміла мяне са сваёй маці і малодшай сястрою, але не пазнаёміла з бацькам. Чаму? Так і засталося таямніцаю. Як ня ведаю і дагэтуль, чаму Іра, вярнуўшыся ў Вільню, перарэзала сабе вены на руках.

Яна паклікала мяне. Я прыехаў. Яе маці з раніцы напаіла мяне каньяком. Я праспаў цэлы дзень. А ўвечары Іра правяла мяне на цягнік. Яе тонкія запясьці былі акуратна перабінтаваныя. На пэроне Іра папрасіла, каб я болей не прыяжджаў да яе. Яна сказала, што пазнаёмілася з выдатным хлопцам. Што ў іх усё будзе выдатна. Мне нічога не заставалася, як толькі пацалаваць яе на разьвітаньне. Я вярнуўся ў Менск сканчаць свой мастацкі інстытут. А Іра сапраўды выйшла замуж, пераехала зь Вільні ў Клайпеду, а потым некуды далей, такі ўжо лёс у расейскіх жанчынаў.

Ня пішуцца песьні пра Вільню.

Другі раз зьяжджаць у Вільню я сабраўся разам зь беларускімі нацыяналістамі, якіх так не любіла мая Іра. Яна вучыла эспэранта, а ўсё беларуска-літоўскае было для яе чужынаю. А мне — не. Я прачытаў Авіжуса, Бубніса, Ланскаўскаса. Пазнаёміўся з Чупонісам і Джаўкштасам. Пачаў пісаць у кожны нумар адроджанай беларускай газэты «Наша Ніва» і намерыўся перабрацца разам з жонкаю й дзецьмі ў Вільню. Пляны былі велізарныя й імпэту хапала. Трэба было адчыніць беларускія садкі, школы, катэдру ва ўнівэрсытэце, перадачу на тэлевізіі... Зь Беларусі ў Вільню паплыла чарговая хваля нацыяналістаў... Я хадзіў па рэклямных агенцтвах і даваў абвесткі, што згодны абмяняць менскую кватэру на віленскае жытло. Літва абвясьціла самастойнасьць, і ўвесь расейскі вайскова-прамысловы комплекс пачаў выпаўзаць зь яе. Зь людзьмі, што прапаноўвалі свае віленскія кватэры, не хацелася мець справы. Яны скардзіліся на лёс, на літоўцаў, на габрэяў і адгаворвалі мяне перабірацца ў Вільню, дзе ня сёньня дык заўтра літоўскія фашыстоўцы выражуць усіх іншародцаў. Рабілася гідка. Час ляцеў, законы мяняліся, і я не пасьпеў пераехаць у кватэру падпалкоўніка, на Антокаль. Літоўцы зачынілі мяжу. Зьезьдзіць у Вільню стала цяжэй, чым у Варшаву ці Прагу.

Ня пішуцца вершы зусім.

Толькі ідэі перабрацца ў Вільню я не пакінуў. Як і калі? Ня ведаю. Як габрэй ня ведае, калі апынецца ў Ерусаліме, так беларус ня ведае, калі будзе ў Вільні. Надыдзе час, і будзе ў Вільні. Ёсьць час маляваць Вільню, а ёсьць час пісаць вершы пра Вільню. Ёсьць час зьбірацца ў Вільню, а ёсьць час ехаць у Вільню. Калі так, будзе час застацца ў Вільні назаўсёды. Такі час быў у ліцьвінаў, такі час мелі палякі і расейцы, такі час цяпер у літоўцаў, і такі час чакае беларусаў.

Напішуцца вершы пра Вільню.

Элізабэт Бадэнтэр

Што такое

З кнігі «XY. Пра мужчынскую сутнасьць».

***Элізабэт Бадэнтэр** — тонкі спэцыяліст у мужчынах. Тэму, якую ўзьнімае яна, ужо даўно аплакалі шматлікія літаратары: Сол Бэлоў у сваіх навэлах, Паскаль Брукнэр у «Дзёгцевым месяцы», Чарльз Букоўскі ў «Жанчынах», Фэрдынанда Камон у «Чалавечай хваробе», Адам Глёбус у «Дамавікамэроне», Гюнтэр Грас у «Турбо», Філіп Джыян у «Млявым на выгляд» — тэму трагедыі мужчыны, мужчынскай паразы. Асабліва ж яскрава дала ганьбы мужчынам Аксана Забужко ў «Палявых дасьледаваньнях украінскага сэксу».*

Уласна па кніжцы Бадэнтэр можна вучыцца штампаваць калянавуковыя бэстсэлеры. Энная колькасьць «вумных» словаў, энная колькасьць салёных тэмаў, скандальныя праўды і скандальныя крыўды, а галоўнае, незьлічоны аб'ём пералапачанай літаратуры. Посьпех гарантаваны ўжо таму, што мы, мужчыны, надта любім, каб пра нас гаварылі, каб нас шкадавалі. Мы палюбілі капацца ў сабе і плакацца: эпоху панаваньня фаласа зьмяніла эпоха панаваньня трэнаса.

Доўгі час мужчынскасьць разумелася як нешта бясспрэчнае і прыроджанае, бо ў культуры панаваў пэўны і акрэсьлены ідэал мужнасьці. За тры апошнія дзесяцігодзьдзі хваля «унісэксу», разгул фэмінізму, трыюмф урбаністычна-інтэлігенцкіх каштоўнасьцяў і прарыў гомасэксуальнасьці раструшчылі старыя стэрэатыпы і «размылі межы паміж мужчынскім і жаночым. І кожны мужчына з гэтага часу стаў задумвацца над сваёй глыбіннай сутнасьцю», — з жалезнай лёгікай сьцьвярджаецца ў рэзюмэ да французскага выданьня кнігі (якая ўраз была прададзеная мільённымі накладамі і перакладзеная на ўсе вялікія мовы, апроч беларускай).

Бо беларусы і так суцэльныя людзі паўзьмежжа: ні эўрапейцы, ні азіяты, ні беларусы, ні расейцы, ні жабракі, ні сераднякі, ні сяляне, ні гараджане. Так сабе, нейкія бульбаеды. А цяпер аказваецца, што мы яшчэ й не мужыкі, ці не зусім мужыкі, ці мужыкі занадта крутыя або мяккія, што трэба «прымірыцца». А з чым мае прымірацца чалавек паўзьмежжа? Элізабэт Бадэнтэр таксама — аўтар кніг «Каханьне ў дадатак» (бэстсэлер 1982 году), «Адзін ёсьць другім» і «Кандарсэ: інтэлектуал у палітыцы» (у супрацоўніцтве з Рабэрам Бадэнтэрам).

Андрэй Дынько

Учым сутнасьць чалавечага індывіда мужчынскага полу? Мы міжволі верым у адвечнасьць мужчынскага пачатку, не асабліва зважаючы на словы Русо: «Мужчына зьяўляецца мужчынам толькі час ад часу, жанчына ж застаецца жанчынай цягам усяго жыцьця ці, прынамсі, усёй маладосьці». Мы ня надта схільныя задумвацца над зьменлівасьцю рэчаіснасьці, і таму ахвотна верым ва ўнівэрсальнасьць і нязьменнасьць прынцыпу мужчынскасьці, адзінага на ўсе часы, прасторы і ўзросты. Мы знаходзім гэты прынцып у самім ладзе прыроды, паводле якога полы відавочна адрозьніваюцца. Пол дзіцяці відаць з моманту ягонага нараджэньня, калі ж застаецца пэўны сумнеў, то генэтыка вызначае тое, што застаецца незразумелым з анатоміі.

Тым ня менш, прыгаданыя і відавочныя доказы ня здольныя даць вычарпальныя адказы на ўсе пытаньні. Наша мова адлюстроўвае нашыя сумневы, нават непакой, калі мы гаворым пра мужчынскасьць як пра мэту і доўг. Выраз «быць мужчынам» часьцей ужываюць у загадным, чым у абвесным ладзе. За такім знаёмым заклікам — «Будзь мужчынам» — стаіць перакананьне, што мужчынскасьць — гэта нешта дасягнутае, а не такое прыроджанае, як гэта спрабуюць прадставіць.

Існаваньне такога заклiку мае на ўвазе, што наяўнасьці Y-храмасомы ці мужчынскіх полавых органаў недастаткова, каб ідэнтыфікаваць індывіда як мужчыну. Быцьцё мужчынам вымагае пэўнай працы над сабой, якой, мабыць, ня трэба, каб быць жанчынай. Вельмі рэдка пачуеш заклік: «Будзь жанчынай», тады як аналягічны заклік да хлопчыка, юнака ці нават дарослага мужчыны часта ўжываецца ў большасьці супольнасьцяў. Не да канца ўсьведамляючы гэта, мы прымаем жаноцкасьць як нешта натуральнае, а значыць, непазьбежнае, тады як мужчынскасьць даводзіцца здабываць, і здабыць яе яшчэ ня так і проста. Сам мужчына і ўсе астатнія настолькі ня ўпэўненыя ў ягонай полавай тоеснасьці, што ўвесь час патрабуюць доказаў ягонай мужнасьці. «Дакажы, што ты мужык,» — вось нязьменная задача, што стаіць перад кожным мужчынам. Вось жа, каб даказаць, трэба прайсьці праз выпрабаваньні, з чым жанчына ў працэсе сваёй самаідэнтыфікацыі не сутыкаецца. Натуральным парадкам надыходзіць дзень, калі ў яе пачынаюцца месячныя, прычым гэта адбываецца без аніякіх высілкаў зь яе боку, а часьцяком і без аніякага болю, і вось дзяўчынку назаўсёды запісваюць у жанчыны. Зусім па-іншаму ў заходняй цывілізацыі адбываецца з хлопчыкам. Не, спрадвечная патрэба даказваньня сваёй мужнасьці ня зьнікла, проста ніколі яшчэ не было такой глыбокай супярэчнасьці паміж неабходнасьцю даказаць сваю прыналежнасьць да мужчынскага полу і адсутнасьцю пэўных і неаспрэчных доказаў.

І ўжо поўная блытаніна ўзьнікае, калі мы ўжываем выраз «сапраўдны мужчына», каб акрэсьліць мужнага мужчыну. Дык што, некаторыя чалавечыя індывіды, што выглядаюць як мужчыны, не зьяўляюцца сапраўднымі мужчынамі? Некаторыя скардзяцца сёньня на адсутнасьць жаноцкасьці ў жанчынах, але пры гэтым жанчыны рэдка выказваюць сумневы наконт сваёй тоеснасьці. Наадварот, часьцей за ўсё якраз мужчыны бяруцца клясыфікаваць свайго брата, дадаючы гэткі «знак якасьці» — слова «сапраўдны». Гэта яны ў глыбіні душы задаюць сабе пытаньне: «А ці варты я сам гэтага эпітэту?»

Доўг, доказы, выпрабаваньні — гэтыя словы паказваюць, што трэба прыкласьці вялікія намаганьні, каб стаць мужчынам. Мужнасьць не даецца за так, яна павінна стварацца, «выпрацоўвацца». Такім чынам, мужчына — гэта нешта рукатворнае і заўжды існуе рызыка, што яго, як не прыродна створаны прадукт, могуць забракаваць, знайшоўшы дэфэкт «вытворчасьці», недастатковасьць мужчынскага мэханізму, у выніку чаго мужчына можа не «адбыцца» як мужчына. Справа «вытворчасьці» мужчыны да такой ступені рызыкоўная, што калі яна заканчваецца посьпехам, пра гэта мусова заявіць на ўвесь голас. Як кажа П'ер Бурд'ё: «Каб пахваліць мужчыну, дастаткова сказаць: «Ну, ты мужык», — агучыўшы формулу мітычнай мужнасьці. Бурд'ё падкрэсьлівае таксама, якія высілкі патрабуюцца ад мужчыны, каб адпавядаць гэтаму вызначэньню, і як мужчына пакутуе, калі ён гэтай формуле не адпавядае.

Але гэтая пакута не адзіная. Апроч таго, у наш час зьніклі ўсялякія арыентыры мужнасьці, і мужчына канца XX ст. больш ня здольны разабрацца ў сваёй сутнасьці. Гюнтэр Грас так адказвае на пытаньне «Што такое мужчына?»: «Сховішча прык-рай пакуты... лялька лёсу... тэатар смутку і безнадзейнасьці». Гэта было напісана ў 70-я гады, якраз у той час, калі мужчыны пачалі задумвацца над сваёй сутнасьцю як мужчынаў. Сьледам за фэміністкамі, якія гучна аспрэчвалі прызначаныя ім ролі, некаторыя мужчыны зажадалі вызваліцца з путаў міту пра мужнасьць. Амэрыканскія тэарэтыкі гуманітарных навук першымі ўзьнялі пытаньне пра стэрэатып ідэальнай ролі мужчыны, гэтую крыніцу псыхічнай неўраўнаважанасьці і праблемаў з жанчынамі. У 70-я гады, калі выйшлі першыя працы па праблеме мужчынскасьці, усе яны былі прасякнутыя жарам, уласьцівым любому выкрыцьцю. Адчувалася нейкая шалёная радасьць ад перагляду агульнапрынятых нормаў і ўскрываньня супярэчнасьцяў, якія ляжалі камянём на мужчынскім родзе. У 80-я

Міхай Эмінэску

Легенда пра песьняра

Даўным-даўно жыў імпэратар у далёкай краіне Індыі, і была ў яго дачка хараства невыказнага, бялявая, як сьляза сонца, калі сонца ўмее плакаць. Месяцовай ноччу, калі яна йшла празь цёмны лаўровы гай усходняга палацу, што стаяў ля падножжа скалы, то пачула прыгожы голас — нібыта салаўіны, але належаў ён чалавеку... Арфа — падобная на ласкавы, рэгулярны гук марскіх хваляў, суправаджала яго. То быў пясьняр-парыя, закаханы ў дачку імпэратара. Яна ўбачыла, як ён узьнік сярод галін у месяцовым сьвятле — быў ён высокі і прыгожы. Чорныя космы ахіналі гордае аблічча, вочы зьзялі ў вачніцах, як дзьве кветкі растопленай цемры. Яна закахалася ў яго, таму што не магло быць інакш, такі ён быў прыгожы.

Уначы — сярод сеткі цёмнага лісьця аліваў і лаўраў вісеў месяц, як залаты шчыт, а ён укленчыў ля ейных ног, апусьціўшы галаву ў белае яе хусьце, глядзеў доўга і сумна позіркам прарока ў гэтую далікатную і блакітную цемру яе вялікіх вачэй. Сваімі пяшчотнымі рукамі яна гладзіла ягоныя валасы — сваімі вуснамі, пранікнымі каханьнем, яна цалавала ягоны твар.

— Які прыгожы ў цябе твар — карона сьвету вянчала б яго.

— Ты хочаш гэтага? — сказаў ён, і ягоныя вочы шырака расплюшчыліся, як дзьве зоркі.

Ён выпрастаўся і паглядзеў на яе. Толькі імпэратар Сахары — леў, глядзеў так — аднойчы ў жыцьці, калі кахаў. Ён сьціснуў яе ў абдымках і вывеў на сьвятло.

Бывай, зорка-каханьне, усё!

Ноч была сьветлая, ціша паўсюль. Толькі сьвятыя хвалі Гангу ціха плёскалі, як мудрасьць часоў. Велічны сымбаль часу. Парыя доўга ўглядаўся ў яго і зразумеў. Пачуў словы сваіх высакародных продкаў, зразумеў, што менавіта гэта вядзе сьмяротных па зямлі. Ён разьбіў арфу аб скалу і рушыў угару. Ён узьняў народы супраць цароў і законаў, скінуў цароў ды зямных уладыкаў і на чале народаў, адныя зь якіх былі высакароднага паходжаньня, ён рушыў па берагах вялікіх рэкаў, разьбіваючы і падбіваючы імпэрыі.

Народы яго любілі, таму што ён быў справядлівы і добры, цары баяліся яго. Ён стаў імпэратарам сьвету і Ўладаром усіх сьмяротных.

Тады ён накіраваўся ва ўсходні палац, што ля падножжа скалы. Увайшоў у высокія залі, каб ускласьці карону сьвету на галаву сваёй нявесты — але распасьцёртая, белая, як мармуровая сьвечка, мёртвая была ягоная нявеста. Ён ня чуў нічога — толькі сьвятыя хвалі Гангу гучалі далёкім і іранічным водгукам у ягоных вушах — ён схіліў галаву і сказаў: «Навошта? Навошта?» — потым рушыў у пустэльню, і ніхто больш ня чуў пра яго.

Чалавек — як трава, ягоныя дні — як палявыя кветкі.

Пераклаў з румынскай Валеры Буйвал

Mihaj Eminesku. Proza literara. T.2. Bucuresti, 1989.

МІХАЙ ЭМІНЭСКУ (1850-1889), румынскі паэт і пісьменьнік. Аўтар паэмаў «Зорка», «Пралетар», вершаў, аповесьці «Самотны геній», апавяданьняў, навэляў.

Нявінныя

Яны пачуваліся нявіннымі, як у дзень стварэньня. Яны больш дзяцініліся, чым спакушаліся ў пяшчотах, і сіняе полымя асьвятляла барэльеф з Адамам і Евай. Яны самі, у абдымках, як і тыя, здавалася ім, паўтаралі старажытную гісторыю, першыя дні райскага жыцьця... Ім здавалася, што яны абярнуліся ў тых першых людзей, неабазнаных у асалодзе каханьня, што былі як два анёлы ў ценю гаю аранжаў, а сонца асьвятляла некрануты сьнег іхных целаў, напоўненых вольнай душой, цнатлівым сэрцам, неабцяжараным зямнымі жаданьнямі, яны блукалі па Эдэмскім садзе; адзінай іхнай радасьцю было глядзець на прыгажосьць сьвету і сваю прыгажосьць. Калі б нішто не ўзбуджала ў іхных сэрцах спакусьлівых жаданьняў, то гэта магло б доўжыцца вечна — магчыма, у паўтарэньне абяцаньняў старажытнай легенды, яны б жылі вечна. Але іхныя вочы спыніліся на Вэнэры і Адонісе, Арыёне і Аўроры — сінія языкі полымя каміну дрыготка раскідалі свае адлюстраваньні па рэльефах сьценаў, Вэнэра, здавалася, хітра й нявінна ўсьміхалася свайму сябру, Аўрора агаліла грудзі Арыёна — сэрца Чэзарыі затрымцела, яна пачала плакаць і, плачучы, душыла пацалункамі шыю маладога сябра, скаванага яе рукамі, і ён згубіў прытомнасьць. Яна ўпала, як мёртвая, на падлогу з квітнеючых кветак, толькі раз-пораз яркі прамень асьвятляў імклівай маланкай ўвесь дом, усьмешкі на іхных тварах і любоўныя сцэны над імі, а яны, грэшныя, схаваныя пад чорнай мантыяй, забыліся пра ўсё, пра сьвятло і нявіннасьць у гэтым простым і цьмяным здавольстве, што падобнае на нараджэньне і сьмерць, у прыцемках і аглушанае нясьведамым забыцьцём расьліннага, пазбаўленага розуму жыцьця.

Віктар Шніп

***

Зноўку змрочна, дажджліва, сьцюдзёна і шэра
І за вокнамі дрэвы, нібы на кладах.
Мы сядзім у замкнутых ад сьвету кватэрах
І прад восеньню ў нас, як чарвяк, жыве страх.

І няма нам ратунку, і няма для нас сьмерці,
Але й гэта жыцьцё, як пад ветрам лісьцё.
І нясу я ў сабе, нібы ліст у канвэрце,
Што напісаны Богу, душу і жыцьцё.

Мы ў Эўропе жывём, а Эўропы ня знаем,
І наогул: ці ёсьць мы на гэтай зямлі?
Над Эўропай фанэраю мы пралятаем,
І ў карцінах зьнікаем Сальвадора Далі.

***

Маўклівы сябра мой, падсып атруты
Мне ў гэта распраклятае віно.
Ты ж хочаш бачыць сьмертныя пакуты,
Якіх ніхто не бачыў і ня чуў даўно.
Я выпʼю сьмерць, і сьмерць мяне палюбіць,
І гэты дзень за мною паплыве.
І не анёл, а дʼябал мне пратрубіць,
І я пайду за ценямі ў траве,
Бо роднай хаты ўжо амаль няма,
І жыць дарма, і паміраць дарма...
І дзякуй Богу, што шчэ ёсьць атрута
І ў сябруках жыве Іуда.

***

Хочацца сьнегу, нібыта напіцца,
Каб пра ўсю шэрасьць, што побач, забыцца
Хоць бы на хвілю, якая асьвеціць
Сумную думку, што добра на сьвеце
Жыць і любіць, і памерці баяцца...
Хочацца сьнегу, ды дзе яму ўзяцца
Зь неба чарнюткага, зь неба пустога.
Дрэва на полі, бы ў неба дарога.
Можна па дрэўнай дарозе на Бога,
Можна... Ды хочацца першага сьнегу,
Хочацца сьмешна, але не да сьмеху –
Шэрасьць адна тут пануе навокал,
Быццам сіняк пасьля пʼянкі пад вокам.

МУЖЧЫНА

гады асалода выкрывальніцтва й разбуральніцтва традыцыйнай мадэлі мужчынскасьці зьмянілася поўным смутку пэрыядам няўпэўненасьці і трывогі. Ніколі раней мужчыну гэтак адназначна не пераносілі з-пад рубрыкі «маем» у рубрыку «знайсьці», як у 80-я гады. Два тонкія знаўцы мужчынскае натуры, аўстралійка Лін Сэгал і амэрыканка Кэтрын Стымпсан прыйшлі да аднолькавай высновы: «Мужчына стаўся сапраўднай таямніцай», што ставіць пад сумнеў ня толькі ягоную сутнасьць і мужнасьць, але й адзінства фэномэну мужчыны. Чыньнікамі вызначэньня тоеснасьці мужчыны зрабіліся прыналежнасьць да пэўнае клясы, расы, узроставай групы, сэксуальная арыентацыя. У Брытаніі, Амэрыцы і Аўстраліі цяпер ужо гавораць не пра мужчынскасьць, а пра мужчынскасьці.

Калі французскія навукоўцы стрымана паставіліся да гэтай праблемы, дык пісьменьнікі-раманісты, наадварот, адчулі ўсю вастрыню пытаньня і ў простых словах выказалі сваю разгубленасьць. Філіп Джыян быў адным зь іх. У сваім рамане «Lent dehors»* ён распавядае гісторыю жыцьця аднаго мужчыны зь дзяцінства да сталасьці. Герой Джыяна канстатуе: «Доўгі час мне здавалася, што ўвасабленьне абсалютнай таямніцы — гэта жанчына. Цяпер мне цяжка зразумець сябе як мужчыну... Мне здаецца, я ў стане зразумець, для чаго існуе жанчына, але для чаго патрэбны мужчына? Які сэнс у выразе: я мужчына?» Для Джыяна мужчына — гэта «нязьведаны кантынэнт», пазбаўлены ўсялякіх арыентыраў.

Такія выказваньні былі немагчымыя яшчэ 30 гадоў таму. Мужчыны тады былі ў такой ступені ўпэўненыя ў сабе, што нікому зь іх ня стукнула ў галаву задумацца пра ўласную тоеснасьць. Што ж адбылося, што прымусіла мужчынаў зьвярнуць увагу на гэтую праблему? Шмат хто абвінавачвае фэмінізм 60-х у тым, што яны «зблыталі падзел між поламі і зьмяшалі дакладныя арыентыры». Папраўдзе ж, віна заходняга фэмінізму ня ў тым, што ён зблытаў арыентыры, а хутчэй у тым, што ён наважыўся назваць караля голым. Паклаўшы канец традыцыйнаму разьмеркаваньню роляў і ўпарта асвойваючы галіны, што раней прызначаліся выключна мужчынам, жанчыны разбурылі ўнівэрсальную мужчынскую характарыстыку: ягоную перавагу над жанчынай. З моманту ўстанаўленьня патрыярхату мужчына заўсёды вызначаўся як прывілеяваная чалавечая істота, надзеленая нечым такім, чаго няма ў жанчыны. Мужчына лічыў сябе больш мужным, больш разумным, больш моцным, больш адказным, больш творчым і больш рацыянальным. Гэтае «больш» апраўдвала ягонае пагардлівае стаўленьне да кабеты ўвогуле і да ўласнай жонкі ў прыватнасьці. П'ер Бурд'ё адзначае, што «быць мужчынам» — значыць адразу апынуцца ў становішчы, якое прадугледжвае наяўнасьць пэўнай улады. Ён робіць выснову, што «міт пра мужнасьць апраўдвае libido dominandi». Але можна зрабіць інвэрсію словаў у сказе і сказаць, што libido dominandi абгрунтоўвае мужнасьць, хай сабе ілюзорную. Нават калі «вызначальнае дамінуе над вызначальнікам», libido dominandi зьяўляецца апошнім крытэрам вызначэньня мужчынскай тоеснасьці. З паступовым зьнікненьнем гэтага крытэра — ўлады над жанчынай — мы апынаемся перад ідэнтыфікацыйнай пусткай. Бадай, у такой сытуацыі юнакам будзе тачыцца галава: ім даводзіцца шукаць свой фарватэр паміж Сцылай і Харыбдай, між недастатковай мужнасьцю і мужнасьцю гіпэртрафаванай.

Пераасэнсаваньне паняцьця мужчынскасьці зьяўляецца адной з найбольш актуальных задачаў. Раней за ўсіх гэта ўсьвядомілі амэрыканцы, разьвіўшы так званыя Men's Studies, якія цяпер карыстаюцца вялікай папулярнасьцю ня толькі ў ЗША, але і ў Англіі, Аўстраліі і, у меншай ступені, у Скандынаўскіх краінах. Той факт, што гэты роздум узьнік у англасаксонскіх краінах, тлумачыцца, відаць, тым, што іх цывілізацыя была заўсёды апантаная ідэяй мужнасьці, пра што сьведчаць іх гісторыя, культура і мастацтва. Мужчынам у гэтых краінах давялося мець справу з «зусім ня тымі жанчынамі, зь якімі мелі справу, напрыклад, французы. Англасаксы сутыкнуліся зь вельмі радыкальным і магутным фэмінізмам, прычыны якога трэба шукаць у гісторыі і псыхалёгіі. Амэрыканскія фэміністкі часта папракаюць французанак за іх «патураньне» мужчынам. Яно і сапраўды, нягледзячы на ўсю палеміку паміж мужчынамі і жанчынамі, французанкі ніколі не адмаўляліся ад дыялёгу з мужчынамі. Салідарнасьць полаў захоўвалася, нягледзячы ні на што, у тым ліку і ў пэрыяды найбольш вострага перагляду старых праўдаў. Па эўрапейскі бок Атлянтыкі мужнасьць аспрэчваецца ня так заўзята, мужчыны тут меней агрэсіўныя, мужчыны і жанчыны меней баяцца адно аднога. У выніку праблема мужчынскасьці тут не стаіць так востра, як у іншых краінах, хаця ўсё адно гняце абедзьве паловы чалавецтва.

Працяг будзе.

*«Млявы на выгляд» (заўвага перакладчыка).

Пераклаў з французскай Зьміцер Дзьмітрук.

Elisabeth Badinther. XY. De l'identite masculine. – Paris, 1993.

СТО ТВОРАЎ МАСТАЦТВА XX СТАГОДЗЬДЗЯ

АЛЯКСЕЙ ГЛЕБАЎ. ФРАНЦІШАК СКАРЫНА

Савецкая Скарыніяна, у тым ліку і ў скульптуры, выявілася даволі рана. У 1920 годзе да вобразу беларускага асьветніка зьвярнуўся Абрам Бразэр. Ён стварыў дзіўнаваты паўгарэльф, паўмэдаль. Скарына атрымаўся расплюшчаны, нібы гумовы. За ім вобраз першадрукара быў увасоблены Заірам Азгурам. З таго часу нікому са скульптараў не прыходзіла ў галаву зьняць з галавы Скарыны барэт...

... Да 400-х угодкаў беларускага друку была створаная спэцыяльная камісія Інбелкульту, якая даручыла стварэньне помніка Скарыну, гэтак званага «скарынаўскага» шрыфту і мэдалёў Віцебскаму мастацкаму тэхнікуму. Гэты праект ачоліў Міхаіл Керзін, які прыехаў зь Вяліжу, а родам быў зь Пецярбургу. На жаль, праект помніка гэтак і застаўся нерэалізаваным...

... У савецкай графіцы адным зь першых Скарыну на матывы ягонага партрэту ў Бібліі увасобіў Ахола-Вала. Ягоны твор зьявіўся ў 1926 годзе на вокладцы часопіса «Маладняк». Дарэчы, ці ня з гэтае вокладкі пачалося бясконцае клішаваньне біблейскага Скарыны. Ахола-Вала, жывучы ў сваёй Фінляндыі, пра гэта мусіць і не здагадваўся...

... Менавіта пад час усебеларускае падрыхтоўкі да Скарынаўскага юбілею, у 1926 годзе, у Віцебск прыяжджае Аляксей Глебаў. Тут ён паступае ў Віцебскі мастацкі тэхнікум. Знаёмства з гісторыяй Беларусі адбылося ў яго адразу, на ўзорах пластычнага ўвасабленьня Беларушчыны настаўнікамі й студэнтамі...

... Гэтак склаўся лёс, што вучыцца Глебаву давялося ў Керзіна. Глебаў стаў неўзабаве любімым вучнем гэтага скульптара і выдатнага пэдагога. Рэалізм, часьцяком дробны й натуралістычны, прывезены зь Пецярбургу мінулага стагодзьдзя, быў прышчэплены будучаму скульптару намёртва...

... Керзін настолькі прывязаўся да вучня, што запрасіў яго да ўдзелу ў аздабленьні Дому ўраду ў Менску ў 1933 годзе. Тутака, працуючы разам з такімі мэтрамі, як Керзін і Манізер, Глебаў сфармуляваў свае творчыя і сьветапоглядныя прынцыпы. Для Дому ўраду ён выканаў бюст Фрунзэ. А далей пайшло... Барэльефы для Дому Савецкай Арміі, для Палаца піянэраў і школьнікаў (першага ў СССР), скульптуры для Ўсесаюзнае сельскагаспадарчае выставы ў Маскве 1940 году. Зьвернем увагу, што Глебаў зьвяртаўся ў тыя гады найчасьцей да беларускіх фальклёрных матываў. Сюжэты ягоных працаў тых гадоў: «Крыжачок», «Лявоніха» і гэтак далей. Ён жа ў тыя перадваенныя гады выканаў першую ў гісторыі беларускага мастацтва шматфігурную конную кампазыцыю для помніка ў Барысаве. Гэты помнік быў прысьвечаны вайне Саветаў з Польшчаю ў 20-я гады і зваўся «Рэўваенсавет Першай коннай арміі». Пасьля вайны Глебаў працаваў над праектамі конных помнікаў беларускім князям, Васільку Менскаму і Ўладзімеру Полацкаму...

... На вайне як на вайне. Глебаў быў прызваны на фронт, дзе яго цяжка паранілі. Доўгі час ён быў прыкаваны да ложка. І яшчэ ў шпіталі пачынае ізноў працаваць...

... Першыя паваенныя творы Глебава: «Янка Купала», эскіз «Янка Купала і Максім Танк», «Янка Купала і Максім Горкі» і яшчэ пяць бюстаў Купалы... Чаму над вобразам Купалы ў тыя гады Глебаў працаваў асабліва напружана? Што вяртала яго да гэтага вобразу? Можа загадкавая сьмерць паэта, зь якім скульптар быў асабіста знаёмы? Ці імкнуўся Глебаў такім чынам абараніць асобу Купалы? Ці адчуваў ён нейкую нядобрую гайну? Невядома. Але ягоныя партрэты Купалы тае пары прасякнутыя неўласьцівым савецкаму й глебаўскаму мастацтву псыхалягізмам і трагізмам...

... І вось у 1954 годзе Глебаў стварае яшчэ аднаго Купалу ў вобразе... Скарыны. Гэта вялікая, больш за два мэтры, скульптура вырабленая зь нязвыклага для Глебава матэрыялу. З дрэва. Пазьней ён зьвернецца да дрэва яшчэ толькі раз. У 1963 годзе. І толькі для таго, каб стварыць яшчэ адзін свой шэдэўр — «Юнацтва». Постаць аголенае дзяўчыны, блізкая пяшчотным манумэнталізмам да твораў Маёля, стала ў свой час гэткім жа сымбалем «адлігі» 60-х, як і аднайменны афорт літоўскага графіка Красаўскаса. Дрэва, мяккая залацістая ліпа, надала пластыцы Глебава цеплыню і інтымнасьць. На фактуры дрэва застаўся кожны сьлед разца, кожная выпадковая завусеніца... Тое, чаго не застаецца ў гіпсе ці бронзе. І сёньня, гледзячы на гэтую скульптуру, міжволі згадваецца традыцыйная беларуская драўляная пластыка 17-18 стагодзьдзяў. Выпадкова ці не, зварот да дрэва, без падробкі пад брутальную прыроднасьць альбо «народнасьць», злучыў гэты твор Глебава з вышэйшымі ўзорамі беларускае клясычнае спадчыны.

«Скарына» ў Глебава атрымаўся ўзьнятым да псыхалягічнага вобразу мысьляра-асьветніка. Да гэтага часу беларуская Скарыніяна ўжо была разнастайна распрацаваная. Аднак нават Драздовіч і Сергіевіч не ўзьняліся вышэй за лубочны вобраз сярэднявечнага вучонага ці работніка-друкара. Хутчэй за ўсё Глебаву тут дапамагла вялікая праца над партрэтамі Купалы. Вобраз асьветніка-сейбіта, які з трывогаю й болем узіраецца ў плён свайго пасеву, перакачаваў і ў скульптуру Скарыны. Ва ўяўленьні Глебава Купала і быў увасабленьнем лепшых рысаў беларускага інтэлігента. Нават зьнешне, антрапалягічна. Таму невыпадкова ён надаў Скарыну партрэтнае падабенства з Купалам. Вядома, падоўжыў валасы, вусы... Але твар застаецца блізкім і пазнавальным для беларусаў. Адначасова гэты скульптурны твар стаў і не абстрактным, і не стандартным, а моцна індывідуалізаваным, больш прыдатным для перадачы тых эмоцыяў і ў той стылістыцы, якія задумаў скульптар.

Постаць, складана разгорнутая у прасторы, прадстаўляе друкара ў момант драматычнага, цяжкога роздуму. Эмоцыі хутчэй уласьцівыя чалавеку 20 стагодзьдзя, чым рэнэсансавай асобе. Але тым глыбей апынуўся гэты твор, зьвернуты да беларускага гледача ў 1954 годзе. Можа, гэтага году і чакаў Глебаў, як і сотні іншых савецкіх інтэлігентаў. Паказальна, што выказацца скульптару захацелася ў полі Беларушчыны...

Зьнешне вобраз Скарыны атрымаў умоўна-гістарычную трактоўку. Сярод іншых дэталяў — кніга, цяжкі старасьвецкі манускрыпт, які добра прачытваецца гледачом на ўзроўні вачэй, беспамылкова паказвае на характар пэрсанажа: кніжнік, першадрукар, асьветнік. У маштабе станкавае пластыкі ясна чытаюцца дэталі адзежыны, сьціплых аксэсуараў, якія пазначаюць пэўную, ужо бясконца далёкую і цьмяна разуметую (ніколі не разуметую) у савецкай Беларусі эпоху...

На працягу 1967 і 1968 гадоў, апошніх гадоў свайго жыцьця, Аляксей Глебаў працаваў над мадэляй помніка Францішку Скарыну. Дзясятак мадэляў... Але з кожнай новай вобраз станавіўся ўсё больш ляпідарным. У пэўным сэнсе ў гэтым быў вінаваты іншы, небеларускі матэрыял — гіпс, бронза... Але і часы былі іншыя. Глебаў гэтак і не адышоў ад стэрэатыпу.

Ужо пасьля сьмерці Аляксея Глебава, у 1974 годзе, паводле ягонае мадэлі, у аснову якое быў пакладзены вобраз таго самага першапачатковага, дваццацігадовае даўніны, драўлянага Скарыны, у Полацаку паставілі помнік. Над ім працаваў ужо цэлы калектыў: скульптары Андрэй Засьпіцкі, Ігар Глебаў і архітэктар Валеры Марокін. Дэталь — ніводзін зь іх не нарадзіўся ў Беларусі. Для гэтага манумэнту былі выкарыстаныя дарагія матэрыялы: чырвоны граніт, ружовы пясчанік і, натуральна, бронза. Па стылябаце, даўжынёю ў 8 мэтраў, пусьцілі надпіс «Франциск Георгий Скорина»... Невераемна павялічаная скульптура (пяць з паловаю мэтраў), разам з пастамэнтам складае манумэнт вышынёю ў дванаццаць мэтраў! Пры такім маштабе той, першасны псыхалягізм вобразу Скарыны, прапаў зусім. Перад гледачом — ці то рабочы ў робе, ці то доктар у халаце. А хутчэй за ўсё — задуменны сьлесар. Як пісалі ў савецкіх кнігах: «Ляканічныя дэталі (кніга і гранка ў руках) трактуюць вобраз Скарыны як друкара і асьветніка...» Нічога, вядома, гэтыя дэталі не «трактуюць». На вышыні ў дзесяць мэтраў можна толькі ўяўляць, якія там дэталі.

Імем Аляксея Глебава назвалі пасьля Менскую мастацкую вучэльню, хоць ён да яе ня меў непасрэднага дачыненьня. У адрозьненьне ад аднафамільца Ігара Глебава (родам зь Цьвершчыны), які выкладаў у гэтай вучэльні. Паводле гіроніі менавіта Ігар Глебаў атрымаў за помнік Скарыну ў Полацку Дзяржаўную прэмію БССР у 1978 годзе.

Сяргей Харэўскі

ГЛЕБАЎ АЛЯКСЕЙ (1908, в. Зьверавічы Смаленскае губэрні — 1968, Менск) скульптар, пэдагог. Вучыўся з 1926 да 1930 у Віцебскім мастацкім тэхнікуме. З 1955 году — выкладчык Беларускага тэатральна-мастацкага інстытуту. У той жа год стаў Народным мастаком БССР.



У папярэдніх нумарах прадстаўленыя творы:

1. Фэрдынанд Рушчыц. Зямля
2. Мсьціслаў Дабужынскі. Віцебск, лесьвіца
3. Марк Шагал. Прамэнад
4. Ільля Рэпін. Беларус
5. Марк Антокальскі. Помнік Кацярыне
6. Вітальд Бялыніцкі-Біруля. Блакітная капліца
7. Хаім Суцін. Паж
8. Казімер Малевіч. Чорны квадрат
9. Язэп Драздовіч. Пагоня Ярылы
10. Валянцін Волкаў. Менск, 2 ліпеня 1943 году
11. Манумэнт Перамогі
12. Помнік Леніну ў Менску
13. Пётра Сергіевіч. Шляхам жыцьця

«Наша Ніва» ў Інтэрнэце

Зь мінулага нумару матэрыялы «НН» можна прачытаць у Інтэрнэце. Адрас: **http://rampage.ml.org/users/~nasa_niva**

Вольнае слова набывае электроннае цела.

"Наша Ніва" незалежная газэта

НАША НІВА

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

рэдактар ... Сяргей Дубавец
выдавец ... Рэдакцыя газэты "Наша Ніва"
заснавальнік ... Павал Жук
адказны сакратар ... Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар ... Сяргей Харэўскі
аддзел інфармацыі ... Андрэй Лапцёнак, Віктар Корзун
дызайн і вёрстка ... Лявон Раманчык
набор ... Аляксандра Макавік
стыль і карэктура ... Паўлюк Канавальчык
пры ўдзеле ... Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі ... Зьміцер Бартосік

АДРАС ДЛЯ ДАПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 213-43-52
E-mail: edit@niva.minsk.by
http://rampage.ml.org/users/~nasa_niva

© НАША НІВА. Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая.

Наклад 2625. 8 палос фармат А2 нумар падпісаны ў друк 22:06, 30/11/1997. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 7094. Кошт свабодны.

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты "Известия", д. 8, кв. 173.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12